Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 24 верасня 1982 г. ● № 38 (3136) ● Выходзіць з 1932 г. ● Цана 10 кап.

ВЕРНЫ СВАЁЙ ПЕСНІ



Народны артыст БССР Ігар Лучанок.

Фота Ул. КРУКА.

Завіталі мы да яго, калі ўжо быў афіцыйна абвешчаны ўрадавы ўказ аб прысваенні Ігару Лучанку звання народнага артыста рэспублікі. Належная ацэнка заслуг кампазітара-песенніка і па-камсамольску неўтаймоўнага, дзейнага чалавека.

Здавалася б, што тут казаць: лімаўскаму чытачу аблічча Ігара Лучанка, яго творчасць добра знаёмыя. Але мінае год — ды што там год: месяц, тыдзень! — а ў Лучанка столькі ўжо і выпраўлена, і наперад задумана. Новага — не адна старонка набярэцца.

Сёлета зноў пабываў у маракоў Паўночнага флоту, якія даўно ўжо спяваюць напісаную для іх спецыяльна песню, правёў там 11 творчых сустрэч — і падарыў цяпер новую песню — «На варце граніцы». Пасля па традыцыі паехаў да бацькоў, на радзіму, у Мар'іну Горку. На гэты раз яго пільнавала творчая група рэспубліканскага тэлебачання, якая аператыўна, за дзень, зняла фільм «Вяртанне». Назва мае не толькі літаральны сэнс. «Вяртанне» — яшчэ і назва новай песні на вершы Г. Бураўкіна, працэс стварэння якой і прасачыла здымачная група ў дарозе. Намечана творчая паездка Лучанка ў ГДР. І трэба ў Вільнюсе пабываць— як старшыні праўлення Саюза кампазітараў, па справах садружнасці творчых саюзаў Літвы і Беларусі. Днямі ж ён з групай салістаў правёў сустрэчу ў адным з мінскіх калектываў. А сёння Лучанок, відаць, у Маскве: запісваецца песня «Матылі» на вершы Г. Бураўкіна ў выкананні Э. Хіля — для праграмы «Песня-82». Кампазітар ужо 9 разоў станавіўся лаўрэатам гэтага штогадовага Усесаюзнага тэлефестывалю, і ў заключных канцэртах гучалі «Добры вечар, дзяўчыначка», «Дударыкі», «Ростань».

Тым часам напісана музыка да новай дакументальнай стужкі «Беларусьфільма», прысвечанай 60-годдзю СССР, — «Саюз рэспублік і сэрцаў». У гонар Купалавага юбілею адбылася прэм'ера музычнага спектакля «Гусляр» — увасабленне паэмы-легенды І. Лучанка і У. Мулявіна Беларускім тэлебачаннем. Прагучала з экрана і праграма песень Лучанка, падрыхтаваная Л. Барткевічам.

«Песняры» працуюць над новым камерна-вакальным творам кампазітара — цыклам маналогаў на вершы савецкіх паэтаў «Вайна не патрэбна». Вялікі зводны калектыў рыхтуе напісаны Лучанком пралог урачыстага канцэрта да 100-годдзя Я. Коласа, а «Верасы» — яго «Вяснянку» на Коласавы вершы. Камсамол Беларусі шэфствуе над маракамі Балтыйскага флоту — і Лучанок ужо выпраўляе туды «па камсамольскай пуцёўцы» новую песню: «Да балтыйскіх прычалаў». Да 40-годдзя Сталінградскай бітвы напісаў «Героям Сталінграда» (тэкст К. Гусева).

Фактаў столькі, што на эпітэты ўжо не застаецца і месца. Ды зрэшты, самы трапны эпітэт да творчага аблічча Ігара Лучанка тут ужо ёсць: народны.

Імя сваёй песні ён, як правіла, выбірае сам. Любіць, каб імя гэтае гучала паэтычна і гожа. «Вяртанне», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Ростань», «Дударыкі», «Рабінавы гай»... У той жа, урачысты для яго дзень, ён не раз называў нам многія імёны творчых паплечнікаў — паэтаў, салістаў-выканаўцаў, кіраўнікоў музычных калектываў, старэйшых вопытных калег-кампазітараў. Затое зусім мімаходзь задумаўся над пытаннем пра свае не такія і даўнія, а досыць важкія абавязкі старшыні кампазітарскай арганізацыі і рэктара кансерваторыі. І сказаў толькі, што на любым месцы трэба старацца зрабіць добрую справу. Тым больш, калі маеш для гэтага асаблівыя магчымасці.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, кавалер вышэйшай камсамольскай узнагароды — Ганаровага Знака ВЛКСМ, дэлегат яго нядаўняга з'езда, актывіст рэдкалегіі нашага штотыднёвіка... Ігар Лучанок — народны артыст рэспублікі. А сказаць проста — кампазітар, які верны СВАЁЙ ПЕСНІ.

ПОСТУП ТЫДНЯ

Удзельнікам Міжнароднай канферэнцыі журналістаў

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі!
Сардэчна вітаю вас у Краіне Саветаў!

Журналісты лічаць сваім прызваннем быць заўсёды ў гушчыні падзей, інфармаваць аб іх грамадства. Удзячная прафесія! І высакародная, калі майстэрства, талент публіцыста служаць распаўсюджванню ісціны, абароне дабра і сацыяльнай справядлівасці.

Вас, грамадзян розных дзяржаў, прадстаўнікоў розных частак свету, звёў разам у сталіцы Кіргізіі маючы адбыцца юбілей Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Шэсць дзесяцігоддзяў назад упершыню ў доўгай гісторыі чалавецтва ўсталяваліся якасна новыя адносіны паміж нацыямі і народнасцямі, адносіны, прасякнутыя духам дружбы, добрасуседства і ўзаемадапамогі. Інтэрнацыяналізм стаў вызначальнай рысай жыцця ўсіх брацкіх народаў, насяляючых нашу краіну.

З вопыту вырашэння нацыянальнага пытання ў Савецкім Саюзе мы робім вывад: добрасуседства і згода могуць і павінны стаць абавязковай нормай ва ўзаемаадносінах паміж народамі і дзяржавамі свету. Для гэтага неабходна, каб высокія прынцыпы не толькі абвяшчаліся, але і ажыццяўляліся ў канкрэтных справах парламентаў, урадаў, палітычных партый.

Мне не раз даводзілася гаварыць, што няма такіх міждзяржаўных праблем, якія нельга было б урэгуляваць пры наяўнасці добрай волі за сталом перагавораў. І хачу дапоўніць — няма такіх інтарэсаў у дзяржаў, якія апраўдвалі б палітыку сілы і агрэсіі. Так думае ўся наша партыя, увесь наш народ.

Ад вас, работнікаў сродкаў інфармацыі, у немалой ступені залежыць, наколькі ясна і дакладна шырокая грамадскасць разумее, якія небяспекі падсцерагаюць чалавецтва, які напал набыла зараз барацьба паміж сіламі вайны і міру.

Дазвольце пажадаць вам плённага абмену думкамі на канферэнцыі, умацавання ўзаемаразумення і міжнароднай салідарнасці журналістаў.

Л. БРЭЖНЕЎ.

ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР за вялікія заслугі ў развіцці музычнага мастацтва і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР, лаўрэату прэміі Ленінскага камсамола кампазітару І. ЛУЧАНКУ прысвоена званне народнага артыста Беларускай ССР.

●

Мастаку-пастаноўшчыку Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР Я. ЖДАНУ за плённую работу ў галіне выяўленчага мастацтва і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці прысвоена званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

●

Рэжысёру-пастаноўшчыку кінастудыі «Беларусьфільм» М. ПТАШУКУ прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР.

●

Званне заслужанага артыста Беларускай ССР прысвоена артысту Тэатра-студыі кінаакцёра У. ГАСЦЮХІНУ.

●

За заслугі ў арганізацыі бібліятэчнай работы ў рэспубліцы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці намесніку дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна І. СІНІЦЫНАЙ прысвоена званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

ТВОРЧЫМ СУВЯЗЯМ МАЦНЕЦЬ

У сераду, 22 верасня, адбыўся сумесны адкрыты партыйны сход Саюза пісьменнікаў БССР, Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і выдавецтва «Мастацкая літаратура». Яго ўдзельнікі абмеркавалі планы і мерапрыемствы, накіраваныя на ажыццяўленне пастановы ЦК КПСС «Аб творчых сувязях літаратурна-мастацкіх часопісаў з практыкай камуністычнага будаўніцтва».

З дакладам выступіў галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі.

Ацэньваючы творчую рупнасць нашых часопісаў і выдавецтваў, дакладчык адзначыў, што яны праводзяць сістэматычную работу па развіцці і паглыбленні творчых сувязей літаратуры з жыццём народа, з практыкай камуністычнага будаўніцтва. Сувязь з працоўнымі, шэфская работа, абмеркаванне сумесна з чытачамі літаратурных матэрыялаў узбагачаюць рэдакцыі сучаснай тэматыкай, павышаюць узровень кампетэнтнасці часопісных публікацый. У прыватнасці супрацоўнікі часопіса «Беларусь» шэфствуюць над метрабудаўцамі, калектыў часопіса «Маладосць» штогод мацуе і развівае творчыя сувязі з хлебаробамі саўгаса «Адраджэнне» Ганцавіцкага раёна, а сёлета ўзяў шэфства над Радашковіцкай школай-інтэрнатам. Калектыў супрацоўнікаў часопіса «Неман» шэфствуе над сістэмай прафтэхадукацыі Беларусі, у часопісе «Полымя» створаны штаб па шэфскай рабоце.

Апошнім часам чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з новымі раманамі І. Шамякіна, А. Асіпенкі, В. Казько, П. Місько, В. Карамазава, аповесцямі, апавяданнямі і нарысамі А. Кудраўца, Б. Сачанкі, Я. Сіпакова, А. Жука, В. Блакіта, В. Гігевіча, В. Мысліўца, А. Казловіча і шэрагу іншых літаратараў, чые творы прысвечаны жыццю сучаснай вёскі, рабочаму класу рэспублікі.

Нядаўняя партыйная пастанова звяртае нашу ўвагу на тое, што работа літаратурных часопісаў, а таксама выдавецтваў патрабуе паляпшэння. Узросшая грамадская актыўнасць, палітычная сталасць і прафесійнае майстэрства пісьменнікаў дазваляюць літаратурна-мастацкаму друку паўней праяўляць сябе ў вырашэнні задач камуністычнага будаўніцтва, у задавальненні культурных запатрабаванняў народа.

Намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Г. Пашкоў паведаміў, што з 1983 года ў Барысаўскім раёне будзе дзейнічаць пастаянны пост рэдакцыі, дзе мяркуецца правесці выязное пасяджэнне рэдкалегіі. Намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Неман» Э. Ялугін расказаў аб планах рэдакцыі па асвятленні дзейнасці кіраўнікоў раённага звяна, старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў. Загадчык сектара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы П. Дзюбайла заклікаў пісьменнікаў пільней ставіцца да маральных праблем нашага часу. Загадчык аддзела выдавецтва «Мастацкая літаратура» В. Хомчанка, галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва» Я. Каршукоў, падзяліліся планамі выдання кніг, прысвечаных жыццю нашага сучасніка. Пісьменнік С. Шушкевіч гаварыў пра вялікае значэнне прапаганды лепшых здабыткаў беларускай літаратуры.

Па абмеркаваным пытанні сход прыняў пастанову.

ВЕЧАР НА ЗАВОДЗЕ

На Мінскім заводзе халадзільнікаў праведзены літаратурны вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа.

Пасля рабочай змены ў актавай зале прадпрыемства сабраліся рабочыя, служачыя, шматлікія прыхільнікі творчасці беларускага песняра. Кнігалюбы падрыхтавалі святочны выпуск насценнай газеты, выстаўку кніг Я. Коласа.

Слова пра паэта сказалі яго сын Д. К. Міцкевіч, заслужаны дзеяч культуры Беларусі А. Слесарэнка.

А. ПЕТУХОЎ.

ВІНШУЕМ!

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за поспехі ў арганізацыі бібліятэчнай работы ў рэспубліцы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўзнагароджаны работнікі Дзяржаўнай бібліятэкі Беларускай ССР імя У. І. Леніна.

ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

МАШЧАНКА Надзея Іосіфаўна — галоўны бібліёграф аддзела кнігазахоўвання.

НАВУМЕНКА Клаўдзія Аляксандраўна — загадчыца навукова-метадычнага аддзела.

ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

ЖОЛУДЗЕЎ Ігар Валянцінавіч—загадчык аддзела рэдкай і старадрукаванай кнігі.

ПАПОВА Тамара Іванаўна — намеснік дырэктара па навуковай рабоце.

РОШЧЫНА Таццяна Іванаўна — галоўны бібліёграф аддзела замежнай літаратуры.

САНЬКО Канстанцін Сямёнавіч — загадчык навукова-даследчага аддзела.

ВЫСТАЎКІ

У СУЗОР'І РЭСПУБЛІК

Браншчына, Чарнігаўшчына, Гомельшчына... Тры вобласці ў сузор'і братніх рэспублік. Іх працоўныя калектывы спаборнічаюць паміж сабой. Трывалыя сувязі ўстаноўлены і паміж творчымі работнікамі.

Не так даўно ў Бранску была адкрыта выстаўка твораў мастакоў трох абласцей, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР. А цяпер яе экспазіцыя пераехала ў Гомель. На вернісажы прадстаўлена 163 работы жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва. Яны расказваюць пра нашага сучасніка, гераічнае мінулае, апяваюць родную прыроду.

Вялікі раздзел экспазіцыі займае жывапіс. Прыцягваюць увагу партрэты, выкананыя заслужаным мастаком РСФСР Л. Захаравым, асабліва «Партрэт прафесара А. А. Камаева». Тэма мірнай стваральнай працы моцна гучыць у палотнах «Пара касавіцы» В. Андрэева (Бранск), «Маладосць фабрыкі» А. Какалы (Чарнігаў), «На буравой» М. Казакевіча (Гомель), лінагравюрах «Светлагорскае неба», «Горад будуецца» Я. і Л. Пакаташкіных (Гомель), афорце «Новы горад» В. Сідарава (Бранск).

Л. ЗАХАРАЎ (Бранск). Партрэт прафесара А. А. Камаева.

А. ШКУРКО (Чарнігаў). Юбілейныя кветкі Кіеву.

Харастко прыроды адлюстравана ў пейзажах многіх мастакоў: «Збажына спее» М. Пракапюка (Чарнігаў), «Залаты шар» Г. Абразумава (Бранск), «Прасторы Палесся» Д. Алейніка (Гомель).

Пра юнацтва апавядаюць работы Р. Ландарскага (Гомель). «Юбілейныя кветкі Кіеву» А. Шкурко (Чарнігаў) і іншых аўтараў.

Захапленне ў гледачоў выклікаюць скульптуры з керамікі «Стары ганчар», «Несцерка», «Мелодыі Палесся», «Музыкі», «Дудары - дударыкі» М. Пушкара з Мазыра.



Р. ЛАНДАРСКІ (Гомель). Ластаўкі.

Пасля Гомеля выстаўка адправіцца ў Чарнігаў.

А. ШНЫПАРКОЎ.

БЕЛАРУСКІ ПЛАКАТ У ТАЛІНЕ

Нядаўна ў Таліне адбылося адкрыццё выстаўкі палітычнага плаката рэспублік Савецкай Прыбалтыкі і Беларусі, прысвечанай 60-годдзю СССР. Гэта першая міжрэспубліканская выстаўка лепшых работ мастакоў-плакатыстаў чатырох братніх рэспублік.

Ад Беларускай ССР на выстаўцы ўдзельнічаюць палітычныя плакаты рознай тэматыкі, выпушчаныя выдавецтвам «Беларусь» і «Агітплакатам» Саюза мастакоў БССР за апошнія тры гады. На выстаўцы з поспехам дэманструюцца творы нашых плакатыстаў Трафіма Ігнаценкі, Мікалая Стомы, Уладзіміра Крукоўскага, Уладзіміра Жука, Людмілы Кальмаевай і іншых.

Асаблівую ўвагу наведвальнікаў выстаўкі звяртаюць плакаты, выпушчаныя непасрэдна да слаўнага юбілею нашай краіны.

На матэрыялах выстаўкі быў праведзены двухдзённы семінар-нарада па праблеме далейшага паляпшэння мастацкага афармлення і выпуску палітычных плакатаў выдавецтвамі саюзных рэспублік.

У творчых дыскусіях прынялі ўдзел адказныя супрацоўнікі Дзяржкамвыда СССР, выдавецтва ЦК КПСС «Плакат», а таксама вядучыя супрацоўнікі кнігавыдавецкай справы і плакатысты рэспублікі Прыбалтыкі і Беларусі.

З дакладам аб развіцці беларускага плаката на творчым форуме выступіў кіраўнік дэлегацыі ад нашай рэспублікі, галоўны мастак Дзяржкамітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю М. Ганчароў.

М. ЗАПОЛЬСКІ.

МАСТАЦТВА БУРШТЫНАВАГА КРАЮ

Салёны подых Балтыкі, жанчыны ў нацыянальных касцюмах на квітнеючых палях, імклівыя рытмы Рыгі, Вільнюса, Таліна на фоне помнікаў старажытнасці сустрэне глядач у выставачнай зале Брэсцкай абласной арганізацыі Саюза мастакоў БССР. Тут адкрылася выстаўка твораў мастакоў і скульптараў Савецкай Прыбалтыкі, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР. Жывапісныя палотны, графічныя лісты, скульптурныя кампазіцыі майстроў пэндзля і разца бурштынавага краю вылучаюцца смеласцю почырку, напружаным роздумам, глыбінёй пачуццяў. Асабліва многа цёплых водгукаў у наведвальнікаў выстаўкі выклікаюць работы Барыса Берзіня, Джэмы Скулмэ з Латвіі, Антанаса Гудайціса, Сільвестраса Джаукштаса з Літвы, Андэ Кескюла, Айлі Вінта з Эстоніі.

М. ГОРСКІ.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

«...І ПАГЛЫБЛЯЦЬ ЗМЯСТОЎНАСЦЬ»

Расказвае дырэктар Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР Л. А. ГОДАЎ:

— 15 верасня адбылася наша першая ў новым сезоне сустрэча з гледачом. Быў паказаны спектакль «Несцерка» (як вядома, работа кампазітара Р. Суруса ў гэтай народнай музычнай камедыі вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР). А далей на афішы — і сталыя творы нашага рэпертуару, і нядаўнія прэм'еры, знаёмыя пакуль што не многім гледачам.

Дарэчы сказаць, на працягу мінулага сезона вялася значная работа па паляпшэнні якасці спектакляў бягучага рэпертуару: свежыя акцёрскія ўводы, рэпетыцыі, спеўкі, карэктуры пастановак. Зразумела, гэта работа стала больш плённай, таму што тэатр атрымаў летась пастаяннае «месца жыхарства». Пэўныя творчыя поспехі калектыву звязаны і з пастаноўкамі новых спектакляў: мюзіклаў «Мая цудоўная лэдзі» Ф. Лоў (рэжысёр С. Штэйн, дырыжор А. Лапуноў, мастак А. Марозаў, балетмайстар В. Бутрымовіч) і «Пенелопа» А. Журбіна (рэжысёр Ю. Гвоздзікаў, дырыжор А. Лапуноў, мастак Я. Алтынаў, балетмайстар В. Бутрымовіч). А пастаноўка аднаактовага балета на музыку Д. Шастаковіча «Паненка і хуліган» — прыкметны крок наперад для балетнай трупы тэатра і для аркестра. У той жа час гэта — эксперымент: мы ўпершыню прадаставілі сцэну для дыпломнай работы выпускнікоў Мінскага інстытута культуры, вядомых салістаў тэатра оперы і балета В. Лапо і В. Саркісьяна. І мяркуючы па тым, як справіліся яны з гэтай складанай, першай сваёй работай пастаноўшчыкаў, такія эксперыменты варта падтрымліваць і практыкаваць шырэй.

Сёлетняй вясною калектыў упершыню прыняў удзел у традыцыйным Усесаюзным фестывалі творчай моладзі музычных тэатраў. Побач з пасланцамі іншых гарадоў краіны ў спектаклях, канцэртах, на творчых сустрэчах выступалі маладыя салісты нашай аперэты Р. Харык, В. Пятліцкая, П. Рыдзігер, Г. Казлоў, З. Вяржбіцкая, Н. Харужэнка, М. Адамовіч, дырыжор А. Сасноўскі. Можна было б назваць яшчэ шэраг імёнаў, адзначаючы плённую працу аркестра, цікавыя акцёрскія работы салістаў тэатра — ды, зрэшты, аматары жанру аперэты з прыхільнасцю сочаць за навінамі сезона, за дэбютамі, уводамі, прэм'ерамі. Таму зазначу толькі, што адметнай ацэнкай творчага майстэрства выканаўцаў стала прысваенне высокага звання заслужанага артыста БССР нашым салістам Вікторыі Мазур, Канстанціну Лосеву, Людміле Рабушка.

Летнія гастролі тэатра прайшлі ў Гродне. Гледачам вобласці было паказана каля паўсотні спектакляў і канцэртаў. Цікава, што на другі дзень нашых гастроляў урачыста адзначаўся стогадовы юбілей Янкі Купалы. Па-свойму адзначыў яго і тэатр, паказаўшы гродзенцам 7 ліпеня аперэту Ю. Семянякі «Паўлінка» (яшчэ ў Мінску былі праведзены асобныя работы па капітальным узнаўленні гэтага спектакля). Не варта, відаць, прыводзіць тут лічбы. Але ўвогуле трэба зазначыць, што плён супольнай працы ўсіх творчых цэхаў, мастацка-пастановачнай часткі, вытворчых майстэрань і служб выявіўся і ў перавыкананні тэатрам плана першага паўгоддзя па ўсіх фінансава-эканамічных паказчыках.

Якія ж задачы належыць вырашаць нам цяпер? Гэта — і паглыбленне змястоўнасці рэпертуару, і павышэнне прафесійнага ўзроўню трупы, і выхаванне новых, яркіх маладых творчых індывідуальнасцей, і ўдасканаленне стылю кіравання тэатрам, і ўмацаванне шэфскіх кантактаў з гледачом, і г. д. Сярод захадаў, накіраваных на паляпшэнне мастацкага абслугоўвання працаўнікоў вёскі, — новы дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве, які наш калектыў заключыў з калгасам «Чырвоны Кастрычнік» Стаўбцоўскага раёна.

Зразумела, гледача найбольш цікавяць рэпертуарныя планы. Першай новай работай у гэтым сезоне будзе спектакль, прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР, — «Гора ад розуму» (паводле А. Грыбаедава), на музыку азербайджанскага кампазітара А. Фельзера. Над пастаноўкай працуюць маскоўскі рэжысёр Р. Вікцюк і мастакі з Ленінграда А. Арлоў і І. Чарэзнікава. На пачатак вясны мяркуецца выпуск мюзікла В. Лебедзева «Мілы друг», затым — прэм'ера твора А. Мдзівані «Дзяніс Давыдаў». Выбіраем і аперэту з класічнага рэпертуару: яе пастаноўкай завершыцца сезон 1982—83 гг.

Неўзабаве майстры мастацтваў Беларусі прымуць удзел у святкаванні юбілею нашай дзяржавы. І наш тэатр, прынамсі, рыхтуецца ў гонар 60-годдзя СССР правесці тыдзень аперэты ў новым Палацы культуры горада Барысава.

ПЕРШАЕ ІМЯ НА АФІШЫ — М. ГОРКІ

На гэтым тыдні пачаў новы сезон Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага. Сёлета грамадскасць рэспублікі адзначае пяцідзесятую гадавіну творчай дзейнасці калектыву. У 1932 годзе вандроўнаму тады тэатру пад кіраўніцтвам Уладзіміра Кумельскага Урад БССР надаў статус рэспубліканскага. З 1955 г. яму прысвоена імя Максіма Горкага. Сёлета, як і пяцьдзесят гадоў назад, першая назва на афішы—«Ягор Булычоў і іншыя», першае імя — М. Горкі.

Аб тым, што новага будзе ў юбілейным сезоне ў дзейнасці калектыву, карэспандэнту «ЛіМа» расказаў дырэктар Рускага тэатра БССР М. НЯРОНСКІ:

— Адкрываем мы новы сезон адразу пасля гастрольных выступленняў у Ленінградзе. Гледачы і крытыка вельмі прыхільна сустрэлі спектаклі нашага рэпертуару, асабліва новую работу—«Ягор Булычоў і іншыя» ў пастаноўцы галоўнага рэжысёра тэатра Барыса Глаголіна. Такім чынам, мы як бы перакідваем «мост» паміж пачаткам дзейнасці і нашым сённяшнім творчым днём, падкрэсліваем пераемнасць лепшых традыцый і невыпадковасць сувязі нашага тэатра з драматургічнай спадчынай і з ідэйна-творчымі прынцыпамі М. Горкага.

100-годдзю народных паэтаў Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа прысвячаецца спектакль «Людзьмі звацца...», у кампазіцыю якога ўваходзяць творы нашых класікаў. Вялікае значэнне надаецца ў нас спектаклю «Дыхайце эканомна» па п'есе народнага пісьменніка БССР А. Макаёнка. Бо гэта наогул першая сустрэча калектыву з вядомым і папулярным драматургам. Далей мы маем намер даць сцэнічнае ўвасабленне раману «І дольше века длится день» Ч. Айтматава. Наладзілі творчы кантакт з Я. Брылём, проза якога нясе ў сабе зарад сапраўдных драматычных канфліктаў.

Наперадзе новыя спектаклі па творах Шэкспіра («Бура»), Г. Ібсена («Здані»), а на малой сцэне — інсцэніраваныя апавяданні А. Чэхава і В. Шукшына

Замацоўваюцца шэфскія сувязі Рускага тэатра БССР з Мінскім камвольным камбінатам і працоўнымі сельскай гаспадаркі Капыльскага раёна.

ВЫНІКІ, ПЛАНЫ, ЗАДУМЫ

Слова — дырэктару Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР В. БУКАНЮ:

— Як вядома, сёлетні сезон для нашага калектыву юбілейны. Вясной, у маі 83-га, Дзяржаўнаму тэатру оперы і балета Беларусі споўніцца 50 гадоў. Сярод набыткаў папярэдняга, 49-га сезона — некалькі новых буйных работ тэатра. Пастаноўкі «Снягурачкі» М. Рымскага-Корсакава (дырыжор У. Машэнскі, рэжысёр С. Сільніцкі, мастак І. Сумбаташвілі) і «Шчаўкунчыка» П. Чайкоўскага (дырыжор А. Анісімаў, харэаграфія і пастаноўка В. Елізар'ева, мастак Я. Лысык) — практычны адказ на слушную крытыку ў тым, што апошнім часам была зніжана ўвага тэатра да пастановак рускай класікі. Далей — «Новая зямля», опера Ю. Семянякі на лібрэта А. Петрашкевіча паводле паэмы Я. Коласа (дырыжор А. Анісімаў, пастаноўка С. Штэйна, мастакі І. Севасцьянаў, І. Булгакава, харэаграфія В. Гаявой) і «Курган», балет Я. Глебава па матывах паэзіі Я. Купалы (дырыжор А. Анісімаў, лібрэта А. Вярцінскага і Г. Маёрава, балетмайстар Г. Маёраў). Гэтыя дзве прэм'еры прысвечаны юбілеям беларускіх песняроў.

Пад знакам 60-годдзя СССР прайшоў у тэатры III Усесаюзны фестываль творчай моладзі музычных тэатраў. Таксама ў гонар юбілею краіны былі праведзены дні Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР у Малдавіі з удзелам салістаў А. Саўчанкі, У. Экнадзіёсава, Т. Яршовай, А. Мартынава, Н. Дадзішкіліяні, У. Камкова і галоўнага дырыжора А. Анісімава. А ў Мінск прыязджалі і ўдзельнічалі ў нашых спектаклях вядомыя майстры мастацтваў Літвы — дырыжор І. Алекса і салістка І. Мількевічутэ.

Чым яшчэ адметны мінулы сезон? Значнай колькасцю акцёрскіх уводаў (і значных работ у новых пастаноўках), асабліва сярод моладзі і прытым— у вядучыя партыі. Выпускніца Беларускай кансерваторыі Н. Руднева, напрыклад, паспяхова дэбютавала ў партыях Леля і Вясны ў «Снягурачцы». А У. Экнадзіёсаў, ужо добра знаёмы слухачам, упершыню выступіў у партыях Самазванца («Барыс Гадуноў») і Дона Карласа.

Хор тэатра значна абнавіўся, «памаладзеў»: цяпер больш чым палова яго — нядаўнія выпускнікі музычных навучальных устаноў. «Навабранцы» ўдала паказалі сябе ў рабоце над вельмі працаёмкімі для хору спектаклямі «Снягурачка» і «Новая зямля». Вылучаецца і балет. Чытачы «ЛіМа» ўжо ведаюць пра яго нядаўні візіт у Сірыю — імёны артыстаў паўтараць не буду.

Сёлета ў тэатры дзейнічаў універсітэт культуры для школьнікаў Цэнтральнага раёна Мінска. Падтрымліваліся кантакты з нашай сталай аўдыторыяй — падшэфным калектывам МАЗа. І з падшэфнымі калгасамі «Праца» і «Бальшавік» на Капыльшчыне. Дарэчы, намеснік старшыні Капыльскага райвыканкома П. Сямёнаў выступіў з дакладам на адкрытым партыйным сходзе тэатра, прысвечаным абмеркаванню вынікаў майскага Пленума ЦК КПСС.

Пачаўся наш 50-ты сезон. Яго адкрыў спектакль «Новая зямля», збор ад якога цалкам аддадзены ў Фонд Міру. Днямі ў нашых спектаклях выступіць госць з Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі, выдатны спявак Д. Іярдакеску. Чакаем братняга візіту артыстаў Малдаўскага тэатра оперы і балета.

А рэпертуарныя планы нашага калектыву такія. Упершыню на мінскай сцэне ставіцца опера Ж. Афенбаха «Казкі Гофмана» (дырыжор Т. Каламійцава, рэжысёр Ю. Аляксандраў, мастак М. Кітаеў). Вядомы балетмайстар А. Вінаградаў запрошаны працаваць над «Сільфідай» Х. Лёвенск'ёльда. Да юбілею тэатра мяркуецца новае ўвасабленне «Пікавай дамы» (дырыжор У. Машэнскі, рэжысёр С. Штэйн, мастак І. Сумбаташвілі). У задумах — балет на музыку К. Орфа «Карміна Бурана», опера для дзяцей «Воўк і сямёра казлянят» П. Владзігерава, «Хаваншчына» М. Мусаргскага. А там і «Кармэн», «Рамэа і Джульета», «Спячая красуня», савецкая оперная класіка...

Працягваюцца і творчыя сувязі з беларускімі кампазітарамі: па заказе тэатра Д. Смольскі напісаў оперу «Францыск Скарына»; галоўны балетмайстар В. Елізар'еў працуе з Я. Глебавым над новым харэаграфічным творам, правобразам якога стаў мацярынскі подзвіг Настассі Фамінічны Купрыянавай. Умоўная назва будучага балета — «Крылы памяці».

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

НАШ ГАНАРОВЫ АКАДЭМІК

ДА 50-ГОДДЗЯ ВЫБРАННЯ М. ГОРКАГА ГАНАРОВЫМ ЧЛЕНАМ АН БССР

У гэтым, багатым на юбілейныя даты, годзе (60-годдзе ўтварэння СССР, 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа) ёсць яшчэ адна знамянальная дата: 25 верасня. 25 верасня 1932 года маладая Акадэмія навук Беларусі абрала сваім ганаровым членам Аляксея Максімавіча Горкага. Гэтая падзея амаль супала з выдатнай датай: 24 верасня 1932 года споўнілася сорак год з дня публікацыі першага апавядання Максіма Горкага «Макар Чудра». Значыць, у гэтыя дні мы святкуем яшчэ і 90-годдзе з пачатку яго пісьменніцкай дзейнасці. Вялікі пісьменнік, пачынальнік сацыялістычнага рэалізму быў **першы** ганаровы акадэмік нашай акадэміі. І гэтая акалічнасць таксама пра многае гаворыць. У гэтым факце бачыцца глыбокі, інтэрнацыяналістычны сэнс.

Абранне М. Горкага ганаровым акадэмікам было актам удзячнасці вялікаму пралетарскаму пісьменніку за яго нязменную ўвагу да беларускага народа, да яго фальклору, да яго літаратуры. Ён першы даў ацэнку характару маладой беларускай літаратуры і першы ў Расіі заўважыў лепшых яе прадстаўнікоў — Янку Купалу і Якуба Коласа.

Захапленне Максіма Горкага паэзіяй Якуба Коласа і Янкі Купалы звычайна звязваюць з 1910 і 1911 гадамі, з лістамі Горкага да М. Чарамнова і М. Кацюбінскага пра ўражанні ад «Адвечнай песні» і верша «А хто там ідзе?». Гэта так і было. Аднак зацікаўленасць Максіма Горкага беларусікай, беларускім фальклорам пачалася значна раней — у 1896—1900 гг.

Пра гэта сведчаць многія адзнакі і заўвагі Горкага на палях і ў тэксце кнігі А. Я. Багдановіча, бацькі Максіма Багдановіча, «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов». Кнігу гэтую А. Я. Багдановіч падараваў Горкаму ў 1896 годзе. На 180 старонках названай кнігі Горкі зрабіў 26 адзнак, разгляду якіх прысвечаны працы праф. Д. А. Балікі і А. Елісеева, а таксама мой артыкул.

Горкаўскія нататкі здзіўляюць глыбокім веданнем беларускага фальклору і мэтанакіраванасцю іх навуковага аналізу — шуканнем агульнасці ў фальклоры беларусаў, рускіх і ўкраінцаў, у славянскіх народаў наогул.

Максім Горкі быў шчырым патрыётам рускага народа і адначасова сапраўдным інтэрнацыяналістам, абаронцам нацыянальных меншасцей у Расіі ў іх імкненні стварыць нацыянальныя літаратуры, у тым ліку і беларускую літаратуру. Бацькоўскімі былі адносіны М. Горкага да творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа, да будучыні беларускай лірычнай паэзіі.

Мой блізкі друг і зямляк, акадэмік Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук нябожчык Самуіл Георгіевіч Калясноў расказваў мне, што ў 1921 годзе, калі ён кіраваў рабфакам Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, яго наведаў М. Горкі. Даведаўшыся, што Калясноў беларус, Горкі з цеплынёй успамінаў пра свае сустрэчы з беларусамі, ён сказаў: «Беларусы—народ вельмі задушэўны, вельмі мяккі, гасцінны, даверлівы... Беларусы—надта працавіты народ, які хутка выявіць сябе, у першую чаргу ў лірыцы». Прадбачанне Максіма Горкага спраўдзілася.

Важным фактарам асаблівай цікавасці Горкага да беларускага фальклору і маладой беларускай літаратуры было сяброўства яго з А. Я. Багдановічам. Кацярына Паўлаўна Пешкава ўспамінала ў гамонцы са мною ў 1946 годзе, што М. Горкі любіў беларускія песні і сам часам спяваў іх разам з Адамам Ягоравічам.

Горкі цікавіўся беларускай народнай музыкай і прасіў рэдакцыю «Нашай нівы» прысылаць яму на Капры матэрыялы пра яе. Рэдакцыя адгукнулася на яго просьбу.

У 1928 годзе М. Горкі вярнуўся з Італіі на радзіму. На станцыі Негарэлае Горкага сустракалі Якуб Колас і Янка Купала. У 1934 годзе на Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў М. Горкі, у часе сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі на дачы, як успамінае пра гэта Якуб Колас, «жыва цікавіўся беларускай паэзіяй, народнай творчасцю, літаратурнымі помнікамі і прапанаваў распачаць працу па стварэнні гісторыі беларускай літаратуры».

На фатаграфіі беларускіх пісьменнікаў у гасцях на дачы Горкага, змешчанай у БелСЭ, Максім Горкі стаіць у цэнтры, а з левага і правага бакоў стаяць Янка Купала і Якуб Колас, нашы першыя акадэмікі. Гэта як бы ілюстрацыя да трох вялікіх дат у гісторыі беларускай культуры, бо выбранне М. Горкага ганаровым акадэмікам АН БССР — акт знамянальны. Ён не толькі даў класічныя навуковыя ацэнкі найбольш выдатным з'явам мастацкай культуры Беларусі — творчасці Купалы і Коласа, — не толькі ўмеў прадбачыць будучае нашай паэзіі, не толькі спазнаў душу нашага народа, не толькі выдатна пераклаў на рускую мову гімн дарэвалюцыйнай Беларусі «А хто там ідзе?». Вялікі пралетарскі пісьменнік даў узоры мастацкай творчасці, на яго раўняліся і раўняюцца, у яго вучыліся і вучацца беларускія пісьменнікі. Вось чаму ён—наш акадэмік.

Гаўрыла ГАРЭЦКІ,
акадэмік АН БССР.

ПРЫРОДА І МЫ

ПРА ЭРЫДАН, ЧЫСТУЮ ВАДУ І СУХІ КАЛОДЗЕЖ

З ВЯКОЎ МІНУЛЫХ

Гэта вельмі прыгожы, чысты, пранікнёны міф. І вельмі трагічны. Міф аб чалавечай дзёрзкасці, аб імкненні да нязведанага, аб несупадзенні «хачу» і «магу». Старадаўні грэчаскі міф аб Фаэтоне...

...Доўга прасіў Фаэтон бацьку—бога сонца Геліоса, — каб даў ён на дзень сваёй вогненнай калясніцы. «Прасі што хочаш, — казаў Геліос, — толькі не гэта». Прапанаваў узамен багацце, славу — зямное шчасце. Але юнак быў упарты, і саступіў бацька...

Вось здзейснілася мара! Фаэтон трымае ў руках лейцы, нецярпліва фыркаюць сонечныя коні. Уперад! Як страла, панеслася калясніца, ажыло ўсё, золатам зазіхацела неба. Поўніцца радасцю сэрца юнака, горда глядзіць ён на праплываючыя ўнізе гарады, палі, рэкі. Сёння ён—сонца...

Не буду пераказваць гэту вядомую легенду. Зеўс пакараў самазванае «сонца», і Фаэтон упаў і загінуў у хвалях ракі Эрыдан. Далёка ад роднай зямлі, у краіне сонечнага захаду...

На берагі той ракі прыйшлі сёстры Фаэтона—Геліяды. Горка плакалі яны па браце. І ператварыліся яны ў высокія стройныя таполі, а іх слёзы — у смалу, у цудоўны сонечны бурштын-электрон...

Цудоўная казка, ці не так? А, між іншым, гэта, бадай што, першае ўпамінанне аб Заходняй Дзвіне, якое дайшло да нас. Так, не здзіўляйцеся, рака Эрыдан, апетая яшчэ Гамерам, Гесіёдам і Авідзіем — наша Дзвіна. Праўда, у ніжнім сваім цячэнні. Ведалі яе старажытныя грэкі і фінікійцы ў сувязі з бурштынавым гандлем.

Цякла Дзвіна праз стагоддзі, мяняючы дзесяткі назваў — Эрыдан, Рудон, Рубон, Радан, Херзін, Турунт, Дзіна, Дзюна, Віна, Вейна... Яе пазначалі на сваіх картах Пталемей і Герадот. Яе хвалі рассякалі ладдзямі мужныя нарманы — вікінгі і берзекеркі. Здаўна сядзелі тут славяне, і адзначыў калісьці летапісец Нестар: «Днепр бо потече ис Волковьского леса, и потечеть на полдень, а Двина ис того же леса потечеть на полунощье и внидеть в море Варяжьское».

Варта ўспомніць, што ўвесь характар гісторыі нашай краіны, як яна азначылася ў першы час, поўнасцю залежаў ад старажытнейшых сувязей балтыйскай славянскай поўначы і чарнаморскага грэчаскага поўдня. Як пісаў той жа Нестар: «Бе путь из Варяг в Греки и из Грек...». Дзякуючы гэтаму гандлёваму шляху ўзніклі і ўзмацніліся старадаўнія гарады зямлі беларускай — Полацк з Віцебскам. Дзякуючы Дзвіне... «Берега Двины серебряные, а дно ея золотое», — казаў ніхто іншы, як Грозны цар Іван Васільевіч, маючы на ўвазе гандлёвае значэнне нашай ракі.

...І сёння цячэ Дзвіна, многае памятае. І стаіць на ёй тысячагадовы Віцебск. Можа, ды й павінен, ганарыцца горад ракой, бо пісаў жа вядомы французскі географ Рэклю: «Рэкі нясуць у хвалях сваіх гісторыю і жыццё народаў».

Нашу з вамі гісторыю—таксама.

ВУЛІЦА ДЗВІНА

Мы так прызвычаіліся да вады, да «H_2O без колеру-паху», што не можам нават у думках пазбавіцца яе. Гэта ж уявіць страшна, што ў Віцебску знікла б Дзвіна. Вось так, раптам, знікла і сапраўды няма «колеру-паху»... У каго хопіць фантазіі паразважаць на гэту тэму, няхай сядае пісаць сцэнарый фільма-катастрофы.

А мы пакуль што паглядзім на Дзвіну. Сёлета яе не пазнаць. Пастаралася прырода, вялікім снегам і дажджамі падсілкавала раку — і вось цячэ яна праз увесь горад, радуе вока. Два гады назад, памятаю, назіраў я з моста, як дзятва гуляючы «пераплывала» Дзвіну: метраў дваццаць пехам па дне, потым некалькі ўзмахаў над фарватэрам — і зноў вады па грудзі, ідзі да наступнага берага. Дужа ж мелка тады было. Нават я, дваццацігадовы «старажыл», і то незадаволена круціў галавой: маўляў, вось раней...

Галоўная віцебская вуліца. Ці не будзе перабольшаннем назваць так раку? Відаць, не. Яна — той стрыжань, на якім вядзецца ўсё добраўпарадкаванне цэнтральнай часткі горада, галоўны элемент яго ландшафтаў. На яе пакручастых берагах размешчаны амаль усе паркі і скверы, самая вялікая і самая прыгожая плошча — плошча Перамогі. Дзвіна — працаўніца. Ад самай паводкі да ледаставу цягне яна з-пад Веліжа плыты, возіць пясок, шчабёнку, гравій...

І гэта яшчэ не ўсё. Дзвіна — галоўная артэрыя Віцебска, яго жыццё. Горад прагна прыпаў да вады. Працягласць віцебскага водаправода сёння — 257 кіламетраў, за год па ім працякае амаль 52 мільёны кубічных метраў вады. 150 тысяч за суткі. Два кубаметры за секунду. Многа гэта ці мала? Калі ўсю гэту ваду выліць, напрыклад, у Віцьбу, даўжыня якой 33 кіламетры, атрымалася б сярэдніх памераў рэчка. Метраў сем у шырыню і два метры ў глыбіню. Гэтай «рэчкай» жывяцца шматлікія заводы, фабрыкі, школы, бальніцы, магазіны, яна кіпіць на плітах у гаспадынь, ёю мыюцца і мыюць... Дарэчы, кожны віцябчанін для асабістых патрэб ужывае амаль 200 літраў вады ў суткі. Праўда, не з самой Дзвіны, але і рака, і вада, што знаходзіцца ў артэзіянскіх свідравінах, — адзінае і непадзельнае цэлае.

Уся гэта вялікая колькасць вады проста неабходна, каб паўнакроўным жыццём жыў і працаваў больш як трохсоттысячны Віцебск — буйны прамысловы і культурны цэнтр нашай рэспублікі. І рака дае гораду вады роўна столькі, колькі трэба. І заўтра будзе даваць, і паслязаўтра...

А ўзамен?

Складаная экалагічная сістэма «горад — рака» — гэта перапляценне біялагічных, эканамічных і нават сацыяльных праблем. І ёсць у ёй адна адметнасць. Правадзімасць у абодва бакі. Усю ваду, узятую ад ракі, трэба ёй вярнуць спаўна. Зрэшты, яна сама вернецца па законе, вядомым яшчэ з падручніка прыродазнаўства для трэцяга класа. Ёсць там схема, якая дакладна ілюструе кругазварот вады ў прыродзе. Пытанне: якой яна вернецца?.. Кепска, калі бруднай. Добра, калі чыстай.

— Ачыстка сцёкавых вод — праблема нумар адзін, — сказаў мне старшыня гарвыканкома А. Д. Палейка. — Над ёй мы многа думаем, многае робім для яе хутчэйшага вырашэння. Ды і зроблена ўжо нямала. Напрыклад, на самым беразе Дзвіны стаяў гарбарны завод, колькі клопату з ім было... Ведаеце, якія там умовы, санстанцыя спакою не давала. І вось перанеслі мы яго з цэнтра горада. Тое ж самае робім з суднарамонтнымі майстэрнямі і прыстанню... А ў хуткім часе ўвесь левы бераг ператворыцца ў паркавую зону — ад Маркаўшчыны да парку Мазурына. Ужо ёсць праект, выдзелены сродкі. Галоўная вуліца павінна быць чыстай і прыгожай...

Хочацца верыць, што так і будзе. А пакуль што супакойвацца нельга. «Праблема нумар адзін» стаіць вельмі востра. На жаль, сёння Віцебск не вельмі шануе Дзвіну.

КОЛЬКІ КАШТУЕ ЗАЛП?

— Залп!

Вы ўжо ўявілі батарэю гармат? Але вымушаны вас расчараваць, ніякай стралянiны не будзе. Наадварот, усё будзе ціха. Не страсянецца зямля, не дзынкнуць шыбы. Проста адкрыецца кран і з трубы выльецца ў раку некалькі вёдзер якога-небудзь хімічнага рэчыва. Ці апрастаюць у рашотку ліўневай каналізацыі бочку з мазутам.

Вось некалькі прыкладаў такіх «залпаў».

Сакавік бягучага года. Эксперыментальнай базай «Тулава» дапушчана ўцечка сцёкаў у рэкі Віцьба і Дзвіна. Галоўны інжынер Шут М. А. аштрафаваны на 50 рублёў.

Таксама сакавік. За скіданне ў Дзвіну мазуту галоўны інжынер Віцебскага масла-экстракцыйнага завода Плюшч В. М. аштрафаваны на 25 рублёў.

Красавік. Здарэнне на мясакамбінаце. Таксама мазут і таксама ў Дзвіну. 25 рублёў штрафу заплаціў на гэты раз майстар кацельнай Пракудзенка А. З.

Звярніце ўвагу на штрафы. Гэта — плата за «залп». Але не ягоны кошт.

— На жаль, цяжка, проста немагчыма вызначыць страты ад «залпаў», — тлумачыць начальнік басейнавай інспекцыі абласной інспекцыі па ахове прыроды В. М. Багоўка. — Таму што недасканалае існуючае палажэнне «Аб памерах страт ад залпавага скідання сцёкавых водаў». Калі, напрыклад, браканьер заб'е жывёліну, з яго спагоняць не толькі штраф, але і кошт здабычы, якую, у дадатак, канфіскуюць. А вось «воднае» браканьерства параўнаўча безнаказанае. Ва ўсякім выпадку, у гарадскіх умовах. Хіба дакладна вызначыш, колькі рыбы атручана, колькі жывёлін загінула, якія змены адбыліся ў фауне?..

Колькі ж каштуе «залп»? З гэтым пытаннем я звярнуўся да прарэктара па навуковай рабоце Віцебскага педагагічнага інстытута А. М. Дарафеева. І вось што адказаў вучоны:

— Магу сцвярджаць катэгарычна — высокая ступень прамысловага асваення Заходняй Дзвіны выклікала пэўныя змены, нават незваротныя, у жыцці ракі і яе наваколлі. Іншая справа, што змены гэтыя звычайны чалавек у звычайных абставінах не рэгіструе. Але гэта ўжо псіхалогія — многім здаецца, што ўсё яшчэ ў парадку, калі ў небе спявае птушка, у прыбярэжнай вадзе можна заўважыць чараду малявак, а рачныя берагі зялёныя ад травы... А якая птушка? А якой рыбы маляўкі? Што расце на беразе? Варта адзначыць, што толькі нямногія, але шырока распаўсюджаныя і вельмі жывучыя віды, як, напрыклад, сарокі і галубы, лімонніцы і капусніцы, пырнік і дзьмухаўцы, цудоўна адчуваюць сябе ў самых неспрыяльных умовах... А, між іншым, ці ведаеце вы, што Дзвіна наша — рака унікальная? У ёй гадуецца вугор, па ёй плыве ён на нераст у далёкае Саргасава мора. Дык вось, вугор вельмі востра рэагуе на чысціню вады, не тое, што ёрш ці якая-небудзь верхаводка... Зразумейце мяне правільна. Ніводзін эколаг ніколі не скажа, што трэба стрымліваць прамысловае развіццё... Наадварот, лічу, што ў гэтых умовах можна больш плённа весці работу па ахове прыроды. І гэта не парадокс, а жыццёвая рэальнасць. Існуе вялікая колькасць праектаў, у тым ліку і па ачыстцы забруджаных сцёкаў. Трэба толькі хутчэй укараняць іх... Без гэтага нельга эфектыўна весці прыродаахоўную работу і даводзіцца дорага плаціць за гэтыя, як вы кажаце, «залпы»...

ТРЫЦЦАЦЬ МІЛЬЁНАЎ

А цяпер, калі вы ўжо дастаткова разгневаліся на «артылерыстаў», дазволю сабе зазначыць, што не яны робяць надвор'е. Ва ўсякім выпадку, далёка не толькі яны. Бо калі нельга дараваць, то можна зразумець таго інжынера ці начальніка, па віне якога адбыўся «залп». Ну, з'явіўся нейкі «мазутны неліквід». Што з ім рабіць? А ў ваду! Каб вочы не мазоліў...

Але хіба можна толькі гэтым растлумачыць той факт, што за год у Віцебску трапляе ў Дзвіну 30,9 мільёна кубічных метраў недастаткова ачышчаных і забруджаных сцёкаў (па дадзеных Дзяржкамітэта БССР па ахове прыроды)?

Не, не і яшчэ раз не! Бо прычыны з'яўлення тых трыццаці мільёнаў куды больш «аб'ектыўныя». Так што прапаную пагаварыць менавіта пра іх.

...На ўскраіне Віцебска ёсць так званы Тарны пасёлак. Тут размешчаны гарадскія ачышчальныя збудаванні. Па двух калектарах (з левага і правага берагоў Дзвіны) падаюць сюды сцёкавыя воды. Спачатку іх прапускаюць праз сістэму рашотак і накіроўваюць у первічныя адстойнікі. Там яны знаходзяцца гадзіну—і на гэтым этап механічнай ачысткі закончаны. Пачынаецца другі этап, заснаваны на цудоўнай здольнасці вады да самаачышчэння — аэрацыі. Гэты працэс адбываецца ў аэратэнках. Ваду насычаюць кіслародам, пачынаецца буйны рост мікраарганізмаў, якія з'ядаюць усе арганічныя рэшткі. Потым зноў адстойнікі, апрацоўка хлорам і, нарэшце, вада—ужо чыстая — вяртаецца ў Дзвіну.

Так павінна быць, згодна з тэхналогіяй ачысткі. Але тэхналогія тая парушаецца, таму што гарадскія ачышчальныя збудаванні працуюць сёння з вялікай перагрузкай. Замест 70 тысяч кубічных метраў сцёкаў у суткі (па норме) праз іх праходзіць каля 90 тысяч. Час знаходжання вады ў аэратэнках і адстойніках, такім чынам, скарачаецца амаль у паўтара разы і аб якасці ачысткі гаварыць ужо не даводзіцца. Вось як атрымліваюцца тыя «недастаткова ачышчаныя» сцёкі.

Дадам, што на самай справе перагрузкі гарадскіх ачышчальных збудаванняў намнога больш шыя, чым паўтарачныя. Бо прадпрыемствы нярэдка падаюць на іх такую забруджаную ваду, што і вадой яе назваць неяк няёмка. У чым справа—зразумела. Не працуюць лакальныя ачышчальнікі на саміх прадпрыемствах. Дакладней, дрэнна працуюць з прычыны маральнай састарэласці. Яны разлічаны толькі на механічную ачыстку і, часткова, на затрымліванне нафтапрадуктаў. У вытворчым аб'яднанні «Аблводаканал», якое эксплуатуе гарадскія ачышчальні, мне назвалі найбольш злосных парушальнікаў: мясакамбінат, дрэваапрацоўчы камбінат, піўзавод... За гэта таксама штрафуюць, але атрымліваецца, што «Аблводаканал» аб'ектыўна зацікаўлены ў як мага большай забруджанасці сцёкаў — аб'яднанню даведзены план... па штрафах. У гэтым годзе ён складае 900 тысяч рублёў. За шэсць месяцаў ужо спагнана 425 тысяч. І мяне запэўнілі, што, нягледзячы на невялікае адставанне, план будзе выкананы і перавыкананы.

А вось ці будзе да канца бягучага года ўведзена ў строй другая чарга гарадскіх ачышчальных збудаванняў? Калі меркаваць па тэмпах асваення капіталаўкладанняў, то не. Калі верыць кіраўніцтву будаўнічага трэста № 9, які вядзе аб'ект, то будзе... Што ж, практыкам відней...

Варта ўспомніць і пра каналізацыю. У Віцебску яна таксама працуе з вялікай перагрузкай. Бо будавалася даўно і сучасным патрабаванням не адпавядае. Для таго, каб трубы не лопнулі ў час пікавага ціску, прымяняюць так званыя «аварыйныя выпускі». Яны размешчаны на самым беразе, і калі па трубах ідзе вялікая колькасць сцёкаў, аварыйныя калодзежы перапаўняюцца, вада з іх льецца проста ў Дзвіну. Якая гэта «вада», жыхары ведаюць.

Вось так, паціху, і набягаюць тыя трыццаць мільёнаў кубоў. Успомнім, што Віцебск спажывае ў год 52 мільёны. Такім чынам, больш паловы з іх вяртаецца Дзвіне, мякка кажучы, не такой чыстай, як хацелася б...

КОЛІ-ТЫТР І СЛІЗКІ РУЧАЙ

І ўсё ж, чыстая дзвінская вада ці не? Па адказ я прыйшоў на гарадскую санітарна-эпідэміялагічную станцыю. Гутару з загадчыкам аддзела камунальнай гігіены В. Ю. Паўленкам.

— Нядаўна былі падведзены вынікі больш чым дзесяцігадовых назіранняў за станам вады ў Дзвіне. І вось што мы высветлілі. Праведзеная за апошні час работа па цэнтралізацыі збору і ачыстцы сцёкавых вод, рэзкае зніжэнне неачышчаных сцёкаў спрыяльна паўплывалі на якасць вады. Палепшыўся гідралагічны рэжым, біялагічная патрэбнасць вады ў кіслародзе не перавышае нормы, панізілася канцэнтрацыя шкодных рэчываў... Але некаторыя дадзеныя не могуць нас не хваляваць. Датычыць гэта бактэрыялагічнага стану вады...

Тут я ўпершыню пачуў пра колі-тытр і пра Слізкі ручай. Але, відаць, трэба растлумачыць, што гэта такое.

Колі-тытр — гэта паказчык, які прымяняецца пры бактэрыялагічным аналізе. Паколькі цяжка вызначыць колькасць усіх мікраарганізмаў у вадзе, вымярэнне вядзецца толькі па кішэчнай палачцы. Колькасць яе ў пэўным аб'ёме вады і ёсць колі-тытр.

Слізкі ручай цячэ ў адным са шматлікіх віцебскіх яроў. А яшчэ ў ім знаходзіцца адзін са шматлікіх аварыйных выпускаў. Паводле дадзеных санстанцыі, за суткі з гэтага ручая трапляе ў Дзвіну паўтары тысячы кубічных метраў забруджаных сцёкаў.

(Заканчэнне на стар. 13).

ПАЭЗІЯ

Раіса БАРАВІКОВА

З кнігі «Адгукнуся голасам жалейкі»

●

Цяжэе цень мой лёгкі на сцяне,
няўмольнае, гадоў шырэе вусце.
Вось ужо і сын не верыць мне,
што дзяцей знаходзяць у капусце...

Дым гаркавы ляжа на палі,
скрые скруху засух, недародаў.
Перад сынам — весніх дзён разліў,
прада мною — восеньскія годы.

Не скажу я долі: барані!
Папрашу: пакінь святло ў паглядзе,
каб дажыць мне дні свае ва ўладзе
шчырасці, любові, дабрыні...

Там...

Якой адлегласцю аддалены,
якой імжакаю затканы
мае палескія праталіны,
мае сунічныя паляны?..

З дарогі радуюся дому,
як самым дарагім дара́м,
але не меней і другому, —
кароценькаму слоўку — там...

Там скажа дзіўна: «Ў Антапо́лле!»,
калі ў Антопаль на кірмаш
вязе дзе лесам, а дзе полем
вясёлы бондар свой багаж.

Яшчэ ў павазе там красёнцы,
і хлеб — акрасаю стала;
там вызначаецца па сонцу
сцяжына з лесу да сяла...

Улетку там шукаюць восы
салодкі яблык у лісці;
І нечакана можа ўвосень,
як лёс, сунічнік зацвісці...

Шматлюдны горад мой сталічны,
людзей — мурашак талака,
але адразу па абліччы
заўжды пазнаю земляка.

Прыйшлі глыбокія туманы,
вось-вось і сцюжы загудуць,
а ўсё здаецца, — там паляны
мае сунічныя цвітуць...

●

Непадуладна ні вятрам, ні сцюжы,
хоць, знаю, волі — горкая цана,
але часцей пад ногі сцеле ружы
жыццё таму, хто волю п'е спаўна...

А ён прыйшоў і загадаў: «Даволі!
Вось стол, калыска, і... букецік руж,
а калі сэрца зноў запросіць волі,
дык воля — я, твой уладар і муж».

Прымала ружы дрогкаю рукою,
як навасёл кватэрныя ключы...
Раней было — раўнялася з ракою,
цяпер — па строгім мужавым плячы.

А ён смяецца: «Ну, адкуль няволя?
Глядзі, як светла выбелена столь!..
Было чаго з агнём табе сваволіць?!.
Душа мая, ты зараз—пасваволь...».

●

Забыць і назаўсёды адысці.
Навошта — Вы, і голас Ваш, і крокі?
Навошта дрэва марыць аб лісці,
калі цяпло ад дрэва так далёка?!.

Адмовіцца, каб ведаць, што знайшла!
Купіць білет, і слухаць Дзіна Рыда,
і чуць, як у душы смяецца крыўда,
з таго, што вера доўга ў ёй жыла.

Адмовіцца! — насуперак кручыне, —
і гэта ўсё, што ў долю магу даць
не брату, не таварышу, — мужчыне! —
і вернасцю сваёю пакараць.

●

Пласцінка — чорнае азерца.
Заместа хвалі — гукаў плынь...
Хутчэй настройце, друг мой, сэрца
на веснавога неба сінь.

Было б зусім несправядліва
пад нечы жаласны матыў
глядзець вакол сябе зласліва
ў шуканні ўласнай праваты.

Яшчэ не выпіты да донца
любві астатнейшы глыток.
Хай дапаможа праўдзе сонца,
а сэрцу — ў небе галубок.

Той галубочак — голуб міру,
дык зберажыце ў сэрцы мір,
ён і герою, і куміру
у свеце — лепшы павадыр.

●

Раптам сонечна і блізка
позірк твой злаўлю.
Неба — жураўлю калыска,
я люблю — зямлю.

З пахам кмену і каляндры
толькі выйдзі ў сад,
абаўе, як хмель, гірляндай
дзікі вінаград.

Толькі сёння я не выйду.
Чуеш — сэрца стук
мне расказвае пра крыўду
ад няверных рук.

Бо з чаго такі ліслівы,
хітры баламут?
Дай і мне пабыць шчаслівай
у агні пакут.

Пад грушай у час дажджу

Ах, гэта восеньская радасць! —
Нібы зрывае дожджык злосць.
А ты ратуешся парадай:
да лепшага ўсё, што ні ёсць!
Шатром збяднелым груша стыне.
Мой грозны верасень, буянь!
Ты толькі рызыкі падкінеш,
як шторм адчаю ў акіян!
Надрыўна б'ецца пазалота
лісця сырога ля рукі.
Пра што вядзьмараць каля плота
над глебай чорнаю гракі?..
Мне і без іх вядома — восень!
Але не ўсё пайшло агнём...
Сягоння нешта не ўдалося, —
дык трэба жыць наступным днём.
Хай над сваім, жаночым, плачу,
затое ў іншым выйграю,
калі магу чужую ўдачу
прыняць, як лепшую, сваю.
Навее слотны вечар роспач, —
падумаю: не навіна!
Ёсць роспач, значыць, радасць побач,
і хутка з'явіцца яна...
А дожджык, знай сабе, цярушыць,
шуміць халодны вадаспад.
Бягу. Чаго стаяць пад грушай?
І... наўздагонку — лістапад!..

Паводле народнага

Пэўна, д'ябал падштурхнуў...
Дзед адклаў чытанне
і задзірыста гукнуў:
— Дзе ты там, Малання!..

Адстаўляй на лаву гляк,
мо пара й не тая,
але выйшла б у вішняк,
быццам маладая!

Пастаім без салаўя
(ён, часамі, лішні),
ды затое ж буду я,
бы хлапец пад вішняй.

Бабка знала, што не след...
Ды, каб жа не ў крыўду,
адказала: «Добра, дзед,
ты ідзі... Я — выйду!»

І між росных, пахкіх траў
дзед, сабе на гора,
доўга стоена стаяў
з ценем над разорай.

Толькі ў хаце, сам не свой,
гнеў сагнаў старэчы:
— Я паўночы — сам з сабой,
а яна... на печы!

Вось табе і вішнячок!
Лоўка падманіла...
А Малання: «Мой дзядок,
мамка не пусціла!».

Кастусь ЖУК

●

Схлынь, зацятасць! Млявасць,—схлынь!
Хай бурляць радкі ракою!
Я абраў такую плынь,
Дзе ані няма спакою.

Можа, вынесе на плёс...
Можа, у віры засіле...
Лёс —і радасны да слёз,
І пакутны — да бяссілля.

Мрою
Хоць гады ў рады
Спасцігаць глыбіні, высі...
Мне, як рыбе без вады,
Без высноў — не абысціся.

І прыходзяць, як заўжды,
Да мяне Купала, Колас...
І ўжо трызніць песняй голас
Малады...

У Мікалаеўшчыне

Выпраменьваюць леты
Воблік дзядзькі Якуба.
Дзе ты, лецейка, дзе ты —
Час набытку і згубаў?

Можа, там, за пагоркам,
На крыле перапёлкі?
Можа, там, за пагостам,
Дзе губляюцца вёрсты?

Па-над тынам, парканам —
Птахаў лёт непакорны.
Як адкрытая рана,
Смерць дагэтуль — дакорам.

Перад сумам аблокаў,
Перад выспелым летам —
Над зямлёю высока
Льецца голас паэта...

Таежная пуцёўка

Дарог нявызнаных смуга,
І вецер веку мружыць вочы...
Работай выверыць тайга
Настрой хлапечы і дзявочы.

У нетрах стоеных, глухіх
Між буралому ці гушчэчы —
Прытуліць дужых, маладых
Край гэты вешчы.

Яшчэ мазоліцца рукам,
Яшчэ лубець нязвыкла тварам —
А ўжо світае слова БАМ
У снах і летуценных марах.

І прыбаўляецца няўзнак
І ўпэўненасці — і трывогі.
І хочацца хутчэй спазнаць
Крутой тайгі характар строгі.

Бацькоўскі сад

Бацькоўскі сад... Ён мне напамінае
Святочны храм,
Дзе музыка лунае.

Тут чуцен спеў аргана і дамбры.
І кантрабаса
Ладны гуд чмяліны.
Завітвайце часцей сюды, сябры,
Абгаварыць — і выслухаць навіны.

Бо тут — такая музыка гучыць,
Такія спалучаюцца акорды,
Што хочацца на свеце жыць і жыць,—
Не знаць тугі не месяцы,
А годы.

Спявай, спявай зычней, вясновы сад!
Бацькоўскі сад! Маленства сад шыкоўны!
Як хлапчанё, вітаць заўсёды рад
Шпакамі абгуканыя шпакоўні.

Я, як язычнік, на цябе гляджу —
І адчуваю дух святы лістоты.
І ў неба — для цябе малю дажджу.
І ў пчолкі — бзыкання малю употай.

Гары! Гары, зялёных дрэў касцёр!
Я водарам прапах — як мёдам поплаў.
Ты мне гасцінна рукі распасцёр,
Як ліўням распасцёрла рукі — поле.

Прымаю твой давер і цеплыню
І кланяюся ў думках штохвіліны
Дрыготкаму зялёнаму агню —
Тваім галінам.

Палешукі

Люблю за шчырасць вас, палешукі,
За мудрую хітрынку ў час размовы.
За тое,
Што яшчэ ні перад кім
Не пакрывілі ні душой, ні словам.

Салёную і горкую падчас,
Агорвалі вы долю — цягавіта.
А зараз
У вітках касмічных трас
І вашай славы значыцца арбіта.

Даўно забыты — голад, недарод.
І ёсць палешуку чым ганарыцца:
Над малярыйнай чэзласцю балот,
Як лес,—
Шуміць палеская пшаніца.

●

Неба выспела святлом,
Пачынае птушак гушкаць.
Басаножым за сялом:
Я, пастух, і ты, пастушка.

Пасвім ранішні туман,
Слонак сонных між аеру...
Гэта праўда, не спадман:
Дзень адкрыў у казку дзверы.

Малады, спакусны час.
Радасць сэрцаў — разгадана:
Нас каханне ў першы клас
Павяло сцягой жаданай.

У палоне пачуцця —
Хмель вачэй святы, нявінны...
Мы чакаем адкрыцця,
А яно — давер наіўны!..

Вяснянка

Збягае сцежка к бальшаку,
Каля альтанкі.
Куды ўцякаеш? Дай руку,
Мая вяснянка.

Куды ўцякаеш? Што нясеш
З сабой у сэрцы?
І ці да раніцы заснеш,
Друг міласэрны?

Свяшчэнным будзе гэты луг
На развітанне,
І светлы месяца паўкруг,
І зорак ззянне.

Але чаму з вачэй сама
Спадае горыч?
І светлай радасці няма?
І знікла гордасць?

Задуха, бы ў глыбокі лёх
Сягнуў на момант?
І страшны сум на сэрца лёг,
Цяжкі, як молат?

— Пасто-ой!..— гукаю далячынь,
Шукаю зладу.
Што крык! Хоць рукі надтачы
На даль пагляду.

Перацінае боль скразны
Душу і цела.
Ты прыляцела ў час вясны —
І адляцела.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР

ЗОРНЫ ЧАС ПАЭТА

«Маўчанне травы» В. Зуёнка—не першая ягоная паэма: да гэтага была «Сяліба», увогуле прыхільна сустрэтая чытачом і крытыкай. Вопыт «Сялібы» скарыстаны і ў «Маўчанні травы», але аўтар на гэты раз прыходзіць да значна больш ёмістага, сацыяльна і маральна насычанага эпічнага абагульнення, шырока разгорнутага ў прасторы і часе. Далёка не кожнай паэмы хапае на цэлую кнігу (маецца на ўвазе, зразумела, не памер твора), а «Маўчанне травы» адпавядае такім патрабаванням: гэта па-сапраўднаму маштабны мастацкі свет, «паэма лёсу», як называе свой твор аўтар. Называе не без падстаў — гаворка ідзе пра няпросты жыццёвы шлях чалавека, у якім адлюстраваўся народны лёс на цяжкіх, пераломных этапах гісторыі, ад дакастрычніцкіх часоў да нашых дзён. Паэма ўражвае шырынёй і ўгрунтаванасцю светапогляду паэта, глыбокім роздумам над лёсам роднага краю, які паэтызуецца ў вобразе веснагоркі — прыдарожнай гары-кургана.

Веснагорка, маці Беларусь,
І адкуль, скажы, не пёрла намець?..
На крыжах—Скарына і Кастусь,
Лёс народа, сэнс яго і памяць.
На крыжах кружыў з усіх Еўроп
Вецер злы з крывавым чадам Азій.
Ды знаходзіў люд мой чарнатроп
І да сонца зноў і зноў вылазіў.

В. Зуёнак не першы ў беларускай літаратуры спрабуе асэнсаваць гістарычны лёс народа, але, як вядома, шляхі мастакоўскіх пошукаў шматстайныя — у кожнага свой...

Беларуская паэзія здаўна славілася сваімі ўстойлівымі мастацкі развітымі эпічнымі традыцыямі, пачатак якім паклалі народныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», а таксама творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча. Нельга не прыгадаць таксама ў гэтай сувязі імёнаў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, многіх іншых і, магчыма, у першую чаргу А. Куляшова, дасягненні якога ў галіне эпічна-паэмных форм асабліва ўражваюць.

Што ж новага адкрыў, ідучы па ўжо традыцыйным шляху, В. Зуёнак?

Пачнём з таго, што яго паэма пры ўсёй сваёй эпічнай заглыбленасці, аўтабіяграфічная. Падзеі ў паэме адбываюцца ва ўсходняй частцы Беларусі — у родных мясцінах паэта, вёсцы з абаяльнай назвай Узбор'е.

Палёўка пры лесе—Узбор'е—
Вёска—сорак двароў:
На захад—жытное горне,
На ўсход—перазовы бароў,—

так пачынаецца паэма, у якой аўтар паэтызуе сваё Узбор'е — блізкае яму і бясконца дарагое. Узброены пачуццём свядомага гістарызму, аўтар ідзе да вытокаў — хоча даследаваць карэнні сацыяльнага і духоўнага жыцця народа.

І тут, у паэме, шмат лірычных адступленняў, падказаных аўтару ўспамінамі дзяцінства, якія, аднак, не толькі не супярэчаць эпічнаму пачатку, але і паглыбляюць яе праўдзівасць, узмацняюць верагоднасць і цеплыню пачуццяў. Гэта тыповая беларуская вёска, што, як гаворыцца, «спрадвеку жыве з мазаля».

Вяснуецца ў полі з сяўнёю,
П'е жніўнем з ламоткіх крыніц
І боханам—сонцу раўнёю—
Узыходзіць на покут святліц.
Ля борцяў узятак цікуе,
Румуе калоды на сплаў,
Цяслярыць і скрыпкі штукуе—
Ніхто не прыліпне да лаў!

Звярніце ўвагу на паэтычнаё майстэрства, на дакладнасць і ёмістасць слова ў Зуёнка, на сакавітасць пісьма. Ён умее адным штрыхом — праз дэталь, «мікравобраз» — даць цэласную карціну вясковага працоўнага ўкладу. Цудоўна апісаны сцэны ў карчме, перабудова вёскі на новы лад, касьба, рытуал вясковай лазні, у якой чалавек выганяе бярозавым венікам хворасць і стому пасля працоўнага тыдня. Паэма—уся! — прасякнута народным духам, ахутана атмасферай фальклорнага сінкрэтызму. У слове паэта спалучаюцца адлюстраванне і выражэнне, паказ і гучанне, думка і пластыка. Ён умее цаніць устойлівыя народныя выразы, у якіх адклаліся цэлыя пласты жыццёвага вопыту чалавека.

Сёння шмат спрачаюцца пра сувязь літаратуры і фальклору. Паэма «Маўчанне травы» пераканаўча пацвярджае і сцвярджае здольнасць фальклору дзейсна ўзбагачаць светаўспрыняцце сучаснага чалавека, надаць яму адчування, на якой вялікай таўшчыні часу ён стаіць.

І ўсё ж такі паэма, відаць, не адбылася б як паўнацэннае эпічнае палатно, калі б даўняе, спрадвечнае не было б так арганічна спалучана з сучаснасцю, як яно спалучана ў «Маўчанні травы». Менавіта гэтым яна і цікавая.

Са з'яўленнем на сцэне галоўнага героя — Васіля вызначаецца асноўная праблематыка твора. Гэты чалавек чымсьці нагадвае коласаўскага Міхала з «Новай зямлі». Не чужыя яму і Мікіта Маргунок з «Краіны Муравіі» А. Твардоўскага, Кандрат Майданнікаў з кнігі М. Шолахава «Узнятая цаліна», Дзяніс Зазыба з раманаў І. Чыгрынава і іншыя героі — «характаралогія» гэтага тыпу даволі шырокая ў савецкай літаратуры. У гэтых творах, апрача галоўных і другарадных персанажаў, ёсць яшчэ адзін вельмі важны герой — гэта сама зямля, якая адыгрывае значную ролю ў мастацкай канцэпцыі кожнага пісьменніка. Яна—аснова ўсяго. У гэтым пераконваешся з першых старонак паэмы, калі ўзнікае бойка паміж Васілём і Сёмкам у карчме. Яна—з-за зямлі...

У адной з аповесцей сучаснага малдаўскага пісьменніка Іона Друцэ ёсць такая думка: «Чалавека павінна пракарміць зямля, на якой ён жыве — гэта старадаўні саюз, заключаны нашымі продкамі з зямлёй, на якой яны аселі, і гэты саюз павінен быць для нас святым». Вось, думаецца, дзе вытокі маралі, блізкай і роднаснай Васілю. Аднак ён не паўтарае нікога са сваіх знакамітых літаратурных папярэднікаў — у яго сваё жыццё, свой лёс.

У старым селяніне сышліся — і ад гэтага нікуды не падзенешся —і працаўнік, і ўласнік. Такой супярэчнасцю, зразумела, адзначана і свядомасць Васіля. І ўсё ж такі ўласніцкі пачатак развіты ў ім — у адрозненне, скажам, ад кулака Сёмкі —куды меней, чым пачуццё працаўніка з яго любоўю да зямлі, з якой ён звязвае сваё жыццёвае прызванне. У складаны час давялося жыць гэтаму чалавеку. У самым пачатку паэмы гучыць «прэлюдыя жалезнай птушкі», што не перастае яго праследаваць праз усё жыццё, якое змясціла ў сабе некалькі войнаў, рэвалюцыю, пераломную эпоху калектывізацыі, Айчынную вайну і многае іншае. Гэта сапраўды эпічны, «паэмны» герой, у якім адлюстраваліся цэлыя пласты народнага вопыту. Рамкі яго біяграфіі ўключаюць вялікія абсягі перажытага. «Як ты выжыў, адкажы, народзе?» — так ставіць пытанне аўтар, і ўся паэма, як справядліва пісаў пра яе А. Лойка ў артыкуле «Выпраўленне ў людзі», з'яўляецца спробай адказаць на яго.

Постаць Васіля — героя паэмы — трагічная, бо шмат страт давялося зазнаць яму за жыццё. Нялёгкія дарогі вялі яго да праўды, да таго, каб паяднаць «праўду зерня з праўдай барацьбы». Думка паэта, скіраваная да сацыяльных пытанняў веку, глыбока раскрывае ўнутраны свет героя, яго маральную сутнасць, сувязі з грамадствам, прыродай, зямлёй. Аўтар ідзе па лініі павышэння ідэйных і маральных патрабаванняў да свайго героя. Але ён не канструюе яго, не «сачыняе». Такога героя «сачыніла» само жыццё з яго супярэчнасцямі. І ў тым важная заслуга паэта, што ён імкнецца ўлічыць усе ўмовы і акалічнасці жыцця свайго Васіля.

У. Калеснік у артыкуле «Эстафета лёсу» («Неман», 1982, № 1) адзначыў інтэлектуалізм паэзіі В. Зуёнка. Адна з прыкмет інтэлектуалізму гэтага паэта — маштабнасць светаўспрымання і абагульненняў, наяўнасць сацыяльна-філасофскіх антыномій, увасобленых у мастацкіх вобразах, як Васіль і Трыхан.

В. Зуёнак — паэт зямных працоўных спраў, якія ў яго ўспрыманні ўздымаюцца да вышыні духоўнага акту, калі ўся чалавечая істота гарманічна спалучаецца з аб'ектыўным светам. Напрыклад, у цудоўных апісаннях падзей календара земляроба: касьба, жніво, ворыва... Вось выйшлі касцы—цяпер ужо калектыўна—на сенажаць:

Размах, разгон! Ці тое, як бывала—
На вузенькай палосцы ў два заходы:
Касу ўгамоньвай, каб не спудлавала
І да суседа не залезла ў шкоду.
Як пашырэў ты сёння, луг без межаў!

Гэта былі прыкметы новай, сацыялістычнай явы... Мірную стваральную дзейнасць паэмы перапыніў германскі фашызм у 1941-м. Але ён не мог спыніць самога жыцця: Васілю даводзіцца змагацца і сеяць хлеб, ён звязаны з партызанамі... Шлях яго не лёгкі, і не просты, ды інакшым ён, напэўна, і не мог быць.

Тэарэтыкі і да гэтага часу не перастаюць сцвярджаць, што толькі лірыка — утваральны пачатак, здольны ідэйна і па-мастацку апладніць сучасную паэму. Не, аказваецца, гэта не так. Герой «Маўчання травы» выходзіць за межы свайго «я»: яго «прыватнае» ўзнімаецца да гістарычнага быцця, а духоўны пафас складае пачуццё патрыятызму, абавязку перад зямлёй і грамадствам.

«Маўчанне травы» расчынена ў мінулае і ў будучыню. У селяніне, у яго любові да зямлі, працавітасці, маралі паэт бачыць вялікую стваральную сілу. Менавіта да такой высновы прыводзіць паэма В. Зуёнка. Паэт пераканаўча гаворыць пра адзінства «зерня праўды» і «праўды зерня». «Я з полем звязан не кавалкам хлеба—тут і жыццё, і смерць, і бессмяротнасць», — вось перакананне галоўнага героя. Ён пражыў цяжкае, складанае, але сумленнае жыццё. Пражыў на зямлі, абараняючы яе, вырошчваючы на ёй хлеб, востра адчуваючы адказнасць за свае паводзіны. Гэтым паэма скіравана ў будучыню.

Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ.

ТЭЛЕВІЗІЙНЫ ТЭАТР УЛАДЗІМІРА ЗАБЕЛЫ

У гэта, можа, не адразу паверыцца... А між тым, тэлевізійны тэатр рэжысёра-пастаноўшчыка Беларускага тэлебачання Уладзіміра Забелы сцвердзіў сябе, існуе як самастойнае, перспектыўнае мастацтва. Нагадаем толькі найбольш значныя, створаныя за апошнія шэсць гадоў яго спектаклі «Сцежкі зведаныя і нязведаныя», «Крыло цішыні», «Дзеці настаўніцы», «Завеі, снежань», «Плач перапёлкі», «Разам з камісарам», «Лісце каштанаў» паводле твораў А. Кулакоўскага, Я. Сіпакова, І. Шамякіна, І. Мележа, І. Чыгрынава, П. Броўкі, У. Караткевіча. У гэтых спектаклях праяўляецца багацце творчай палітры рэжысёра, бачны шляхі стварэння рэалістычных тэлевізійных вобразаў, калі пры ўвасабленні першакрыніцы памастацку эфектыўнымі аказваюцца і «формы самога жыцця», і формы ўмоўныя, народжаныя тэлевізійнай спецыфікай.

У сваіх спектаклях рэжысёр У. Забела і мастак А. Шкаева, чыю арганічную рэалізацыю задум нельга не адзначыць, даказалі важную, першаступенную ролю сінтэзу мастацтва на тэлебачанні. Яны заўсёды імкнуліся зыходзіць з канкрэтнага факта, літаратурнай асновы — да такога абагульнення, калі праз мінулае, звязанае з днём сённяшнім, мы можам кінуць погляд у будучыню.

Творчай удачай У. Забелы стаў тэлеспектакль «Крыло цішыні» паводле прозы Я. Сіпакова.

Пасляваенная вёска на экране. Памост, на якім зусім натуральная сухая яблынька, падпёртая колікам; асірацелы вулей; мяшок бульбы, бульба ў кашах і проста рассыпаная на дошках; дзежачка і... дуга з мікрафонам. А вось—падлетак Ясь, бацькоў якога расстралялі фашысты, які ходзіць па хатах і разносіць пошту. Яго сустрэчы з аднавяскоўцамі (кожны—непаўторны характар, асоба) насычаны дакладнымі, ёмістымі дыялогамі. Артыст С. Журавель выдатна справіўся з роляй Яся, унёс у яе сапраўдны подых жыцця. Артыст У. Рагаўцоў (вядучы), перадаючы пластыку, паэтыку, філасафічнасць прозы Янкі Сіпакова, быццам далучаў гледача да самога працэсу творчасці і скіроўваў увагу на сэнсавыя акцэнты спектакля. Рэжысёр У. Забела ўдала падабраў і выканаўцаў на ролі Саўкі (Г. Аўсянікаў), Паліны Раманаўны (М. Захарэвіч), Шаўкавіхі (С. Станюта), дзеда Сянчылы (Г. Гарбук), Лёксы (Г. Макарава), Дзямідзькі (Ф. Варанецкі), Халадзёнка (А. Падабед), Дуні (Г. Бальчэўская) і іншых.

Экранізацыя прозы Я. Сіпакова захавала ў непарушнасці пачуцці і думкі аўтара, набыўшы якасць тэлевізійнага твора. Гэта прывабіла і крытыкаў, і гледачоў, і—членаў журы Усесаюзнага фестывалю тэлевізійных спектакляў, якія адзначылі «Крыло цішыні» Першым прызам.

Складаным для тэлевізійнай экранізацыі аказаўся раман Івана Мележа «Завеі, снежань». Па раманах «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» на Беларускім тэлебачанні раней быў створаны трохсерыйны спектакль з падздымкамі натуры кінакамерай. А вось У. Забела імкнуўся даказаць, што тэлевізійнае мастацтва, якое даўно імкнецца стаць самім сабою, незалежным ад кіно, павінна дамагацца рэалістычнасці, жыццёвасці падзей на экране сваімі, тэлевізійнымі сродкамі. Зноў быў знойдзены для спектакля сімвалічны вобраз часу. Месца падзей пазначыла, пастудыйнаму ўмоўная, вёска дваццатых-трыццатых гадоў. Гледачы ўбачылі прыбіральшчыцу Глінішчанскай школы Ганну, якую з уласцівым гераіні роздумам і смуткам увасобіла артыстка Г. Кухальская. Арганічнай атрымалася сцэна спрэчкі сакратара райкома партыі Башлыкова (А. Падабед) са старшынёю райвыканкома Апейкам (Г. Гарбук), хвалюючай і запамінальнай — гісторыя неспадзяванага кахання Ганны і Башлыкова.

У тэлеспектаклі «Завеі, снежань», на маю думку, быў знойдзены экранны эквівалент мележаўскага глыбокага філасофска-мастацкага асэнсавання жыцця роднага народа на важным гістарычным этапе, эквівалент арыгінальнай і глыбока гуманістычнай пісьменніцкай канцэпцыі рэчаіснасці.

На Усесаюзным фестывалі тэлевізійных фільмаў «Дрэва дружбы» ў Кішынёве, як вядома, работа рэжысёра У. Забелы зноў жа атрымала Першы прыз.

Пра асабістую творчую ініцыятыву і высокае майстэрства У. Забелы гаворыць тэлеспектакль «Разам з камісарам», сцэнарый якога напісаў паэт Рыгор Барадулін паводле празаічнай кнігі народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. Матэрыял гэты ў многім аўтабіяграфічны. Дык рэжысёр і падказаў запісаць пралог да тэлеспектакля, у якім пра незабыўныя дваццатыя гады расказвае сам аўтар. Атрымалася грунтоўна, пераканаўча. А для нашчадкаў захавалася жывое аблічча і голас народнага песняра — шчыра ўжо з'яўляецца нашым нацыянальным скарбам.

Знайшоўшы не такое ўжо і новае, але індывідуальнае і арыгінальнае ў дастасаванні да тэлеспектакля «Разам з камісарам» рашэнне, рэжысёр шчасліва пазбегнуў выпадковых акцёрскіх роляў, эмацыянальна напоўніў дыялогі персанажаў роздумам пра вялікія сацыялістычныя пераўтварэнні ў нашай краіне ў першыя паслярэвалюцыйныя гады. Экранныя вобразы камісара Будая (Ф. Варанецкі) і падлетка Федзі (Я. Лявонцьеў) раскрываюць сацыяльны змест і значэнне Кастрычніка ў лёсе як асобнага чалавека, так і ўсіх народаў Краіны Саветаў. Ва ўсім гэтым бачыцца сувязь творчасці рэжысёра з інтэрнацыянальным вопытам савецкага мастацтва.

Тое ж самае можна сказаць пра тэлеспектаклі рэжысёра У. Забелы «Плач перапёлкі» і «Лісце каштанаў», створаныя ім паводле твораў І. Чыгрынава і У. Караткевіча. Мне здаецца, што У. Забела працягвае пошукі тэатра на тэлевізійным экране, вывучаючы і творчыя дасягненні (як, дарэчы, і пралікі і выдаткі) нашых першых рэжысёраў тэлевізійнага тэатра — А. Гутковіча, В. Карпілава, У. Станкевіча, Ю. Сурыкава, У. Траццякова... І тут работы У. Забелы звяртаюць на сябе ўвагу мастацкай сталасцю, дапытлівай думкай, творчым падыходам да працэсу асэнсавання літаратурнай першакрыніцы тэлевізійным экранам.

Такія работы заслугоўваюць і грамадскага прызнання, якім з'яўляецца Дзяржаўная прэмія БССР. Такое маё меркаванне пра кандыдатуру пастаноўшчыка тэлеспектакляў «Разам з камісарам», «Завеі, снежань» і «Крыло цішыні».

Валянцін МЫСЛІВЕЦ.

ПАТРЭБЕН ЗАРАЗ І ЗАЎСЁДЫ

Для многіх пісьменнікаў, як яны самі ў гэтым прызнаюцца, адным з самых цікавых заняткаў, якому яны аддаюцца з сапраўдным захапленнем і ўнутранай засяроджанасцю, з'яўляецца чытанне слоўнікаў. Не толькі праца са слоўнікам, без якой проста немагчыма ніякая творчая дзейнасць у галіне мастацкага слова, а менавіта — чытанне, якое прыносіць асалоду душы. І гэта не дзіўна. Сапраўды пісьменнік гэтак глыбока ўваходзіць у жыццё мовы, гэтак чуйна адчувае яе няспешны, не ўсім бачны, але безумоўна існуючы дух да яшчэ вышэйшай дасканаласці ў выяўленні духоўнай сутнасці чалавека, што яго прафесійная зацікаўленасць з'явамі мовы часта пераходзіць у зацікаўленасць унутраную, становіцца пастаяннай душэўнай патрэбай у блізкай дружбе са словам. Гэта вышэйшы прафесіяналізм валодання выяўленчымі рэсурсамі роднай мовы. Тут, у свеце мовы, як і ва ўсякай галіне чалавечых зносін, адбываюцца свае цікавыя «падзеі», свае пераўтварэнні, а часам і «драмы», сачыць за якімі надзвычай цікава кожнаму аматару слова.

Нядаўна параўнальна ўжо даволі багаты рэестр беларускіх слоўнікаў папоўніўся новай лексікаграфічнай працай — «Украінска-беларускім слоўнікам» В. Лемцюговай, выдадзеным у 1980 годзе выдавецтвам «Вышэйшая школа» пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР М. Бірылы і доктара філалагічных навук прафесара А. Супруна. Як вынікае з прадмовы да слоўніка, ён мае ў асноўным практычнае прызначэнне, бо адносіцца да тыпу «перакладных слоўнікаў». Сапраўды, яго ролю ў перакладчыцкай літаратурнай практыцы цяжка пераацаніць. Гэта першы ў гісторыі ўкраінска - беларускі слоўнік і ў выніку яго з'яўлення, можна не сумнявацца, нашмат пашырацца абсягі перакладу мастацкіх твораў украінскіх аўтараў на беларускую мову, узрасце і якасць перакладу. Несумненна, ён стане

больш дакладным, багатым, прафесійным і даступным, што будзе садзейнічаць умацаванню дружбы паміж братнімі народамі і іх культурамі.

Літаратурная грамадскасць Украіны шчыра вітала выхад у свет «Украінска - беларускага слоўніка» В. Лемцюговай. Выступаючы на VIII з'ездзе пісьменнікаў УССР, вядомы паэт, крытык і перакладчык Паўлычка сказаў: «Абмен духоўнымі скарбамі паміж савецкімі нацыямі і народнасцямі, іхнюю непарыўную і жыватворную сувязь немагчыма ўявіць без ЛІТАРАТУРНЫХ БРАТЭРСКІХ КАНТАКТАЎ КОЖНАГА НАРОДА З КОЖНАЙ МОВАЙ ВЯЛІКАЙ НАШАЙ РАДЗІМЫ. Інакш кажучы, патрэбны двухмоўныя слоўнікі, якія дапамаглі б, нарэшце, прафесію перакладчыка той ці іншай нацыянальнай савецкай літаратуры на ўкраінскую мову і, наадварот, украінскай літаратуры на тую ці іншую мову СССР пазбавіць ад падрадковага рамесніцтва і самадзейных і шустрых адыходнікаў, надаць гэтай высакароднай спецыяльнасці глыбінны і навуковы характар. І тут мне хочацца выказаць падзяку В. Лемцюговай за яе ўкраінска - беларускі слоўнік (Мінск, 1980 г.), за вялікую працу, вартую ўзраймання ва ўсіх рэспубліках і найперш у нас» («Літературна Україна», 17 мая 1981 г.).

У выступленні Д. Паўлычкі вельмі добра сказана пра значэнне двухмоўных слоўнікаў у сферы літаратурных перакладаў і ва ўсім працэсе духоўнага ўзаемаўзбагачэння нацыянальных савецкіх культур, і ў сувязі з гэтым значэннем слоўнік В. Лемцюговай названы ў якасці ўзору, які варты пераймання ва ўсіх рэспубліках. Сапраўды, у стварэнні двухмоўных нацыянальных слоўнікаў В. Лемцюгова выступае ў многім як піянер, накрэсліваючы тыя шляхі навуковай працы, па якіх пойдуць услед за ёю іншыя вучоныя.

Хацелася б адзначыць, што «Украінска - беларускі слоўнік» В. Лемцюговай, нягледзячы на яго практычнае мэтавае прызначэнне, па сваім змесце перарастае прыкладныя межы яго выкарыстання і мае самастойную навукова-моўную і літаратурную каштоўнасць. Па багацці і разнастайнасці змешчанага ў ім слоўнага запасу ён таксама прыдатны для чытання, для грунтоўнага роздуму над сэнсам і формай слоў, якія ў прамым супастаўленні з украінскімі моўнымі формамі раскрываюць шмат дадатковых сваіх значэнняў і сэнсавых адценняў. Такім чынам, «Украінска - беларускі слоўнік» В. Лемцюговай непасрэдна ўзбагачае сэнсава - выяўленчы патэнцыял беларускай мовы.

Слоўнік В. П. Лемцюговай вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тэхнікі. На маю думку, ён заслугоўвае па ўсіх крытэрыях таго, каб быць адзначаным гэтай прэміяй.

Віктар КАВАЛЕНКА.

БАЛЮЧАЯ ПРАЎДА ВАЙНЫ

«Суд у Слабадзе» Віктара Казько належыць да тых не так ужо і шматлікіх кніг, якія заўсёды са мной. Аповесць ад першай і да апошняй старонкі прасякнута пякучым, незагойным чалавечым болем, якім назаўсёды застаецца для нас мінулая вайна. А з яго ж, з таго болю, пісьменнік выбраў самае-самае балючае, тое, дзе бесчалавечнасць і жорсткасць нявечаць найбольш каштоўнае, крохкае і далікатнае — дзіцячую душу.

Віктар Казько не першы асуджае здрадніцтва — амаль уся наша проза, створаная на матэрыяле ваеннай рэчаіснасці, так ці іначай закранала праблему падзення чалавека, у асобных выпадках, як, скажам, у аповесці «Сотнікаў» В. Быкава, узнімалася да філасофскага асэнсавання гэтай з'явы.

В. Казько здолеў раскрыць яе па-свойму, ён паглядзеў на здраднікаў вачамі людзей, якія шмат гадоў пражылі без вайны, але і сёння нясуць у сваіх сэрцах пякучы боль і нянавісць. Калі б перад намі былі толькі дакументальна занатаваныя сцэны суда, то яны б таксама краналі сэрцы чытачоў сваёй нявыдуманай праўдзівасцю, як кранае і яшчэ доўга, а, магчыма, чым далей, тым больш, будзе кранаць заснаваная на болі, нянавісці і пакутах кніга А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», еднасць з якой «Суда ў Слабадзе» досыць відавочная. Разам з гэтым, аповесць В. Казько — твор спецыфічна мастацкі, адметны і самабытны па гучанні, які, аднак, сведчыць аб плённым узбагачэнні нашай прозы дакументальным матэрыялам, жывой (тут яна, як і ў кнізе названых аўтараў, надзвычай балючая) праўдай жыцця. Менавіта гэтая асаблівасць паспрыяла і надзвычай узмацніла сілу ідэйна-выхаваўчага ўздзеяння твора на чытача, таму што, бадай, як ніхто да яго, В. Казько здолеў па-мастацку моцна і па-чалавечы кранальна вынесці прысуд здрадніцтву.

Але сцэны суда наўрад ці загучалі б з такой сілай, калі б твор адразу пачынаўся з іх. Суд над паліцэйскімі ідзе ў аповесці задоўга да таго, як іх прывозяць на машыне ў мястэчка і вывешаныя паўсюль рупары гучна абвяшчаюць: «Устаць! Суд ідзе!»

Судзяць здраднікаў не толькі афіцыйна прызначаныя дзеля гэтага суддзі. Суд гэты ідзе і ад імя шматпакутнага, асуджанага змалку на смерць Колькі Лецечкі, і ад імя дзеда Захар'і, чый род аж да самага апошняга калена быў вынішчаны ў вайну, і ад імя эпізадычнага для аповесці Нічыпара — у яго таксама свой незагойны боль, — і ад імя ўсяго навакольнага люду, які ў гэты гарачы для селяніна час кінуў усю работу і пайшоў у мястэчка, нібы веснавой паводкай, затапіў усе вуліцы і плошчу, а пры набліжэнні машыны з паліцэйскімі раптоўна сцішыўся і застыў у пагрозлівым маўчанні, чакаючы, калі можна будзе паглядзець у вочы, спапяліць сваёй нянавісцю тых, хто пайшоў на службу да чужынцаў, прадаўся ім душой і целам, на чыіх руках назаўсёды запяклася бязвінная чалавечая кроў.

Падводзячы дзеянне аповесці да гэтых ключавых для ідэйна-мастацкай задумы сцэн, празаік, разам з гэтым, здолеў па ходу дзеяння шмат сказаць нам пра пасляваеннае сірочае дзяцінства, глыбока і ўсебакова раскрыць характар цікавага самога па сабе і цікаўнага да ўсяго, што побач з ім, Колькі Лецечкі. Вобраз гэты трагічны па бязмежнасці пакут, што змалку выпалі на яго долю, і гераічны па сваёй унутранай глыбіннай сутнасці, па меры закладзенага ў яго кволае цела патэнцыялу мужнасці, які дапамагае хлопцу выстойваць у самай цяжкай і крызіснай для чалавека сітуацыі на мяжы паміж жыццём і смерцю. Лецечка няўхільна набліжаецца да свайго няўмольнага канца і сваёй трагічнай смерцю выносіць самы моцны прысуд вайне.

Аповесць В. Казько развіваецца нібы ў двух планах — вонкавы, найбольш відочны, звернуты да паказу чалавека ў канкрэтных дзеяннях, пачуццях, перажываннях, учынках, тады як унутраны асэнсоўвае пытанні агульначалавечага напаўнення, у дадзеным выпадку — вечную праблему віны і пакарання. Натуральнаму паяднанню двух планаў у значнай меры спрыяе абагульнена-сімвалічная манера пісьма, актыўна-творчае пераасэнсаванне пісьменнікам жыццёвага матэрыялу.

У творы Казько хораша ўжываюцца розныя мастацкія стыхіі, тут досыць выразна выяўляюцца асаблівасці сацыяльна-псіхалагічнай, інтэлектуальнай і фальклорна-казачнай прозы. Аповесць уяўляе сабой цэласную мастацкую з'яву, аднак пісьменнік увесь час мяняе рэгістры, пераключае дзеянне з аднаго плана на другі, што, бясспрэчна, засцерагае ад аднастайнасці, дазваляе трымаць чытача ў напружанні. Сюжэт твора — жывая рухомая плынь, дзе адна хваля няспынна накочваецца на другую, нясе ў сабе нешта істотна новае як па змесце, так і па форме яго ўвасаблення.

Дзеянне аповесці, яе маральна-этычны пафас і пошук увесь час скіроўваюцца да Лецечкі, які выступае і носьбітам, і своеасаблівым камертонам чалавечнасці. Мы ўжо заўважалі, што суд над здраднікамі ў першую чаргу ідзе ад імя Лецечкі, бо ён, як мастацкі характар, абмаляваны ў аповесці найпаўней і яго боль, яго перажыванні кранулі наша сэрца з найбольшай вастрынёй і адчувальнасцю.

У беларускай літаратуры, бадай, пасля паэмы Ф. Багушэвіча «Кепска будзе» яшчэ не было вобраза такой абагульнена-трагічнай моцы, на якога б з такой жорсткай няўмольнасцю з самых малых гадоў абрушваліся такія цяжкія выпрабаванні. Нават асобныя знешнія прыкметы сведчаць пра гэта: Кольку Лецечку, скажам, як і Аліндарку, даюць выпадковае імя. Тое, што з часоў Аліндаркі мінула шмат часу, істотна не змяніла бесчалавечнасці эксплуататарскага ладу, хіба што мадэрнізавала яго сродкі. У час асаблівай душэўнай відучасці з забыцця перад Лецечкам узнікае вобраз ката ў белым халаце, з тонкім павуціннем дужак акуляраў, які ў сваіх выпешчаных інтэлігентных руках трымае шпрыц з коса зрэзанай іголкай, спрабуючы ім выцягнуць з Лецечкавага цела апошнія жыццёвыя сокі.

Для «Суда ў Слабадзе» менш за ўсё ўласціва апісальнасць — вельмі часта, як і ў толькі што згаданым выпадку, пісьменнік дае ўражлівую запамінальную дэталь, якая ёмістка кандэнсуе ў сабе сэнс падзеі, з'явы, характару. Дэталі вельмі часта сведчаць не толькі пра назіральнасць і ўчэпістасць вока празаіка, але і пра яго здольнасць да актыўна-творчага пераасэнсавання жыцця. Вось, напрыклад, мы бачым, як па лясной сцяжыне коціцца клубочак-вожык, у абліччы якога пісьменніку ўбачыўся яго герой, а незадоўга чытаем пра лясного хлопчыка, што блукае цёмнай ноччу па лесе, сам не ведае, хто ён і каго яму трэба больш баяцца — звяроў ці людзей. Гэта таксама Колька Лецечка.

Не дзеля арыгінальнасці пераўвасабляе свайго героя аўтар, а каб даць нам магчымасць яшчэ вастрэй адчуць яго боль, адзіноту, страх перад нелюдзямі, якія прынеслі яму столькі пакут.

У аповесці надзвычай моцна выяўлена прага жыцця, пратэст супраць смерці. Думка гэтая сцвярджаецца ўсім ладам твора і непасрэдна залежыць ад здольнасці празаіка паказаць прыгажосць і шматаблічнасць рэчаіснасці, якая іскрыцца і пераліваецца разнастайнасцю колераў, гукаў, адценняў. Душа ж у Колькі Лецечкі шырока расчынена насцеж жыццю, адгукаецца не толькі на тое, чым жывуць людзі. Ён, як некалі коласаўскі Сымон-музыка, вядзе гаворку і з зямлёй, і з сонцам, і з вадой, і з рыбай, не толькі бачыць і чуе навакольны свет, але адчувае яго ўсёй сваёй істотай. Таму з асаблівай вастрынёй успрымаеш яго нежаданне пагадзіцца з наканаваным.

Характар Колькі Лецечкі раскрываецца ў творы цэласна і гарманічна. Ён нясе ў сабе не толькі пафас абвінавачвання забойцаў, але і ідэю мужнасці, нязломнасці чалавечага духу, які сцвярджае сябе насуперак фізічнай кволасці.

Гаварыць толькі праўду, заўсёды паводзіць сябе прынцыпова, ніколі не плакаць, бо ты мужчына — вось дэвіз Лецечкі, якім ён паслядоўна кіруецца ў сваім жыцці. Тое, што часам міжволі з яго вачэй цякуць слёзы, не толькі не супярэчыць заяўленым прынцыпам, але якраз і спрыяе данясенню ідэі, дапамагае з большай верай і эмацыянальным перажываннем успрымаць гэты характар. Свой боль, сваю трагедыю Лецечка не афішыруе, не імкнецца абудзіць да сябе спагады і спачування, наадварот, затойвае набалелае ў сабе, менш за ўсё хочучы прычыніць некаму клопат. Там жа, дзе абставіны патрабуюць гэтага, Лецечка можа быць ого яшчэ якім нязломным! У гэтым плане для разумення яго характару шмат даюць сцэны, дзе паказана, як у дзіцячы дом на працу прыходзіць новая выхавацельніца, якая вырашае навесці тут свой «парадак», пазбавіць выхаванцаў былых вольнасцей і прывілей.

Па-свойму паказана ў аповесці і пакутлівае — дакладней не каханне, а мара пра яго — Колькі Лецечкі да Лены Лазы. Пачуццё гэтае яркім промнем асвятляе сабой знутры ўсё, што робіць, гаворыць, пра што думае Лецечка. Сама сітуацыя нібы знарок спрыяе гэтаму: заліты сонцам, прапахлы яблыкамі сад і яны, Колька з Ленаю, сядзяць на дрэве. Нешта ад першароднай ідыліі ёсць у гэтым. Аднак зноў ушчэнт разбіваецца казка-прывід і аўтар — суровы, строгі рэаліст (так пісаў пра яго на старонках «Нового мира» Я. Брыль) паказвае нам трагічную супярэчнасць жыцця.

Не, не быць ім разам, і не народзіць, як Лецечка марыў, яму Лена дзяцей. Віною тут, па-першае, яго асуджанасць, а, па-другое, зусім яны розныя людзі, каб быць разам. Гэтае размежаванне паміж імі празаік, апрача ўсяго іншага, здолеў перадаць праз паказ таго, як хлопец і дзяўчына зусім па-рознаму разумеюць слова «рыхтуюся», які сэнс укладваюць у яго. «А мне ўжо» рыхтавацца трэба...» — са смуткам, але зусім незнарок, гаворыць Колька, маючы на ўвазе сваю блізкую смерць. Лена з радасцю адгукаецца на яго словы, кажа, што і яна рыхтуецца паступаць, просіць параіць, куды, на яго думку, лепш — «гэта ж самае галоўнае — абраць такі інстытут, каб жыць потым без турбот».

Здавалася б, мімаходзь зафіксаваная сцэнка жыцця, але ёміста праз гэтую трапна знойдзеную дэталь-слова выявілі сябе чалавечыя характары, глыбіня трагедыі аднаго і легкаважкасць патрабаванняў да жыцця другога адкрыліся нам усяго праз адно слова, якое высвеціла вобразы.

Смерць заўсёды была для чалавека найвялікшым выпрабаваннем. Тое, як чалавек завяршае свой шлях, як паводзіць сябе ў гэты самы трагічны момант жыцця, магчыма, больш, чым усё іншае, можа сказаць пра яго духоўнае багацце і душэўную моц, пацвердзіць ці адвергнуць усю ранейшую жыццёвую праграму.

Лецечка з годнасцю ідзе да свайго фіналу, з годнасцю здае і гэты свой апошні і самы цяжкі экзамен. Прыгадаем, колькі чалавечай дабрыні і любасці выпраменьвае гэтае яго рашэнне напярэдадні свайго збавення ад зямных пакут раздаць таварышам па ізалятары свой назапашаны за жыццё небагаты скарб, як ён тоіцца, баючыся, каб хлопцы не напалохаліся, здагадаўшыся, што навісла над ім. Выходзіць Лецечка на двор і памірае, павярнуўшыся тварам да сонца. Але няхай чытач яшчэ раз перажыве гэты момант развітання чалавека з жыццём.

«У Лецечкі яшчэ хапіла сілы непаслухмянымі рукамі адчыніць дзверы і выйсці на ганак і там, на ганку, убачыць, як плавіцца, гарыць і палае неба, рушыцца сонца, надломваецца пластамі і пякуча навальваецца на парныя ўжо ад спёкі просіні.

— Людзі! Людзі! — безгалоса залемантаваў ён, выкінуў перад сабой рукі, грабучы імі паветра. — Беражыце, людзі, сонца».

Так завяршыла свой трагічны кругабег чалавечае жыццё, а разам з гэтым і вычарпаў свае мажлівасці сюжэт твора, які пачаўся і закончыўся зваротам Колькі Лецечкі да жывых берагчы сонца, гэта значыць мір і спакой на зямлі, чалавечае жыццё ад заўчаснай смерці.

«Суд у Слабадзе» — па сённяшні дзень застаецца вяршынным у творчасці В. Казько. Твор, разам з гэтым, — этапная з'ява ў развіцці ўсёй нашай літаратуры для дзяцей і юнацтва. З поўным на тое правам ён заслугоўвае прысуджэння Дзяржаўнай прэміі БССР.

Яўген ЛЕЦКА.

УДАЧЫ ТАБЕ, «НЕСЦЕРКА»!

Знаёмства з творчасцю Рыгора Суруса — гэта сустрэча з разнастайнасцю і шматфарбнасцю жыцця. Чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі, патворчы апантаны, ён раскрывае ў музыцы старонкі гісторыі Радзімы, яе сённяшні дзень, апявае хараство.

Узрушана гаворыць пра веліч і мужнасць савецкага салдата вакальна-сімфанічная паэма Р. Суруса «Памяці герояў», дзе дакументальнасць літаратурнай асновы (тэксты надпісаў на Мамаевым кургане, Марсавым полі, на сценах Брэсцкай крэпасці) зліваецца з мастацкім увасабленнем тэмы ўсенароднага подзвігу. Карціны народнага жыцця, адметныя ў сваёй дынаміцы, ажываюць у яго вакальна-інструментальнай сюіце «Сватоў», фантазіі «Беларускія ўзоры», сюіце «Беларускія напевы»... А новая праца, якая захапіла кампазітара, — новы мастакоўскі зварот да падзей Вялікай Айчыннай: ён піша музыку для будучага спектакля Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР паводле п'есы А. Макаёнка «Трыбунал».

Звяртаючыся да слухача, Р. Сурус ніколі не забываецца, на якой зямлі ён жыве, хто — ягоныя слухачы. Яго музыка характарызуецца народнасцю, лексіка кампазітара нярэдка грунтуецца на традыцыях беларускай песенна-танцавальнай жанравасці. І сярод іншых твораў тут перш за ўсё вылучаецца народная музычная камедыя «Несцерка». (Чытач, безумоўна, ведзе, што гэты твор напісаны на лібрэта В. і А. Вольскіх паводле аднайменнай п'есы В. Вольскага і пастаўлены ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі БССР).

Драматургічна цэласнае лібрэта з разгорнутымі народнымі сцэнамі, малюнкамі побыту, каларытнымі вобразамі дзейных асоб; стыхія народнай гаворкі з трапнымі сакавітымі прымаўкамі, — усё гэта дазволіла Р. Сурусу стварыць народную музычную камедыю, дзе пануе дух весялосці, аптымізму. Музыка, розная, як і само жыццё, дапамагае нам перажыць разам з героямі іх трывогі і радасці, паверыць у перамогу дабра. Яна прасякнута духам народнага меласу: так, даводзіцца гаварыць не столькі пра цытатны спосаб выкарыстання беларускага фальклору, колькі менавіта пра аўтарскае яго засваенне, уменне перадаць сам дух, характар народнага мастацтва. У партытуры «Несцеркі» сустракаюцца мелодыі папулярных беларускіх песень «Сватоў», «Антон маладзенькі», «Бульба», «Саўкэ ды Грышка» і інш. Усе яны маюць арганічнае развіццё ў музычным тэксце, надаючы яму асаблівую прывабнасць, каларыт.

У творы Р. Суруса дакладна акрэсліваюцца дзве вобразныя сферы. У адной з іх — з адкрытай шчырасцю ўвасобленыя вобразы галоўных дзейных асоб. Гэта — сам Несцерка і яго сябры-скамарохі; Наста і Юрась; бацькі Насты; народ. Другая вобразная сфера зб'ядноўвае сілы, якія перашкаджаюць добрым людзям на іх шляху да шчасця. Тут і самадур пан Бараноўскі са сваімі паслугачамі, і самаўлюбёны дурань Самахвальскі. І калі для першай вобразнай сферы «Несцеркі» характэрная народная жанравасць і лірыка, дык для другой аўтар выбірае музычную пародыю, іронію, гратэск.

Адзінству ж усяго твора (можна гаварыць і пра спектакль цалкам) спрыяе сістэма лейтматыўных характарыстык, якую шырока выкарыстоўвае кампазітар. Адметныя тэмы Несцеркі, скамарохаў, тэмы кірмашу, лялечнага прадстаўлення; танцавальныя рэмінісцэнцыі. А музыка пралога выконвае не толькі вобразна-сэнсавую функцыю (гэта тэма любві да роднага краю), але і лейтматыўную (неаднаразова яна паяўляецца ў ходзе музычна-драматургічнага развіцця, таксама і заключае спектакль, дзе гучыць шырока, урачыста, накшталт своеасаблівага лірычнага гімну).

Многае ў творы Р. Суруса сведчыць пра цесную сувязь аўтара з традыцыямі народнага тэатра і народнага мастацтва ў цэлым. І вельмі важная асаблівасць «Несцеркі» — яго сучаснасць. Яна — у сучасным кампазітарскім мысленні з яркай экспрэсіяй музычнай мовы, часам складанымі рытмічнымі структурамі, цікавай аркестроўкай, новымі прыёмамі пісьма. Сучасная і сама пастаноўка спектакля, яе сацыяльная накіраванасць, арганічнае акцёрскае ўвасабленне вобразаў. Таму і глядач, разам са стваральнікамі спектакля, хвалюецца, весяліцца, журыцца, яшчэ і яшчэ раз адкрываючы ў мастацтве, у жыцці, дый у сабе самім сапраўднае хараство і дабрату. Як Хаджа Насрэдзін, як Ціль Уленшпігель, так і беларускі Несцерка стаў увасабленнем няўрымслівага, таленавітага духу народз. Ён — вечны. Ён, Несцерка, патрэбны людзям.

І гэты герой, і сам спектакль Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР мае заслужаны поспех не толькі ў шматлікіх гледачоў. На Усесаюзным аглядзе спектакляў для дзяцей і юнацтва ў драматычных і музычных тэатрах краіны «Несцерка» ў пастаноўцы беларускай трупы заваяваў дыплом II ступені, Добрыя водгукі спецыялістаў атрымаў твор Р. Суруса ў час III Усесаюзнага фестывалю творчай моладзі музычных тэатраў. Пастаноўка «Несцеркі» рыхтуецца ў тэатры горада Нікалаева... Словам, сцэнічны лёс народнай музычнай камедыі Р. Суруса складваецца шчасліва. І думаю, што заслужанай ацэнкай гэтай працы кампазітара можа стаць прысуджэнне яму Дзяржаўнай прэміі рэспублікі.

Іна ЗУБРЫЧ.

ДРАМАТУРГІЯ

Алесь ПЕТРАШКЕВІЧ

Русь Кіеўская

Трагедыю «Русь Кіеўская» прысвяціў 1500-годдзю Кіева. Падзеі, што паказваюцца ў ёй, супадаюць па часе з пачаткам вызвалення Русі ад стогадовага варажскага прыгнёту і з'яўлення новай небяспекі як ад хрысталерпай Візантыі, так і ад «чумазлаяў з дзікага поля».

Прэм'ера спектакля «Русь Кіеўская» ў Крымскім акадэмічным тэатры імя М.Горкага адбылася ў дні святкавання 1500-годдзя Кіева. Паставіў спектакль лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР А. Новікаў, музыку да яго напісаў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР С. Картэс.

Прапаную чытачам штотыднёвіка ўрывак з п'есы.

АУТАР.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Карціна першая

Княжацкі церам. На высокім ложку памірае княгіня Вольга. Над пергаментам схіліўся Летапісец. Застылі ў чаканні ваяводы Свеналд і Блюд. Каля агню чаруе Вяшчун. Уся прастора вакол церама запоўнена народам. Усе ў трывожным чаканні.

ВОЛЬГА (слабым голасам). Чытай, Летапісец!..

ЛЕТАПІСЕЦ (зачытвае). У год 968 прыйшлі печанегі на рускую зямлю, а Святаслаў быў тады ў Перыяслаўцы, і зачынілася Вольга са сваімі ўнукамі ў Кіеве. І асадзілі печанегі горад сілай вялікаю: было іх незлічонае мноства вакол, і нельга было ні выйсці з горада, ні весткі падаць і знемагліся людзі без вады і ад голаду...

ВОЛЬГА (падымаецца, Вешчуну). Ну, Лепш ужо памерці, каб таго не дачакацца... (Пасля паўзы). Чытай, Летапісец, што яшчэ ты ўпісаў у пергамены...

ЛЕТАПІСЕЦ. Пра тое прачытаюць нашчадкі, Вялікая княгіня.

ВОЛЬГА (катэгарычна). Сама ведаць хачу!..

ЛЕТАПІСЕЦ (зачытвае). У лета 969 памерла Вольга, і плакалі па ёй плачам вялікім сын яе, і ўнукі, і ўсе людзі, і панеслі, і пахавалі яе на адкрытым месцы. Вольга ж наказала не рабіць па ёй трызны, бо мела пры сабе папа — той і пахаваў блажэнную Вольгу.

ВОЛЬГА. Хораша. Вельмі хораша. Толькі дапішы яшчэ: была яна прадвесніцай хрысціянскай зямлі, як дзянніца перад сонцам, як зара-золак перад светам. І свяцілася сярод паганцаў-язычнікаў, як жэмчуг у гразі...

ВЯШЧУН. Добра было б яшчэ і такую праўду-ісціну запісаць: да таго, як абмыцца святым хрышчэннем, Вольга занадта ж паважала багоў старажытных. І на трызне па князю Ігару, якога забілі драўляне за лютую жорсткасць яго, прынесла багам у ахвяру два пасольствы ды пяць тысяч лепшых вояў князя драўлянскага Мала.

ВОЛЬГА (з нянавісцю). Праўдзівыя словы твае, Вяшчун. Ахвяра на трызне была вартай вялікага князя Ігара.

ВЯШЧУН. То была не ахвяра багам, а жудасная помста непакорным драўлянам на ўстрашэнне ўсёй славені. І сатварыла ты яе разам з ваяводам Свеналдам. Сёння б нам тых пяць тысяч вояў, не дрыжалі б цяпер перад печанегамі.

СВЕНАЛД (агаляе меч). Дазволь, княгіня, я знясу галаву гэтай пачвары валахатай...

ВЯШЧУН. Ну, знясеш ты мне галаву, а князю Святаславу што скажаш, як той вернецца?..

БЛЮД. Не знясе. Не пасмее! (Агаляе меч).

ВОЛЬГА. Вось як ты вернасць сваю блюдзеш, ваявода Блюд?!.

БЛЮД. Ты аддана сваім багам, я сваім... старым...

СВЕНАЛД. Ён не Блюд. Ён проста блудадзей. Разам з Гарой Кіеўскай, з баярамі-паганцамі нясцерпна чакае тваёй смерці. А тыя пусцяць кроў хрыставерным.

БЛЮД (саркастычна). А ты не чакаеш?! Ты за здароўе і многая лета княгіні молішся?!.

ЛЕТАПІСЕЦ. Пабойцеся багоў, ваяводы... Як ніяк, а чалавек жа адыходзіць...

ВОЛЬГА (з мальбою). Дайце памерці спакойна, а потым ужо ўчэпіцеся адзін аднаму ў горла... Прыпішы яшчэ, Летапісец... У лета 955 адправілася я ў грэчаскую зямлю к Царграду. І прыйшла к цару Канстанціну. І ўбачыў цар, што прыгожа я, вельмі і разумна. Падзівіўся цар майму розуму...

Усміхаюцца ваяводы, піша Летапісец. І ніхто не бачыць, што ў церам увайшоў Дабрыня з некалькімі воінамі пры зброі.

А пасля паклікаў мяне цар і сказаў: хачу ўзяць цябе ў жонкі сабе. Я ж адказала: як жа ты хочаш узяць мяне, калі сам хрысціў мяне і назваў дачкою? А ў хрысціян гэта не дазваляецца — ты сам ведаеш. І сказаў тады цар: перахітрыла ты мяне, Вольга...

ДАБРЫНЯ (дзёрзка, са здзекам). І застаўся венцаносны жаніх з носам, а княгіні-маладусе ў тую пару было гадоў пад шэсцьдзесят...

Уздрыгнулі ваяводы Свеналд і Блюд, схапіліся за мячы, але адразу ж замерлі, як толькі ўбачылі за спіной Дабрыні лучнікаў, што нацягнулі цеціву.

Спакойна, ваяводы! (Падыходзіць да Летапісца, глядзіць праз плячо на пергамент). Сляды спраў сваіх на рускай зямлі замятаеш, княгіня Вольга? (Летапісцу). А ты, раб няшчасны, керпаеш пад дыктоўку...

ЛЕТАПІСЕЦ. Убярэшся ў сілу, і па тваёй волі керпаць буду.

ДАБРЫНЯ. Смела і дзёрзка. А як жа з ісцінай?..

ЛЕТАПІСЕЦ. Нашчадкі знойдуць. Сярод ілжывасці ісціна ізумрудам блішчыць. Знойдуць...

ДАБРЫНЯ. А ты не з палахлівых.

ЛЕТАПІСЕЦ. З нявольных я...

ВОЛЬГА. Хто з дзёрзкасцю і нахабствам бязмежным увайшоў сюды?!.

ЛЕТАПІСЕЦ. Пасаднік наўгародскі Дабрыня.

ДАБРЫНЯ. Не толькі пасаднік наўгародскі, але і князь драўлянскі. Ці ў пергаменах тваіх не пазначана, што не хто іншы, а бацька мой князь драўлянскі Мал пакараў у свой час князя-ваўка Ігара?!.

ВОЛЬГА. Прыляцеў воран на пагібель маю?! (Пасля паўзы). Ваяводы мае палахліўцы і прадажнікі — клікні дружыннікаў, Летапісец. Не ўсё ж табе пра чужыя подзвігі пісаць. Зрабі свой, я ж перад смерцю сваёй жыўцом закапаю Малкова адроддзе.

ДАБРЫНЯ. Займайся сваёй справай, Летапісец! Дружыннікі княгіні разам з маімі воямі супраць печанежскай раці стаяць, а слугі і стража разам з княжычамі на Дняпры ладдзі Святаслававы выглядаюць. Так што няма каму мяне караць, княгіня-матухна. (Вешчуну). Малі і заклінай багоў, Вяшчун, на хутчэйшае вяртанне князя Святаслава. У ім зараз ратунак і наш з табой і ўсёй дзяржавы Рускай.

Сцэна зацямняецца і асвятляецца зноў. Вольга на сваім ложку, Летапісец за пюпітрам. Цьмяна гараць свечкі.

ВОЛЬГА. Што ж ты не пішаш, Летапісец?..

ЛЕТАПІСЕЦ. Лягчэй смерць прыняць, чым ганьбіць князя Святаслава...

ВОЛЬГА. І прымеш... не пры мне, дык пасля мяне...

ЛЕТАПІСЕЦ (не слухаючы Вольгу, узнёсла). Неба — дах князя Святаслава. Сядло — яго трон! Ён есць тое, што ядуць яго воі! Ён разам з імі прымае ўдары і раны і разам з імі лечыць іх! Ён не ваюе хітрасцю, але папярэджвае ворага: «Іду на вы!..» Ідзе і перамагае. Не рабі ён гэтага, грэкі сядзелі б зараз у Кіеве, як сядзяць у Корсуні, а дзікія орды чумазлаяў са стэпу, як саранча, пакрылі б не толькі Русь, але і землі вакольных славеняў.

ВОЛЬГА. Асмялеў... Як асмялеў...

Даносіцца шум натоўпу, да якога прыслухоўваецца і Вольга і Летапісец.

ЛЕТАПІСЕЦ. З вяртаннем князя Святаслава не адзін я асмялеў...

Шум нарастае і раптоўна абрываецца. У церам уваходзіць Святаслаў. Яго суправаджаюць юныя сыны Яраполк і Алег, ваяводы Свеналд і Блюд, пасадн[illegible] Дабрыня і Вяшчун. Доўгая паўза. Ц[illegible]шыня.

ВОЛЬГА (слабым голасам). Падыдзі, сын, пацалуй мяне.

Святаслаў падыходзіць да маці стрымана цалуе яе.

У лоб цалуеш, а я жывая яшчэ... Узрадаваўся... Нарэшце волюшку поўную атрымаеш. Ніхто не перашкодзіць загубіць дзяржаву Рурыкавічаў.

СВЯТАСЛАЎ. Ці ж не я берагу дзяржаву і гадамі ваюю, не шкадуючы галавы сваёй?!.

ВОЛЬГА. У чужых землях ваюеш, а сваю пакінуў.

СВЯТАСЛАЎ. У чужых ваюю — свая цалей. Ці не такі ўжо наш рускі лёс?..

ВОЛЬГА. Кіеў — прыстань гасударава! І пасаромеўся б апраўдвацца ў смертны час маці. (З іроніяй). У чужых ваюць — свая цалей... За Дняпром-ракой чумазлаяў раць цьма тысячная. Не толькі над маткаю і сынамі, над дзяржавай меч занесены.

СВЯТАСЛАЎ (спакойна). Ведаю. Вярнуўся. Паб'ю.

ВОЛЬГА. І пра тое ведаеш, што ратункам сваім я абавязана цяпер былому рабу свайму Дабрыні?!.

СВЯТАСЛАЎ (цвёрда). Не раб, а князь драўлянскі Дабрыня выратаваў цябе і сыноў маіх. Пакланілася б яму за клопаты аб Кіеве і рускай зямлі.

ВОЛЬГА. Паклапаціўся, каб пры выпадку да сваіх рук прыбраць, пакуль неразумны князь чужыя землі крокамі мерае.

СВЯТАСЛАЎ (стрымана). Не крокамі, а перастрэлам стралы добрага воіна вымяраю я і адлегласць і час ад бітвы да бітвы. Тым і апраўдваю жыццё сваё паміж двума берагамі-межамі.

ВОЛЬГА. У Кіеве, у рускіх землях твой бераг, а ты кінуў іх на разарванне сабакам печанежскім.

СВЯТАСЛАЎ. Ці пра сабак гаварыць таму, хто біў ваўкоў?! (Паўза). Ці не мне абавязана Русь тым, што можа на сваіх палетках жыта сеяць, на сваіх лугах жывёлу пасвіць, у сваіх лясах бортнічаць ды паляваць? І ці не я даў навуку хазарам?! Ці не я граміў ясаў і касогаў?! Ці не я заклаў Тмутаракань-крэпасць рускую на Рускім моры?! Ці не мае дружыны вучылі стэпнякоў не хадзіць у нашы землі?! Ці не мае воіны ўціхамірылі буртасаў на Каме-рацэ і разграмілі Іціль — сталіцу хазарскую?! Ці не я разгадаў хітрасць царградскіх імператараў, што хацелі подкупам штурхнуць Русь на братоў нашых балгар, а печанегаў натравіць на Русь?!. А перамогі мае — не сорам, а гонар і доблесць Русі. Я ваюю толькі тады, калі не магу не ваяваць.

ВОЛЬГА (перадражнівае). Я... я... я... Мяне, нібыта, і няма ўжо. А я жывая! Састарэлая, знямоглая, але жывая! А калі паміраць перадумаю, гарою, скалою на тваім шляху стану! Баяр Гары Кіеўскай перадушу! Русь хрышчу! К цэсару візантыйскаму за дапамогай звярнуся!

СВЯТАСЛАЎ (з сарказмам). Чаму ж не звярнуцца. Да караля германскага ты ўжо звярталася за маёй спіной. І тое, што на зямлі нашай няма епіскапства германскага, мая заслуга!

ВОЛЬГА. Ад гардыні ў цябе нялюбасць да мяне... (Задыхаецца). Перад смерцю ведаць хачу, як землямі пасля мяне ўпраўляць будзеш? З чаго пачнеш?..

СВЯТАСЛАЎ. З таго пачну, што разрабаванай і абражанай табой зямлі драўлянскай князя дам і тым самым з князямі-славянамі дружбу знайду.

ВОЛЬГА. Ці не Малкава адроддзе ў князі меціш?

СВЯТАСЛАЎ. Астудзі ярасць, матухна. Дабрыня друг мне верны і брат жонкі маёй Малушы, якую ты немаведама куды дзела ці зусім са свету звяла.

што не вядзьмарыш, Вяшчун?.. Заклінай! Пакажы сваю сілу...

ВЯШЧУН (чаруе над агнём). Ойча ты, наш агонь-бацюхна, усім ты агням агонь, які жаркі ты і палкі, як ты паліш у чыстым полі травы-муравы, гушчары-нетры, у сырога дуба падземнае карэнне. Будзь жа ты лагодны і міласэрны. Так жа я малюся і клянуся табе, вешчы агонь, Сварогаў сын, Дажбогаў унук — выпалі і спалі з Вольгі...

ВОЛЬГА (хрыпла, настойліва, з пагрозай)... Княгіні Вольгі! Вялікай княгіні Вольгі...

ВЯШЧУН (чаруе над агнём). Перад маімі багамі ўсе роўныя...

ВОЛЬГА (апусціўшыся на падушку, ціха). Перад тваімі роўныя і перад маімі роўныя....

ВЯШЧУН (зноў заклінае)... спалі-выпалі з Вольгі скрухі-хваробы, страхі-перапалохі...

ВОЛЬГА (безнадзейна). Усё адно памру...

ВЯШЧУН. Памрэш.

ВОЛЬГА. Багоў многа, а смерць у кожнага адна... свая...

ВЯШЧУН. Ты свайго бога не ўміласцівіла. Мае ж ад цябе даўно адступіліся. (Да народа.) А праз цябе і ад горада і ад зямлі нашай.

Гул і гоман у народзе. Грозны знак Свеналда, і ўсе заціхаюць.

ВОЛЬГА. Невядома, якім багам маліцца. (Паўза). Возьмуць стэпнякі Кіеў, усім смерць і дзяржаве Рурыкавічаў канец.

СВЕНАЛД. Таму я і тут, княгіня...

ВОЛЬГА. І ты тут, і Блюд тут. Смерці маей чакаеце?! А вам трэба было б з дружынамі па Лыбедзі-рацэ супраць печанегаў стаяць...

БЛЮД. Не толькі па Лыбедзі, але і па Дняпры Дабрыня сваю дружыну паставіў.

ВОЛЬГА. Дажыліся! Княгіню Вольгу Дабрыня, конюх яе, ад смерці ратуе!..

ВОЛЬГА. Баба яна блудлівая, а не жонка княжаская.

СВЯТАСЛАЎ. Пасаромелася б унукаў...

ВОЛЬГА. Свеналд некалі ўціхамірыў князя Мала і нас з табой ад смерці ўратаваў. Яму сёння аддаю зямлю драўлянскую! Блюда загадваю павесіць за здраду! Ён узначаліў Гару баяр веры паганскай! Дабрыню — у конюхі!

СВЯТАСЛАЎ. Навошта перад смерцю ўсобіцу і смуту сееш? Я сам ведаю, чаго варты і Свеналд, і Блюд, і Дабрыня. Ты адыходзіш, цяпер яны мая апора і надзея.

ВОЛЬГА (пасля паўзы). Прымі веру хрышчоную, Святаслаў, і Русь ахрысці! Яна твая апора!..

СВЯТАСЛАЎ. Што візантыйскі бог, што наш чорт — няма розніцы! Не прыму веру ад царградскіх душагубаў! Бізуном-плёткаю ад грэкаў у сваёй зямлі не стану! Глуму над вераю народа не дапушчу. Любы мне і мова, і нораў, і звычай іх. І багі іхнія мне не перашкаджаюць.

ВОЛЬГА. Канец усяму, калі нашчадку Рурыка люба стала погань славянская.

СВЯТАСЛАЎ. Багоў памяняла, сваю варажскую зямлю забыла, а злобы к славянам так і не перасіліла. (Яраполку і Алегу). Пойдзеце па слядах бабкі, а яна нямала наследзіла, народ у крывавыя ўсобіцы ўцягнеце і самі бясслаўна загінеце. А мне поўнач зямлі з поўднем яднаць трэба, інакш не ўстаяць. І ад дзікага поля і ад находнікаў з паўночных краін бараніцца давядзецца. Пабіўшы печанегаў, я на Дунай пайду, а Кіеву і Ноўгараду князі-ўправіцелі патрэбны. (Да сыноў). Хто ў Ноўгарадзе сядзе?.. Адказвай, Яраполк, першы, ты старэйшы.

ЯРАПОЛК (памаўчаўшы). Бабка Вольга даўно рашыла мяне ў Кіеве пасадзіць...

СВЯТАСЛАЎ. А ты што скажаш, сын Алег?..

АЛЕГ. А я чым горшы за Яраполка?..

СВЯТАСЛАЎ. Так... (Доўга маўчыць у глыбокім смутку).

ДАБРЫНЯ (Святаславу). Калі не пойдуць да нас, самі дабудзем сабе князя.

СВЯТАСЛАЎ. На жаль, друг мой Дабрыня, у мяне толькі два сыны, ды і тыя, як бачыш, бабчыны ўнукі.

ДАБРЫНЯ (нечакана). Я прывёз з Ноўгарада твайго трэцяга сына. Сястра мая Малуша назвала яго Уладзімірам. Уладзімірам Святаславічам. Дазволь паклікаць?..

Гэта навіна як гром для прысутных. Вольга спрабуе падняцца з ложка. Летапісец дапамагае ёй сесці.

ВОЛЬГА (перапалохана, злобна). Брэшаш, паганы раб! Да таго як радзіць, у зняволенні яшчэ, у сяле Бадуціне памёрла Малуша!..

ДАБРЫНЯ. Убачыць бацька сына, сам пераканаецца, хто з нас брэша.

Выходзіць і вяртаецца з юным Уладзімірам. Княжыч надзвычай падобны на Святаслава[1]. Усе нямеюць ад здзіўлення. Узрушаны Святаслаў разглядае сына, абдымае яго, зноў разглядае. Падае на падушкі Вольга. Варожа глядзяць на Уладзіміра Яраполк і Алег.

СВЯТАСЛАЎ (Уладзіміру). Дзе Малуша?! Маці дзе?!.

Хрыпла смяецца Вольга.

УЛАДЗІМІР. Дзядзька Дабрыня быў мне і бацькам і маці замяніў...

СВЯТАСЛАЎ (спахмурнеў, памаўчаў, ціха). Ці сядзеш князем у Ноўгарадзе?..

УЛАДЗІМІР. Калі пасадзіш, сяду... Хоць у Ноўгарадзе не вельмі ўседзіш...

СВЯТАСЛАЎ. Растлумач думку тваю, Уладзімір.

УЛАДЗІМІР. І находнікі на нашу галаву, і набежнікі, і разбойнікі як ад варагаў, так і ад рамеяў. І ад усіх адбівацца трэба. Інакш перакрыюць шлях у грэкі. А ў Ноўгарадзе кожны ведае, у чыіх руках рэкі ды волакі, у тых і ўлада над землямі вакольнымі.

СВЯТАСЛАЎ (у захапленні ад слоў Уладзіміра). Дай жа я абдыму цябе, Уладзімір! (Абдымае). Дай жа я і цябе расцалую, Дабрыня! (Цалуе).

Хрыпіць і захлынаецца Вольга. Летапісец закрывае ёй твар чоркай павалокай, гасіць свечкі. І ніхто з прысутных ужо не заўважае гэтага. Усю ўвагу бяруць на сябе Святаслаў і яго сыны.

(Як загад). Пад тваю руку, Яраполк, аддаю зямлю палянскую, а ў жонкі — грэкіню знатную! Табе ж, Алег, правіць зямлёй драўлянскай і жаніцца на прыгажуні чэхіне. Не ведаў, што сын у мяне трэці, а то прывёз бы яму царэўну-балгарыню. (Агледзеўшы сыноў). З царэўнамі чужаземнымі ў мяне, другі мае, задума дальняя... Не ўсё ж ваяваць суседзяў. Радніць трэба землі.

ДАБРЫНЯ. Не ведаю, як з чужадальнімі, а з полацкай зямлёй найперш радніцца трэба.

СВЕНАЛД. Мудра мысліць князь Дабрыня, але яшчэ мудрэй было б зямлі полацкай свайго князя даць ці ваяводу дастойнага.

БЛЮД (з падвохам). Каб ён там старых багоў звяліў, новую веру ўвёў і цэркваў наставіў...

ДАБРЫНЯ (Свеналду). Ці не свайго сына Люта ў Полацк ваяводам меціш, паколькі няма ў князя Святаслава сына чацвёртага?..

СВЕНАЛД. Не любіш ты мяне, князь Дабрыня.

ДАБРЫНЯ. Гэта вельмі мякка сказана.

СВЯТАСЛАЎ. Зямля полацкая ў сваім укладзе. І князі ў яе свае, крыўскія, з якімі ў міры і дружбе жыць трэба. (Глядзіць на Уладзіміра). А там, глядзіш, і параднімся. Прыгажуні-разумніцы не толькі за морам водзяцца. (Як загад). Ваяводай пры Уладзіміры быць Дабрыні. Пры Яраполку — Блюду! Пры Алегу — Свеналду! Толькі да гэтага мы з Свеналдам на печанегаў сходзім і да грэкаў... у госці. Даўно люблю яго за храбрасць ратную. Дабрыні і Блюду як сабе веру. Аднак клятву саюза і дружбы нашай з усіх трох вазьму і сваю дам.

Дабрыня, Блюд і Свеналд следам за Святаславам кладуць мячы каля сваіх ног і, падняўшы правую руку ўверх, паўтараюць за князем словы клятвы.

«А хто з нас задумае разбурыць гэты саюз, то няхай той, каторы хрышчоны, атрымае кару ад свайго бога, а той, каторы не хрышчоны, ды не мае дапамогі ад Перуна, ды не абароніцца ўласным шчытом, ды загіне ад мяча свайго, ад стрэл і ад іншай сваёй зброі, і ды будзе рабом-нявольнікам ва ўсё сваё жыццё на тым свеце».

Усе падымаюць свае мячы і перакрыжоўваюць.

(Сынам). Мне ваяваць-мірыцца, вам землі збіраць і гуртаваць народы-плямёны. І не жыць пустой спадзеўкай на добры лёс, а дзейнічаць! Перад народам не велічавіцца! З духамі продкаў савет-раду трымаць — яны хавальнікі глыбінь народнай памяці і з разумнымі субяседнікамі шчодрымі бываюць. Дружыны набірайце з сыноў загінуўшых воінаў — больш верных, чым яны, не знайсці. Звычаі і законы вайны не парушайце. Усё міне, а гонар век жыць будзе. (Вешчуну). Тваё слова, вялікі Вяшчун, ты паміж багамі і князямі.

ВЯШЧУН (да княжычаў, як блаславенне). Уступаючы ў княжанне, ведайце і памятайце: да канца дзён багі будуць выпрабоўваць вас на моцнасць духу. Працуйце бесперапынна, і нябесныя сілы будуць з вамі. Не чыніце ўціску людзям малым — яны аснова. Пра нівы і палеткі турбуйцеся паўсядзённа і ў вяках. Пладаноснай нівай магутны чалавек. Помніце: дзяржаву паважаюць толькі моцную і багатую. Беражыце вернасць звычаю народа, якім правіце. Залатым зіхаценнем не асляпляйцеся. Беззаконне выкрывайце. Хвалебных глаголаў бойцеся. Не пустарадуйцеся, не зласліўце. Не губіце ў людзях гордасці. Не разбурайце прыстанак духу. Не адной сілай, але і розумам мяняйце цячэнне злых падзей. У вякі-вякоў не гасіце свечку розуму.

Сцэна зацямняецца. У суправаджэнні світы і народа Святаслаў выходзіць.

[1] У наступных карцінах ролю Уладзіміра павінен выконваць акцёр, што да гэтага выконваў ролю Святаслава.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

Даіру СЛАЎКОВІЧУ—50

21 верасня споўнілася 50 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Даіра Слаўковіча. З гэтай нагоды праўленне СП БССР звярнулася да яго з прывітальным словам, у якім гаворыцца:

«Дарагі Даір Фёдаравіч!

Шчыра віншуем з нагоды Вашага 50-годдзя!

Вы адносіцеся да таго пакалення, якое ў дзяцінстве перажыло жахі вайны. Вайна не абмінула сваёй лютасцю і Вас — Вы атрымалі кантузію і раненне. Вы самааддана змагаліся, каб стаць у строй жыцця. Пасля заканчэння сярэдняй школы працавалі бібліятэкарам, потым загадчыкам Уздзенскай раённай дзіцячай бібліятэкі, а таксама настаўнікам у школе.

У 1960 годзе Вы завочна скончылі факультэт бібліяграфіі і бібліятэказнаўства Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага.

У літаратуры Вы дэбютавалі ў 1946 г. вершамі. Але потым пачалі асвойваць жанр прозы, пісаць для дзяцей. Вашаму пяру належаць зборнік апавяданняў «Каласавічок», аповесці «Сцежкаю мужных», «Хвядоскавы кані-кулы», «Я вярнуся, мама», кнігі аповесцей і апавяданняў «Па чым фунт ліха», «Я ў рабочыя пайду». Ёсць у Вас і зборнік гумару і сатыры — «Фірменны сродак».

У сваіх творах Вы расказваеце пра цікавыя справы і вучобу юных грамадзян нашай краіны, вучыце іх мужнасці, самааддданасці, барацьбе за светлыя ідэалы нашага жыцця.

Жадаем Вам, дарагі Даір Фёдаравіч, добрага здароўя, новых творчых здзяйсненняў, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

●

У вершалінах дрэў густых
Нядужае свіргоча ранне,
І фортка стрэлам халастым
Раптоўна грымне у тумане—
Сабака ўскінецца брахаць,
І крык гаспадара чуваць...
Час надыходзіць палявання.

Сабаку сцішыць плёх вады...
Сусед вітаецца са мною,
І выбіраемся туды,
Дзе прыстань, лёгкаю ступою.

Шчэ пацяжэлыя з начы —
Царква, бальніца, дворык школы,
І дубальтоўкі на плячы,
Як сцёгны знішчанай жывёлы.

●

Увесну грады капаць,
Улетку грады палоць,
Увосень насенне збіраць
У мой агародчык прыходзь.

Будзем заможна жыць,
Разам чакаць зімы,
Будзем сыноў жаніць,
Калі будуць яны.

У хаце зыркая печ,
У хаце жаданы спакой,
І вёдры да самых плеч
Напоўнены чыстай вадой.

●

Тут, у палескай глыбі,
Ночы, хоць вока згубі,
Лодкі свае не знойдзеш —
Без лодкі куды ты пойдзеш...

Як дотык да поўсці воўчай,
Ля ганка вада плюскоча.
Суседняя хата плыве...

А ў хаце суседка жыве.

●

Гэта цень мой вярнуўся дамоў,
Выпіў кварту халоднай вады,
Узышоў на вяршыні дубоў,
Абтрасаючы жалуды.

Часам гэтым стары сталяр
У павеці вычэсваў прамень,
На сабаку, што побач стаяў,
Трэскі падалі і мой цень.

Часам гэтым карміліся з рук
Качкі свойскія і журавы,
І ля будкі ляжаў ланцуг
Парыжэлы і нежывы.

●

Горад чужы не сустрэне па-хатняму,
Брудны вакзал, ні душы.
Вуліца доўгая, неахайная —
Горад чужы.

Дворніка ўбачу, спытаю дарогу...
Сябар тут мой і яго сям'я...
Дворнік прамовіць: «Ну, дзякаваць богу,
Ці ж не пазнаў... гэта я».

Ноччу прачнуся і ў сябра спытаю:
— Добра табе тут ці не?
— Добра...— адкажа-паспачувае,
Пакурыць і зноў засне.

●

Вось нарэшце і ранак узнік,
І хаду запаволіў цягнік,
На гару ён пачаў узбірацца:
Краявід! — Нельга не захапляцца.

Яны ўбачаць асмужаны лес
І адчуюць халоднае поле,
Дзесьці стог запануе, а дзесь
Куст адзін на паляне, не болей...

Безуважна адзначыць купэ:
Ён стары, а яна маладая.
Павуцінне на кожным слупе
І на дрэве да долу звісае.

— Гэта восень, — прамовіць яна,
— Гэта восень, — адкажа тактоўна
І адхіліцца ад акна,
Захінуўшыся мяккаю коўдрай.

І забудзецца і запяе
У дрымоце тужлівую песню...
Яму чаю суседка налье,
Але шкло ад гарачага трэсне.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

„СЛУХАЙЦЕ Ў НЯДЗЕЛЮ...“

Мы, тагачасныя школьнікі, не чулі-не ведалі слоў «філафаніст», «электрафон», «дыскатэка». Не ўяўлялі, што значыць стэрэафанічнае гучанне. Мы яшчэ пабачылі бабулін патэфон, які змяніла радыёла ці просты прайгравальнік. Потым у наш побыт увайшлі першыя магнітафоны—гонар падлетка! І якія шчаслівыя мы былі, калі ўдавалася, падзяжурыўшы некалькі гадзін ля прыёмніка, падпільнаваць і запісаць на стужку куміра эстрады ці новы вакальна-інструментальны ансамбль (яны таксама толькі ўваходзілі ў жыццё)!

Гэта было не надта і даўно. Цяперашнія ж школьнікі прызвычаіліся да мадэрнізаванай радыётэхнікі. І ўзровень інфармаванасці маладых слухачоў павышэў. Куміры, густы мяняюцца ўсё больш імкліва. І, вядома, праблемы не толькі эстэтычныя суправаджаюць масавы музычны бум. Усталявалася паняцце прэстыжнасці, культ дэфіцыту, існуе і «чорны рынак» з яго цынічнымі законамі.

«Наш друк, радыё і тэлебачанне нямала гавораць пра музыку. Аднак часцей за ўсё мы атрымліваем інфармацыю пра кар'еру спевака або групы, што малаважна і адразу ж забываецца. Слухачу бракуе інфармацыі пра стылі, плыні ў музыцы...». «Мы, маладыя людзі, даведваемся пра навінкі музыкі не з радыётрансляцый, а з-пад пахі фарцоўшчыкаў»... З такімі радкамі заярталіся на Беларускае радыё слухачы.

Бадай, тымі самымі праблемамі, што паўстаюць перад цяперашнімі неўтаймоўнымі, патрабавальнымі, інфармаванымі маладымі меламанамі, «перахварэла» і наша гакаленне. Таму праграму Беларускага радыё «Моладзі пра музычнае мастацтва» ўспрымаеш нераўнадушна, быццам сваю перадачу, якая запазнілася гадоў на колькі... З'явілася ж яна ў эфіры тры гады назад, сёлета прагучаў пяцідзесяты выпуск. Час, акурат, для падвядзення пэўных вынікаў.

АД ВЫПАДКОВАГА — ДА СТАБІЛЬНАГА

Рэдактары Беларускага радыё, маладыя музыказнаўцы І. Мільто і Л. Мітаковіч прыйшлі тры гады назад у інтэрнат Мінскага трактарнага завода, каб пагутарыць з дзяўчатамі, хлопцамі пра музыку ў іх жыцці, пра тое, якой хацелася б ім мець будучую музычную праграму. Прыйшлі з рэпарцёрам — запісаць «ўстаноўчую» гутарку для першага выпуску. А гутаркі не атрымалася. Не было ніякага прапагандысцкага, арганізатарскага вопыту. Але само жаданне знайсці кантакт з шырокай аўдыторыяй аказалася, урэшце, вялікай сілай.

Пачыналі рабіць сваю праграму «вобмацкам». Колькі атрымлівалася тут прыкрага «пальцам у неба»! Хаця самі па сабе перадачы былі змястоўныя, глыбокія — ды не знаходзілі свайго адрасата. Сур'ёзная праца — музычныя навелы, кампазіцыі пра Баха, Шапэна, Каруза. Перажыты матэрыял, перагорнута літаратура, знойдзена славеснае хараство для дыктарскага тэксту і пранікнёны музычны фон, чытаць запрошаны адзін з лепшых акцёраў купалаўскага тэатра... А ў выніку, як кажуць, глуха. Ці яшчэ горш — вось такі слухацкі водгук: «Мне не падабаецца, калі вы ў сваёй перадачы побач з эстраднай музыкай ставіце розныя сімфоніі і яшчэ чорт ведае што». «Не намагайцеся тлумачыць нам, паказваць прыгажосць опер, сімфоній. Яна нам не патрэбна». «Як успрымаю класічную музыку? Вельмі адмоўна!.. Гэта музыка для старэйшых пакаленняў, яе пачынаеш разумець толькі з узростам... Пярэчыце назве, уключаючы яе ў праграму... Трэба выключыць класічную музыку!»

Пасля першых пісем можна было апусціць рукі і не шукаць болей агульную мову са слухачом, проста і непераборліва выконваць заяўкі: якая б адразу стала папулярнасць! Можна было і паўпарціцца, стаць у позу гэткага «музычнага глушца» і даводзіць сваё. Але ж хацелася шчырых і глыбокіх адносін з аўдыторыяй.

Як ні дзіўна, энтузіясты новай праграмы напачатку быццам не бачылі відавочнага: моладзь востра рэагуе на самую форму падачы фактаў і думак. Вось і трэба шукаць неардынарную, парадаксальную, нават дзёрзкую форму перадачы? І адмаўляцца ад ментарства, ад навязвання сваіх густаў. Калі ж з'явілася больш давяральная, жывая інтанацыя гаворкі, наладзіўся баланс паміж рэкламай і ацэнкай, інфармацыяй і аналізам, ігравым і рэпартажным пачаткамі, — пайшлі адпаведныя пісьмы. Добразычлівыя, менш ананімных, больш адкрытых і шчырых; пісьмы-роздумы, максімалісцкія, супярэчлівыя, «гладкія» і не вельмі пісьменныя; дасланыя 23-гадовымі людзьмі і школьнікамі розных узростаў.

Аказалася, што сярод маладых карэспандэнтаў ёсць аднадумцы саміх рэдактараў: «У музычным побыце сучаснага чалавека класіка і эстрада павінны займаць (няхай з невялікімі адхіленнямі) раўнапраўнае месца. Класіка — таму што яна вечная, эстрада—як даніна нашаму неўтаймоўнаму веку». «Напэўна, нават пячорныя людзі разумелі, што ёсць розная музыка: наўрад ці пад аднолькавую вяліся рытуальныя абрады і проста скакалі ля вогнішча». «Больш параўнанняў, бо большасць моладзі не ведае ні сапраўднага «рока», ні класікі».

Цяпер І. Мільто і Л. Мітаковіч выкарыстоўваюць амаль кожную нагоду, выпадак, каб пагаварыць пра тое, што адбываецца ў сённяшнім шматстайным музычным жыцці, чым жывуць кампазітары, выканаўцы, у першую чаргу маладыя, чым поўніцца масавы музычны побыт, асяроддзе, якое фарміруе прыхільнасці і густы большасці маладых слухачоў; ненадакучліва звяртаюцца і да набыткаў музычнай культуры мінулага. Такой нагодай бывае свежая рэдакцыйная пошта, факт канцэртнага жыцця, анонс філарманічнай прэм'еры, навінка грамзапісу, творчы форум, каляндарная дата. Не ўсяеднасць, а рознабаковая арыентацыя ў музычным жыцці, яснасць пазіцыі ў ацэнцы тых або іншых з'яў, адыход ад ілюстрацыйнасці да аналітычнасці,—гэтым вызначаюцца, вядома, не ўсе, але многія выпускі праграмы.

Сваю форму знайшлі на радыё, каб адзначыць 60-годдзе камсамола: у перадачу быў уключаны расказ пра творчасць беларускіх кампазітараў Г. Вагнера, І. Лучанка, Л. Захлеўнага, прадстаўнікоў розных пакаленняў. Усесаюзны пленум камісіі ваенна-патрыятычнай музыкі Саюза кампазітараў СССР даў магчымасць запрасіць да мікрафона госця Мінска — Я. Фрэнкеля і пагаварыць не проста пра яго ўласную творчасць, а больш шырока — пра сучасную масавую песню. Да 90-годдзя М. Багдановіча прагучала жывая старонка перадачы — «У вянок паэту»— з удзелам беларускіх кампазітараў.

Дарэчы, беларуская старонка абавязковая ў кожным выпуску «Моладзі пра музычнае мастацтва». Слухачам, напэўна, помніцца расказ пра інструментальную групу ансамбля «Харошкі», рэпартаж пра новы калектыў Беларускага радыё — ансамбль пад кіраўніцтвам А. Шпянёва, незвычайнае навагодняе выступленне аднаго з пастаянных вядучых праграмы, артыста А. Уладамірскага, які выканаў сваю лірычную песню.

Цікавей, чым традыцыйныя інтэрв'ю з гастралёрамі, атрымаліся сустрэчы з Ж. Бічэўскай, з кіраўніком вядомага ансамбля народнай музыкі Д. Пакроўскім: яны наблізіліся да разважанняў пра найбольш агульныя праблемы захавання фальклору.

Спроба не проста інфармаваць і захапляцца, але і грунтоўна гаварыць пра станоўчыя, прагрэсіўныя з'явы на эстрадзе, пра «камерцыйныя» плыні ў замежным мастацтве, пра новыя тэндэнцыі ў савецкай рок-музыцы, шукаць прычыны поспеху ў моладзі тых ці іншых выканаўцаў,— такая спроба павялічыла «ўдзельную вагу» перадач пра «Пінк Флойд», «Боні М», «Машыну часу».

Але найбольшы плён далі старонкі пад рубрыкай — «Класіка і поп-музыка: ворагі ці саюзнікі?» Бадай, самы ўдалы матэрыял пад гэту рубрыку рэдакцыя атрымала з Масквы: стужка, падрыхтаваная вядомым крытыкам і музыказнаўцам Л. Переверзевым. На яркіх музычных прыкладах, пераканальна і, разам з тым, палемічна ён паказаў сувязь класічных твораў і рок-музыкі, іх агульную крыніцу (рытмаў, тэмбраў, гармоній) — фальклор. Ён зноўку давёў вядомую ісціну: нішто не бярэцца з нічога, па сутнасці, фальклор розных народаў — гэта агульнае дрэва, праз якое жывіцца кожная галінка: ці то старадаўняя музыка, ці то сучасная творчасць выдатных кампазітараў, ці то рок-музыка ў шматлікіх яе генерацыях. Вечны кругазварот новых і старых рытмаў, інтанацый можа зразумець кожны, хто не будзе бяздумна адкасоўвацца ад тых ці іншых «музык», а ўважліва і зацікаўлена прыслухаецца да лепшых твораў усіх часоў, розных жанраў і не будзе проціпастаўляць адно аднаму лепшыя набыткі шматстайнай музычнай культуры.

Старонкі пад рубрыкай «Класіка і поп-музыка...» выклікалі шматлікія водгукі, пісьмы-развагі. Моладзь больш лаяльна і зацікаўлена стала выказвацца пра тую галіну мастацтва, якую раней катэгарычна адмаўляла.

ПЕРСПЕКТЫВЫ І ПЕРАШКОДЫ

Слухача заваявалі. Гэта многа — і мала. Пакуль што выпускі атрымліваюцца няроўныя. Хваробы росту, выдаткі пошуку, сумненні павінны існаваць, арыентаваць на іншую, лепшую перспектыву. Але ёсць у падрыхтоўцы праграмы «Моладзі пра музычнае мастацтва» і перашкоды не творчага характару.

Яе рэдактары, зразумела, маюць асноўную працоўную нагрузку: рыхтуюць іншыя перадачы ў эфір, складаюць праграмы радыёканцэртаў. Не заўсёды ўдаецца вырвацца са штодзённага цэйтноту. І тады, на жаль, праграма «Моладзі пра музычнае мастацтва», якая цяпер мае сталы час выхаду ў эфір (нядзеля, 17 г. 15 мін), раз-пораз механічна паўтараецца, або асобныя яе старонкі рыхтуюцца на ўжо . «адпрацаваным» матэрыяле. Бяда ў тым, што для гэтай праграмы многае даводзіцца рабіць самім, у вольны час: вельмі абмежаваны іх аўтарскі актыў — тое, чым моцная, як вядома, любая рэдакцыя. Здавалася б, у чым жа справа? Пашырайце! Вунь колькі прыхільнікаў маладзёжнай музыкі і пастаянных зычлівых слухачоў у перадачы! Аказваецца, усё не так проста.

Не сакрэт, што на недахоп музычных крытыкаў, якія пішуць папулярна, «чытэльна», зацікаўлена, скардзяцца нашы перыядычныя выданні. Аналагічная сітуацыі і на радыё. Да таго ж, музыказнаўцы з дыпломам выказваюць звычайна пагарду, нейкі снабізм у дачыненні да «нізкіх» відаў мастацтва. Як гаворыцца, ва ўпор не бачаць таго, што ёсць: не хочуць і думаць, што поп-музыка, як усялякая з'ява масавай культуры, вымагае першачарговай увагі.

Бо нават тая частка маладой публікі, сярод якой распаўсюджваюцца новыя дыскі, стужкі з рэдкімі запісамі, інфармацыя пра лідэраў сусветнай эстрады, у музычнай культуры наогул недасведчаная і ахарактарызаваць прыватную з'яву, свайго куміра больш-менш аб'ектыўна не здолее.

Такім чынам, памочнікаў у падрыхтоўцы праграмы «Моладзі пра музычнае мастацтва» знайсці няпроста. Пакуль што сталыя аўтары тут, для якіх музыка — не мода, а частка культурнага жыцця, якія цікавяцца навінкамі грамзапісу, сочаць за прэсай, вывучаюць спецыяльную літаратуру, —Ю. Рашэтнікаў і М. Мархасін, інжынеры па адукацыі.

Мабыць, патэнцыяльныя саюзнікі праграмы ёсць сярод тых кампазітараў, якія самі цікавяцца рознымі музычнымі стылямі, ці сярод кіраўнікоў эстрадных калектываў? Варта іх пашукаць, бо вопыт ужо ёсць: заслужаны артыст БССР А. Шпянёў некалі ўдзельнічаў у гэтай перадачы як каментатар. У нечым, відаць, дапамаглі б і работнікі Дома грампласцінак.

Калі ж гаварыць пра ўласна рэдактарскую працу над сцэнарыямі, можна пажадаць І. Мільто і Л. Мітаковіч больш ашчадна карыстацца рубрыкамі «У нас у гасцях», «Госці Мінска», «Сустрэчы ў радыёстудыі», «Творчасць маладых», «Будні лаўрэатаў». У такой мітусні назваў лёгка заблытацца, і бывае, што ні тэматычна, ні спосабам арганізацыі матэрыялу, ні хранаметражом гэтыя рубрыкі не розняцца.

Хочацца, каб стражэй ставіліся яны і да дыктарскага тэксту, нягледзячы на тое, што ў эфіры часам зручна схавацца за музыку і дапусціць недакладнае слова, эпітэт, ацэнку завышаную ці катэгарычную.

І зноў спашлюся на пісьмо: «Не бойцеся ставіць праблемы

ПЕРШЫ З БЕЛАРУСІ

Рэпертуар Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Саюза ССР папоўніцца ў гэтым сезоне некалькімі харэаграфічнымі спектаклямі, працаваць над якімі запрошаны пастаноўшчыкі з розных гарадоў краіны. Адметная роля ў гэтай рабоце, прымеркаванай да 60-годдзя СССР, адведзена майстрам мастацтваў нашай рэспублікі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Г. Маёраў, чыя пастаноўка балета К. Хачатурана «Чыпаліна» на сцэне Вялікага тэатра СССР добра вядомая, цяпер запрошаны паставіць у Маскве новы твор народнага артыста БССР Я. Глебава «Маленькі прынц». Афармляць спектакль будзе заслужаны мастак РСФСР В. Левенталь. У складзе выканаўцаў — вядомыя салісты сталічнага балета Л. Семяняка, Н. Сямізорава, У. Дзеравянка, М. Цывін, Н. Ананіяшвілі, А. Фадзеічаў і інш. Упершыню на маскоўскай сцэне сіламі знакамітага калектыву будзе ўвасоблены твор беларускага кампазітара. Прэм'ера «Маленькага прынца» адбудзецца ў сакавіку 1983 года на сцэне Крамлёўскага Палаца з'ездаў.

СУСТРАКАЮЧЫ ЮБІЛЕЙ

У многіх сельскіх кнігарнях Гомельскай вобласці ўвагу наведвальнікаў прыцягваюць святочна аформленыя стэнды, прысвечаныя слаўнаму юбілею — 60-годдзю ўтварэння СССР.

Заўсёды рады наведвальнікам у кніжным магазіне г. п. Капаткевічы Петрыкаўскага раёна, якім загадвае Лідзія Дубіна. Работнікі магазіна імкнуцца поўнасцю задаволіць запатрабаванні пакупнікоў, прымаюць папярэднія заказы на патрэбную літаратуру, рэгулярна наладжваюць выстаўкі палітычнай і сельскагаспадарчай літаратуры. Шмат добрых слоў можна пачуць ад наведвальнікаў аб рабоце кніжных магазінаў г. п. Стрэшын Жлобінскага раёна (загадчыца Марыя Козырава), в. Крупец Добрушскага раёна (загадчыца Марыя Чарняева).

— Працоўная вахта работнікаў кніжнага гандлю прыводзіць да добрых вынікаў, — гаворыць начальнік каапкнігагандлю Гомельскага аблспажыўсаюза Міхаіл Цішчанка.—План рэалізацыі літаратуры за 8 месяцаў выкананы датэрмінова.

Г. КАПЦЕЛАЎ.

ПРАПАНУЮЦЬ ШЭФЫ

Дагаворы аб пастаянных культурных сувязях заключылі паміж сабой калектывы мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» і калгасаў «Бальшавік», «Савецкая Беларусь» Камянецкага, імя Леніна Пружанскага раёнаў. На аснове дагавораў супрацоўнікі мемарыяла арганізуюць для хлебаробаў экскурсіі, вечары, перасоўныя выстаўкі краязнаўчай, ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

і не адказваць на іх. Вашы адказы «на ўсё» выклікаюць падазрэнне ў няшчырасці, нявырашаныя праблемы, якія вы не спалохаецеся пакінуць адкрытымі, паставяць маладога чалавека на адну дошку з вамі — мы будзем жыць побач...»

Сапраўды! Калі ж яшчэ спрачацца, раіцца, шукаць ісціну, як не ў маладым узросце? Аднак чытка асобных лістоў, палеміка па пошце — зусім не тое, што жывыя галасы (як слухаліся гутаркі «за круглым сталом» пра творчасць маладых беларускіх кампазітараў, пра адносіны моладзі да традыцыйнага фальклору!). Не раз гучалі ў эфіры палемічныя інтэрв'ю ці каментарыі да выступленняў гасцей Мінска, да творчасці зарубежных артыстаў. Але чамусьці не запомнілася, каб у палемічным тоне вялася размова пра нашых, беларускіх выканаўцаў. Проста гаварыць, дапусцім, пра «Сяброў», «Чараўніц», «Сузор'е» — адно. А калі паспрачацца пра іх перад мікрафонам? У перапынку паміж аддзяленнямі канцэрта пагутарыць са слухачамі ці запрасіць іх у студыю разам з удзельнікамі ансамбля...

Рэдакцыя спрабуе навесці пастаянныя кантакты з радыё іншых рэспублік: слухачы часта просяць расказаць пра новыя савецкія ансамблі, пласцінкі якіх пакуль не выпушчаны, запісы ж распаўсюджваюцца сярод аматараў і, мабыць, робяцца на мясцовых радыёстудыях. Можа, ёсць рэзон звярнуцца і ў рэдакцыі радыё абласных гарадоў Беларусі? Там хіба не рыхтуюць музычныя перадачы на мясцовым матэрыяле, з удзелам цікавых маладых выканаўцаў — аматараў народнай ці турысцкай песні, удзельнікаў маладзёжных інструментальных ансамбляў? Ёсць жа, відаць, адметнае музычнае жыццё і ў Гомельскай абласной філармоніі, і ў Палацы культуры «Хімвалакна» ў Магілёве, і ў Брэсцкім музычным вучылішчы, і ў студэнтаў Горацкай сельгасакадэміі, дзе паспяхова працуе філіял лекторыя Беларускай дзяржаўнай філармоніі і з прыемнасцю выступае Акадэмічны сімфанічны аркестр БССР...

Ёсць ужо ў маладых рэдактараў плённы арганізатарскі і творчы вопыт, з якім прыходзіць да іх аўтарытэт, прызнанне, давер. Вось — ліст з Брэста: «Вельмі добра, што на Беларускім радыё існуе такая перадача». А гэта словы мінскай школьніцы: «Ваша перадача вучыць людзей слухаць музыку...» «Перадача, — піша група моладзі з Кобрына, — закранае вельмі актуальныя пытанні сучаснай музыкі і дапамагае ў многім разабрацца, ва ўсякім выпадку, задумацца». Прывяду яшчэ радкі, напісаныя юнаком з Белаазёрска: «Я скончу школу, атрымаю атэстат і невядома, дзе я апынуся. Але дзе б я ні быў, а ў 17 гадзін 15 мінут, у нядзелю, я настрою свой прыёмнік на Вашу хвалю».

Прыемна, што такія лісты ідуць на Беларускае радыё ўсё часцей.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

У калгасе імя Леніна на Пружаншчыне з дапамогай работнікаў мемарыяла ствараецца музей, экспазіцыя якога раскажа пра гісторыю гаспадаркі, яе ветэранаў.

Дагаворы паміж прамысловымі прадпрыемствамі, навучальнымі ўстановамі, творчымі арганізацыямі, установамі культуры і мастацтва і калгасамі, саўгасамі атрымалі на Брэстчыне шырокае распаўсюджанне. Цяпер каля 450 такіх дагавораў садзейнічаюць выкананню рашэнняў майскага Пленума ЦК КПСС, даносяць усё багацце культурных каштоўнасцей да шырокіх слаёў сельскага насельніцтва.

М. ГОРСКІ.

ПРАБЛЕМЫ. МЕРКАВАННІ. РОЗДУМ

Чарговы рэжысёр... А што далей?

Творчы калектыў узначальвае, як правіла, не толькі прафесіянал, здольны паставіць значны твор, але, перш за ўсё, ідэолаг тэатра, які глыбока, з партыйных пазіцый асэнсоўвае жыццё і мастацкія з'явы, умее згуртаваць калектыў і павесці яго за сабой. Гэта вядома. Вядома і тое, што жыццё тэатральнага калектыву, у якім адказныя, буйнамаштабныя спектаклі здатны ажыццявіць адно толькі галоўны рэжысёр, не можа быць плённым, творча паўнацэнным і перспектыўным. Аснова паспяховага творчага развіцця — прыход у тэатр рэжысёраў, кожны з якіх мае ўстойлівы погляд на свет, і, галоўнае, — самастойныя мастацкія ідэі. Разнастайнасць густаў і індывідуальных здольнасцей кожнага пастаноўшчыка пашырае рэпертуарны дыяпазон тэатра, узбагачае яго творчую палітру.

Пакуль што гэтыя думкі, у асноўным, са сферы ідэальнага: так мае быць. А як жа складваюцца рэальныя справы?

Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут... Нашы вядучыя тэатральныя рэжысёры выбіраюць тут па ўступных экзаменах будучых сваіх студэнтаў, вучаць і выпускаюць цэлыя курсы. Але, як ні дзіўна, нікога са сваіх выпускнікоў на работу да сябе ў тэатр не запрашаюць.

Звярніце ўвагу на лічбы: за 1963—81 гг. нашым інстытутам падрыхтавана 55 рэжысёраў. З іх у тэатрах Беларусі працуе цяпер толькі 12. Парадокс? Канечне. У рэспубліцы 11 тэатраў (не ўлічваючы лялечныя), дзе паводле штатнага раскладу ў кожным, апроч галоўнага, павінны быць яшчэ 2 рэжысёры (а ў купалаўцаў — тры). Здавалася б, мы можам забяспечыць нашы тэатры ўласнымі прафесійнымі рэжысёрскімі кадрамі без асаблівых выдаткаў, але... Дэфіцыт рэжысуры адчувальны, і вакансіі нярэдка запаўняюцца «пералётнымі» спецыялістамі, якія ўжо спрабавалі наладзіць свой творчы лёс у тэатрах Расіі, Украіны і г. д.

Аднак, у складанай праблеме бягучасці рэжысёрскіх кадраў нас цікавіць такі «суб'ектыўны» аспект. Ці не страх перад канкурэнцыяй прыводзіць да таго, што некаторыя галоўныя рэжысёры свядома трымаюць у штаце бесперспектыўных калег, не выказваючы належнай увагі сваім найбольш здольным выхаванцам? І ўрэшце ўсё складваецца так, што па сутнасці галоўны рэжысёр становіцца адзінай прыкметнай асобай у тэатры. Хаця, сапраўдны талент не баіцца спаборніцтва і ўмее рабіць самакрытычныя вывады пры параўнанні свайго вопыту з вопытам таварышаў па рабоце. Ды ці павінен аўтарытэт аднаго мастака забіваць аўтарытэт другога, калі яны робяць адну агульную справу?

Параўнальна нядаўна ў тэатры рэспублікі прыйшлі маладыя чарговыя рэжысёры — выпускнікі інстытута: А. Дольнікаў (Брэсцкі абласны драмтэатр імя ЛКСМБ), А. Цітоў (Гродна), М. Трухан (Гомель), В. Тарнаўскайтэ (рэспубліканскі ТЮГ), Д. Дзіджыокас (Рускі тэатр БССР імя М. Горкага), В. Баркоўскі (Бабруйск, тэатр драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча). Не адзін год ставілі спектаклі чарговыя рэжысёры ў мінскіх тэатрах А. Андросік, М. Кавальчык, у Брэсце — Т. Белічэнка, у Гомелі — В. Бартосік. А між тым, адметныя рэжысёрскія работы апошніх гадоў, якія выклікалі цікавасць тэатралаў, а то і палеміку, — рэдкія. Гэта «Клеменс» К. Сая, пастаўлены В. Маслюком у Віцебску, спектакль купалаўцаў «Тая, якая сама па сабе блукае» (паводле Р. Кіплінга), пастаўлены А. Шалыгіным, і дзве работы М. Пінігіна ў Рускім тэатры БССР імя М. Горкага: «Аповесць пра бяздомных сабак» паводле К. Сергіенкі і «Аб'ява ў вячэрняй газеце» (п'еса А. Паповай).

Назавём яшчэ два імя: А. Дольнікаў і А. Цітоў. Два гады як скончылі яны БДТМІ. Першая ж адметная работа А. Дольнікава — яго дыпломны спектакль паводле казкі К. Гоцы «Кароль-алень», пастаўлены на сцэне Рускага тэатра БССР імя М. Горкага. Малады рэжысёр цяпер працуе ў Брэсцкім абласным драматычным тэатры імя ЛКСМБ. Пастаўленыя тут А. Дольнікавым «Дзве стралы» А. Валодзіна, «Чалавек-невідзімка» Г. Уэлса, «Парог» А. Дударава выявілі акрэсленасць ідэйна-творчай пазіцыі маладога рэжысёра, яго прафесійны рост.

А. Цітоў няспешна, я нават сказаў бы, сціпла працуе ў Гродне — мабыць, з прычыны таго, што ён пакуль не знайшоў для сябе сур'ёзнай тэмы, якая абудзіла б «болевыя пункты» яго рэжысёрскай натуры. Разам з тым, у яго работах («Дзікі Анёл» А. Каламійца і два спектаклі-казкі) адчуваецца імкненне да глыбокага спасціжэння псіхалогіі характараў.

Рэжысёрская біяграфія М. Трухана пачалася яшчэ калі ён быў акцёрам Рэспубліканскага ТЮГа. Пэўны час ён займаўся ў майстэрні А. Эфраса і цяпер працуе рэжысёрам у Гомельскім абласным драматычным тэатры. Пастаўлены ім спектакль «Ладдзя роспачы» паводле У. Караткевіча («ЛіМ» пісаў пра гэту работу М. Трухана) паказаў, што расце своеасаблівы рэжысёр, які ўмее цікава і вобразна мысліць, валодае яркай формай і імкнецца да філасофскага прачытання матэрыялу.

Справа не ў тым, ці належаць названыя маладыя рэжысёры да пачынальнікаў новых тэатральных плыней, ці не: справа ў тым, што на пачатку іх самастойнага творчага шляху кожны з гэтых чарговых рэжысёраў варты ўважлівых адносін, — і не толькі з боку крытыкі, рэцэнзентаў. Ды, як правіла, у самім тэатры цікавасць да сваёй творчай асобы і лёсу малады чарговы рэжысёр сустракае не часта. І ці не праз гэта вакол вядучых рэжысёраў утвараецца трывожная пустата: няма пераемнікаў, няма надзейнай змены, няма рэгулярнага паўнацэннага прытоку маладых творчых сіл, якія ў сцэнічнай практыцы маглі б многаму навучыцца ад майстра і яму самому даць новыя імпульсы да творчасці!

Мабыць, гэтая «пустата» становіцца прычынаю з'явы, характэрнай апошнім часам для Рускага тэатра БССР імя М. Горкага. Афіша яго інтэнсіўна ўзбагачаецца спектаклямі, пастаўленымі акцёрамі гэтага калектыву. Прынамсі, У. Шэлестаў не так даўно дэбютаваў як рэжысёр, паставіўшы спектакль «Жалезнае вяселле» (п'еса А. Наважылава), а неўзабаве падрыхтаваў сцэнічную кампазіцыю да стагоддзя Янкі Купалы. На выпуску ў гэтым тэатры спектакль па творах В. Шукшына ў пастаноўцы акцёра В. Бусыгіна. На гэтыя радасныя з'явы ў нашым тэатральным жыцці ўжо звярнуў увагу часопіс «Театр» (№ 4, 1982 г.). Аднак, міжволі задумваешся аб прычынах такога масавага акцёрскага захаплення рэжысурай. І прыходзіш да думкі, што адна з іх — творчая незадаволенасць артыстычнай трупы наяўнай рэжысурай.

Вядома, што кожная новая пастаноўка для акцёра павінна быць школай прафесійнага майстэрства, інакш акцёр закасцяняе, пачынае абрастаць штампамі, хварэе на творчае раўнадушша. Якраз на працягу некалькіх гадоў чарговая рэжысура Рускага тэатра БССР не ставіла спектакляў, значных для творчага аблічча калектыву. І спрабуюць акцёры самі сабе дапамагчы...

Цяпер і многія чарговыя рэжысёры, паглядаючы на некаторых галоўных, абмяжоўваюць свае функцыі вузка пастановачнымі задачамі, стварэннем знешняга вобраза спектакля і мала ўнікаюць у змест, у самую сутнасць творчасці акцёра — чым, урэшце, і павінна вызначацца форма спектакля. Магчыма, адбываецца гэта часцей за ўсё ад таго, што рэжысёры мала кампетэнтныя ў пытаннях акцёрскай тэхнікі. Яны не ў поўнай меры валодаюць законамі лагічнай мовы, пабудовы фраз, вымаўленнем... Іх няўвага і непатрабавальнасць да чыста прафесійнага боку акцёрскага выканання прыводзіць да падзення акцёрскай тэхнікі, культуры мовы, пластыкі, руху. Думаю, што прыспеў час рыхтаваць у нашым інстытуце ўмелых і патрабавальных выхавацеляў кадраў.

Не хачу сказаць, што перспектывы рэжысуры ў нашых тэатрах ужо зусім змрочныя. Не! Бывае, нават што пры адпаведных умовах чарговыя рэжысёры ствараюць спектаклі, нічым не горшыя за работы рэжысёраў, якія стаяць на чале таго або іншага калектыву. Так адбылося ў свой час з Валерыем Маслюком у Акадэмічным тэатры імя Я. Коласа («Клеменс»), Аляксандрам Шалыгіным у Акадэмічным тэатры імя Я. Купалы («Тая, якая сама па сабе блукае»), Аляксеем Ляляўскім у Дзяржаўным тэатры лялек БССР («Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты»), Мікалаем Гавядзінавым у Магілёўскім абласным драматычным тэатры («Гандлярка і паэт»).

Аднак станаўленне чарговых рэжысёраў залежыць не столькі ад умоў, у якіх яны аказаліся, колькі ад іх саміх. І гэта не пакідаюць без увагі ў Міністэрстве культуры рэспублікі: В. Маслюку даверана кіраўніцтва Магілёўскім абласным драматычным тэатрам, А. Шалыгіну — Гродзенскім, А. Ляляўскі ўзначаліў Магілёўскі абласны тэатр лялек. Іх першыя работы на новых месцах пацвярджаюць перспектыўнасць такога размеркавання маладых кадраў. Нядаўна галоўным рэжысёрам тэатра драмы і камедыі ў Бабруйску прызначаны М. Кавальчык. У Рускім тэатры БССР яго справы доўгі час складваліся не лепшым чынам (хаця пастаўлены ім спектакль «Амаральная гісторыя», трывіяльны па драматургічнай аснове, закрануў нейкія набалелыя для гледача пытанні і стаў папулярным, а ў пастаноўцы «Апошняга тэрміну» выявілася ўменне М. Кавальчыка працаваць з акцёрамі). І ўсё ж рэжысёру аказаны вялікі давер, дадзена магчымасць максімальна выявіць свае творчыя патэнцыі.

Будзем спадзявацца, што ўсіх гэтых новых тэатральных кіраўнікоў абмінуць памылковыя ўяўленні пра тое, быццам «марка» тэатра цалкам вызначаецца толькі іх творчасцю. А ёсць жа такое меркаванне сярод некаторых галоўных рэжысёраў і праз яго — заганная практыка выпуску спектакляў чарговых рэжысёраў. Мастацкія кіраўнікі тэатраў лічаць сваім правам асабістае энергічнае ўмяшанне ў чужыя спектаклі ў перыяд іх канчатковага завяршэння. «Прычосваюць» іх сваёй вопытнай рукой на праверанны і звыклы, часам адпастайны пастановачны «фасон». Ці можна гаварыць пра тое, што траўмы, якія наносяцца такімі «паслугамі», невылечныя! Наўрад ці можа вырасці ў такіх умовах самабытны, ініцыятыўны чарговы рэжысёр: рэдкія самастойныя пастаноўкі і пастаянная роля падручнага забіваюць яго аўтарытэт у калектыве.

Рэжысёр, які праводзіць сваю творчую маладосць у ценю больш старэйшых, патворчы акрэсленых і яркіх калег, сталее доўга і цяжка. Яму няма ў чым праявіць сябе, а часам яму проста не давяраюць. І становіцца ён рэпецітарам акцёраў, іншы раз нават нядрэнным пастаноўшчыкам, але ўсё ж — ён не гатовы да ролі тэатральнага лідэра, якая павінна быць звышзадачай сучаснага рэжысёра. У такім разе, яму нельга давяраць тэатр. Але ж адкуль браць галоўных рэжысёраў, калі іх — дэфіцыт?.. Замкнёнае кола.

Мне здаецца, выйсце з гэтага адно — як мага раней і больш рашуча прадастаўляць рэжысёру ўсе магчымасці для самастойнай творчасці, смелага эксперыменту, кіраваць ім прадумана, зацікаўлена і рыхтаваць да лёсу не тэатральнага падручнага, а будучага кіраўніка тэатра. Тут важна ўсё: і арганізацыйныя захады, і ўвага тэатральнай крытыкі, і добрая воля тэатраў і, канечне ж, актыўнасць самой рэжысёрскай моладзі.

Я. КЛІМАКОЎ.

МАСТАК І ЖЫЦЦЁ

ЖЫВЫ РУХ ТВОРЧАСЦІ

З ВЫСТАЎКІ ТВОРАЎ Ю. ПУЧЫНСКАГА

Яго школай было Віцебскае мастацкае вучылішча, адкуль выйшлі многія вядомыя сёння беларускія мастакі. Тады, у далёкім трыццаць восьмым, яму было шаснаццаць, сёлета спаўняецца шэсцьдзесят... Паміж першымі вучнёўскімі работамі, суддзямі якіх былі такія мастакі-педагогі, як Валянцін Дзежыц і Леў Лейтман, і работамі, якія прадстаўлены на юбілейнай выстаўцы, што адкрыта ў Саюзе мастакоў БССР, — дзесяцігоддзі школы жыцця. Вялікая Айчынная, па дарогах якой мастак Юзаф Пучынскі прайшоў салдатам. Гады вучобы ў Мінскім мастацкім вучылішчы, у Беларускім тэатральна - мастацкім інстытуце, трыццаць з лішкам гадоў работы ў рэдакцыі часопіса «Работніца і сялянка», мастаком якой ён з'яўляецца па сённяшні дзень, падарожжы па роднай Беларусі, паездкі за мяжу...

Партрэт Я. Купалы.

Як жа адбіўся час у творах Юзафа Пучынскага? З чым ён прыйшоў да свайго шасцідзесяцігоддзя?

— Ён прыйшоў да яго сталым і разам з тым маладым, — сказаў на адкрыцці выстаўкі народны мастак СССР Заір Азгур, — сталым мастаком і маладым душою чалавекам. І галоўная адзнака яго выстаўкі — рух. Жывы рух таленту, рух мастацкай думкі, калі ўвачавідкі бачыш яе паглыбленне, спасіжэнне жыцця і людзей.

У тым, што гэта сапраўды так, пераконваюць многія творы, асабліва апошняга часу, у якіх мастак пераадолеў пэўную скаванасць, ілюстрацыйнасць мінулых гадоў. Пра гэта сведчаць і партрэт Янкі Купалы — добрага, мудрага, прасякнутага шчымлівым, светлым сумам чалавека, сялянскія, простыя рысы якога свецяцца высокай духоўнасцю; і партрэт «Яўрэйскай бабулі», у якім прачытваецца лёс пакалення; і партрэт «Дзяўчынкі з Рудні», вочы якой глядзяць проста ў душу, даверлівыя і цікаўныя...

У экспазіцыі — партрэты Рыгора Барадуліна, Валянціна Лукшы, Артура Вольскага: тры характары трох паэтаў.

Міжволі затрымліваешся каля работы «У калгаснай стайні», адметнай сваёй пластыкай і каларытам. Радуюць многія пейзажы, краявіды Міншчыны, адкуль мастак родам, гарадскія пейзажы, цудоўны «Мірскі замак...».

Яшчэ адна грань таленту мастака паўстае ў зале графічных яго работ. Тут уражваюць партрэты вуглем: іх свабодныя смелыя штрыхі спалучаюцца з тонкім псіхалагізмам, дакладнасцю характарыстык. Такім жа псіхалагізмам вылучаюцца многія ілюстрацыі да твораў беларускіх пісьменнікаў — і класікаў, і сучаснікаў.

Трыццаць пяць гадоў творчай дзейнасці... Шлях ад першага тэматычнага палатна «Партызаны ля параненай Рымы Шаршнёвай», ад «Партызанскай маці», якая натхніла паэта Рыгора Барадуліна на верш з падзагалоўкам «Каля карціны Юзафа Пучынскага»; ад крыху рытарычнага дыпломнага палатна «Янка Купала з народам» да выдатнага партрэта песняра, пра які гаварылася; ад ілюстрацый да «Глыбокай плыні» І. Шамякіна да глыбокага лірызму і разам з тым прафесіяналізму кніжнай графікі апошніх год. Рух. Поступ. Пераадоленне. Адмаўленне ад сябе ўчарашняга, імкненне да новых гарызонтаў. У гэтым імкненні — высокі сэнс мастацтва. «Будь я проклят, если не поймаю эту убегающую даль», — казаў некалі выдатны паэт Міхаіл Святлоў. Юзаф Пучынскі любіць паўтараць гэтыя словы. Таму, што яго мастацкі дар — сапраўдны. А сапраўднасць дару, сапраўднасць таленту павольна, непрыкметна, але ўпарта пашырае яго маштаб. У чым і пераконвае яшчэ раз юбілейная выстаўка Юзафа Пучынскага.

Р. БАКУНОВІЧ.

Прысвечана песнярам

Больш за сто работ у розных жанрах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва падрыхтавалі да выстаўкі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, народныя майстры Гродзеншчыны. Экспазіцыю, якая дэманстравалася ў выставачнай зале абласной арганізацыі Саюза мастакоў, арганізаваў абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культасветработы. Асаблівую ўвагу на выстаўцы прыцягвалі паліхромныя скульптуры «Рэдактар «Нашай нівы» і «Настаўнік з Пінска» С. Быка, у якіх створаны вобразы паэтаў у дарэвалюцыйны перыяд іх творчасці, поўныя непахіснай веры ў свой народ, яго будучыню.

Своеасабліва і вобразна выкананы скульптуры разьбяроў па дрэве М. Скляра «Бандароўна» і У. Рабцова «Гусляр», гіпсавы бюст Якуба Коласа С. Янкоўскага, серыя медалёў А. Бянькоўскага і А. Ліпеня.

Шмат было на выстаўцы жывапісных твораў, сярод якіх можна адзначыць работу Б. Агапава «Памяці беларускіх партызан», «Янка Купала ў Вільні» У. Кіслага, «Свайму народу» і «Купалле» С. Янкоўскага.

Велічны Нёман, непаўторныя вобразы роднага краю — тэма пейзажаў А. Закрэўскага, С. Юпатава, Л. Сеража, П. Талочкі, А. Ліпеня, А. Наважылава, выкананых з лірызмам і цеплынёй.

З графічных твораў на выстаўцы найбольш запамінаюцца замалёўкі помніка беларускага дойлідства У. Павайбы і А. Храмкова, а таксама серыя аркушаў, дзе адлюстраваны сатырычныя персанажы купалаўскіх п'ес «Паўлінка» і «Тутэйшыя» У. Кіслага.

Багата быў прадстаўлены раздзел прыкладнога мастацтва, у якім экспанаваліся вырабы ткацтва, разьбы па дрэве, маркетры, пляцення, саломкі.

Святочным здавалася каляровае вырашэнне посцілак і дываноў, вытканых Т. Місевіч, Н. Шыман, Я. Лукаш, Н. Лісоўскай, М. Кот. Добрае ўражанне робяць творы разьбяроў па дрэве М. Рыжкевіча, К. Місюры, Ф. Цярэшкі, у якіх выкарыстаны багатыя народныя традыцыі.

Выстаўка пазнаёміла гледачоў з сучасным станам народнай творчасці Гродзеншчыны, у ёй прынялі ўдзел шмат маладых майстроў, людзі самых розных прафесій. Лепшыя творы народных майстроў будуць экспанавацца на рэспубліканскай выстаўцы, прысвечанай 60-годдзю ўтварэння СССР.

Я. ШУНЕЙКА.

Фота У. ЛЮЛЕВА.

ГАЛАСЫ СЯБРОЎ

Мая ЛЬВОВІЧ

Таварышам—беларусам

«Бывайце!» — не кажу вам,
не рашаюся.
Звычайнае ёсць слова ў вас:
сябруем.
Я да трывогі вашай
далучаюся,
Я перад вашай гордасцю
схіляюся.
Звычайнае такое слова ёсць.
І шчасце
Звычайнае:
быць вашым другам.

●

Перад смерцю Максім Багдановіч працаваў над вершамі і букварам.

Апошні дагарае час.
А ты шліфуеш верш-алмаз,
Змагаючы імглу.
Апошнім, прадсмяротным днём
Над беларускім букваром
Схіляешся.
Каму?
Сляпы твайго народа твар.
А твой алмаз, а твой буквар —
Адзінаму яму.
Яшчэ ён збавіцца ад бед.
Праляжа твая сцежка-след
У свет яго, у родны свет,
І выйдзе на прастор.
Надзею тояць буквары.
Вер у яго ты.
Ён стварыў
І ён, народ, табе адкрыў
Алмазны россып зор.

Сяргею Мяржынскаму

...Хвароба і смерць змучылі мяне, а не само пачуццё, якое давала толькі шчасце нам абаім.

Леся УКРАІНКА.

Бы шэпча: прыедзь сюды.
Сюды вабіць заўжды
Дарагая надзея.
Я тут шукаю сляды,
Выклікаю з агню, з вады
Вочы твае, Сяргею.
Блізка хадзіў тут недзе.
На памятным Першым з'ездзе *
Быў ты, Сяргею, не госць.
Няма ўжо будынка ў Мінску,
Дзе страшна згасаў Мяржынскі —
Домік Румянцава ёсць.

Горад, дзе разам былі,
Дзе апошнія дні сышлі,
Дзе выпала з другам расстацца,
Дзе сінія вочы цвілі,
Якія ёй шчасце далі,
Якім дала яна шчасце.

У іншых вачах чакаю,
У рысах новых шукаю
Аблічча тваё. Гляджу,
Яно плыве, не знікае.
Беламу, ціхаму краю
І за гэта — дзякуй кажу.

* У Доме Румянцава ў Мінску адбываўся І з'езд РСДРП, сярод арганізатараў якога быў і беларус Сяргей Мяржынскі, блізкі сябра Лесі Украінкі.

За снягамі белымі

Маме, гомельскай камсамолцы 20-х гадоў.

Сакратар-дзяўчына...

Паўло УСЕНКА.

Сакратар-дзяўчына,
Як цябе любілі мы!
Дзесь за далячынямі,
За снягамі белымі,
Дзесьці за гадамі,
Што ляжаць, як горы,
Дзесьці, маладая,
Ты з завода, з горада.

Дзесьці там любімы
Твой станок такарны,
Твая гордасць юная,
Роўны, родны гоман.
Снег мяце. Павезла
Сшыткі для лікбеза
Ў сельскую камуну
З завадскога Гомеля.

Ззяйце сінню, ночы!
Ты дзятву рабочую,
Першых піянераў
Павяла у Чонкі.
А з лясоў — трывога
Б'ецца да парога,
Адчыніла дзверы...
Будзь гатова, чонаўка!

Сакратар-дзяўчына,
Як цябе люблю я!
Дзесь за далячынямі,
Мая песня юная,
Дзесьці за мяцеліцай
За гарамі, гордая...
А з завода, з горада
Ўсё святло праменіцца.

Дваццаць сёмага жніўня

Ведайце: калі мяне не стане —
Я ў сваю дывізію пайшоў.

Аляксей ПЫСІН.

Я не знала. Не магла і знаць я.
Толькі ноччу—тою ноччу—мне
Ноччу ўжо апошняю
у сне
Ты такі прымроіўся, салдаце...
Не адчула ў сне я, што расстанне,
Што асколак сэрца раскалоў.
Ведайце, калі мяне не стане—
Я ў сваю дывізію пайшоў.

Пост не мог пакінуць. І—пакінуў.
У страі застаўся запавет.
Першы на плацдарме ты загінуў.
Смерць адвёў, каб мне ўсміхаўся свет.

Ты ўва мне — не пра былое памяць.
Не ўявіць цябе ніяк былым,
Бо сустрэча ў сне душу мне паліць
Полымем жывым... жывым... жывым.
Ў вочы мне глядзіш, не адыходзіш.
Я ўся тут. Нічога не таю.
Прыйдзе час—ты возьмеш.
Ці ты возьмеш
І мяне
ў дывізію сваю?

Цяпельца — слова беларускае

І не думала, што згадаю,
Так згадаю яго цяпер я,
Што не будзе хапаць з гадамі
Маёй ночы цяпельца.
Ты казаў пра маё багацце —
Мая мова з агнём паяднана.
Што за сіла гарэння пазнана
У іскрыстым, магутным «багатці»? *
Ды нідзе—ў адной толькі мове,
Ды нідзе — ў адным толькі краі,
Ды нідзе—ў адным толькі слове
Для мяне штось гарыць не згарае,
Да мяне знаходзіць дарогу,
Цераз рэкі, даліны, разлогі,
Маёй ночы дае сагрэцца
Цяпельца.

* Багаття (укр.) — касцёр.

Пераклаў з украінскай Юрась СВІРКА.

ПРА ЭРЫДАН, ЧЫСТУЮ ВАДУ І СУХІ КАЛОДЗЕЖ

(Працяг. Пачатак на стар. 4.).

Якая паміж імі сувязь? Самая прамая. Вось што напісана ў дакуменце, які мне далі пачытаць на санстанцыі:

«...Заходняя Дзвіна не можа пакуль што лічыцца стабільна добраўпарадкаванай...

...а) Штогод рэгіструюцца выпадкі брушнога тыфу ніжэй горада Віцебска, звязаныя з інфіцыраваннем рачной вады;

б) У месцах купання вада павінна стабільна мець колітытр не ніжэй I. Такога становішча не назіраецца, што не дае магчымасці ўзаконіць і пачаць будаўніцтва пляжаў».

Каментарыі, як кажуць, лішнія. Трэба толькі дадаць, што ў Дзвіне ўсё роўна купаюцца...

«ЧАМУ Ж ТЫ НЕ ПОЎНАЯ...»

Прырода — гэта кніга, з якой ужо выдралі шмат старонак.
Жарт з часопіса «Родная прырода».

Віцебск — гэта не толькі Дзвіна. Як зразумела з назвы горада, гэта яшчэ і Віцьба.

У Беларускай энцыклапедыі чытаем:

«Віцьба, рака, левы прыток Зах. Дзвіны. Даўж. 33 км. Цячэ ў Віцебскім р-не Віцебская вобл. Вадазбор (244 км²) узгорысты, месцамі раўнінны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,71 м³/сек...»

Падумаеш, знайшлі раку, дзіця пераскочыць, скажа нехта. Але людзі памятаюць і лодачныя станцыі, і пляжы на Віцьбе. Што здарылася, што ж перашкаджае рацэ, як у той жа песні пяецца, «поўнай быць, з беражкамі роўнай плыць»? О, гэта таксама цікавая гісторыя. Пацвярджэнне (хто скажа, якое па ліку) таго, як усё ў прыродзе цесна пераплецена.

...У 1976 годзе забіла трывогу гарадская камунальная служба. У водазаборах «Віцьба» і «Пескавацік» узровень вады ўпаў на цэлыя чатыры метры! Нешта пагражала тым двумстам літрам пітной вады, выдзеленых у карыстанне кожнаму віцябчаніну. Але што?

Прычына была хутка знойдзена. У гэты ж час пачаў працаваць кар'ер «Гралёва» вытворчага аб'яднання «Даламіт» — адзінага ў сваім родзе прадпрыемства рэспублікі. Сельская гаспадарка адчувае вострую патрэбу ў яго прадукцыі — даламітнай муцэ. Здабыча ў кар'еры вядзецца адкрытым спосабам, што не патрабуе дадатковых капіталаўкладанняў на будаўніцтва шахт.

Дык вось, прырода вякамі назапашвала не толькі даламітныя пласты, але і ваду, цэлыя азёры празрыстай блакітна-зеленаватай вады побач з даламітамі. А экскаватары, што ўгрызаліся ў пароду, паступова пачалі рушыць «берагі» тых падземных азёраў. Каб кар'ер не затоплівала, людзі вырашылі апярэдзіць ваду — магутнымі насосамі перапампоўваць яе ў... Дзвіну, якая, дарэчы, знаходзіцца за кіламетр ад месца здабычы. І вось тут людзі зрабілі (і зноў у які раз) памылку. А прырода адразу на яе прарэагавала...

Распрацоўка даламітных пластоў сёння вядзецца з адпампоўкай вады да абсалютнай адзнакі 127 метраў над узроўнем мора. Каб было больш зразумела, гэта на 5-6 метраў ніжэй узроўню Дзвіны. Адпампоўваецца штодня каля чатырохсот тысяч кубаметраў артэзіянскай вады. «Дзякуючы» гэтаму ўтварылася дэпрэсійная варонка з цэнтрам у кар'еры і з радыусам 18-20 кіламетраў. Гэта значыць, што на плошчы звыш тысячы квадратных кіламетраў адбылося рэзкае паніжэнне ўзроўню грунтовых вод. Пра водазаборы я ўжо пісаў. А яшчэ перасыхаюць калодзежы ў вёсках Шабуні, Бабінічы, Бялынавічы, Камунарка, сохне лес, абязводжваюцца палі, грунтовае жыўленне Віцьбы практычна спынілася...

Цяжка сказаць, ці стала больш паўнаводным Балтыйскае мора ад тых чатырохсот тысяч кубоў, якія скідаюць у Дзвіну. Але што гэтай вады стала востра не хапаць цэламу раёну вакол «Гралёва», ясна як дзень. Тут да месца прывесці яшчэ адну лічбу — 150 тысяч кубаметраў. Менавіта столькі пітной вады трэба Віцебску ў суткі. 150 тысяч супраць 400 тысяч. Параўнанне вельмі красамоўнае...

У выніку — «з беражком не роўная» Віцьба. Плюс у наяўнасці парушэнне, прычым грубае, воднага заканадаўства. Згодна з ім, дзе ўзяў ваду, туды і вярні.

На дапамогу прыйшлі вучоныя і інжынеры навукова-даследчага інстытута «Белдзіправодгас». Яны вывучылі праблему і вырашылі, што «для рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў і часткова рашэння праблемы інтэнсіўны кругласутачны водаадліў мэтазгодна ажыццяўляць не ў Заходнюю Дзвіну, а перакідваць у Віцьбу». Так нарадзіўся праект Гралёва-Віцебскай воднай сістэмы. Калі ён будзе ажыццёўлены, лічаць аўтары, адновяцца прыродныя ўмовы, адновіцца Віцьба, больш поўна будуць задавальняцца пітныя і бытавыя патрэбы насельніцтва, будзе магчыма арашэнне сельгасугоддзяў. І гэта не толькі меркаванні. Праект абаснаваны і тэхнічна, і эканамічна.

Вада будзе перакінута ў Віцьбу. На ёй пабудуюць вадасховішча, якое кампенсуе дзеянне дэпрэсіўнай варонкі. Паступова ажывяцца знясіленыя грунтовыя гарызонты, палепшыцца зямля, а па горадзе, як калісьці, пацячэ прыгожая рака, за якую не будзе сорамна.

Карацей, з якога боку ні зірні, толькі карысць ад ажыццяўлення праекта. Кіруючыся гэтым Савет Міністраў рэспублікі ў жніўні 1978 года распарадзіўся пачаць будаўніцтва сістэмы. Сёння, як вядома, на календары 1982, а вада па-ранейшаму скідваецца ў Дзвіну. І толькі ў наступным годзе плануецца нарэшце асвоіць першыя два мільёны рублёў капіталаўкладанняў з дзесяці (столькі каштуе ўвесь аб'ект).

Вось такая гісторыя з Віцьбай — ракой, левым прытокам Дзвіны...

КАЛІ Б Я БЫЎ...

Я родам з Віцебска. І, можа, гэта не модныя ў наш час сантыменты — ганаруся сваім горадам. Горадам з вякоў мінулых, горадам сённяшнім. Ягонай ракой, маёй ракой — таксама.

...На беразе Дзвіны стаяла мая школа. І, памятаю, мы, вучні, першымі ведалі, калі рака хавалася пад лёд, калі пачынаўся крыгаход. Мы першымі лезлі ў халодную яшчэ веснавую ваду, а пасля выпускнога вечара, гэта я таксама памятаю, з салодкім сумам глядзелі, як над Дзвіной уставала сонца. Што і казаць, многае можна ўспомніць і пра школу, і пра рану...

Відаць, для кожнага прыходзіць пара плаціць даніну свайму дзяцінству. Мне, напрыклад, сёння хочацца перапісаць школьныя сачыненні. Не ўсе, праўда, а тыя, што пачыналіся словамі «калі б я быў...». Пра што б я напісаў, вярнуўшыся ў свой пяты, шосты, сёмы... «Б»? Здаецца, пра Дзвіну.

Калі б я быў вучоным, я б прыдумаў самыя дасканалыя ў свеце ачышчальныя сістэмы. Калі б я быў дырэктарам прадпрыемства, я б вырашыў іх пабудаваць. Калі б я быў будаўніком, я б, безумоўна, пабудаваў іх. Калі б я быў...

Я не стаў ні вучоным, ні дырэктарам, ні будаўніком. Я стаў журналістам і маю магчымасць заклікаць усіх, хто можа дапамагчы Дзвіне — дапамагчы ёй.

Хачу, каб рака майго дзяцінства заўжды была чыстая!

Андрэй ГАНЧАРОЎ,
спецкарэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

ТЭАТРАЛЬНЫ МІНСК № 4

Часопіс падсумоўвае творчыя вынікі мінулага сезона і адзначае ў ім, у прыватнасці, спектаклі, пастаўленыя з нагоды 100-гадовага юбілею Я. Купалы і Я. Коласа, выхад на падмосткі п'ес маладых аўтараў А. Дударава і А. Паповай, дэбютантаў А. Асташонка і А. Наважылава, поспех у гледачоў камедыі «Верачка» А. Макаёнка і драмы «Соль» А. Петрашкевіча, паэтычных твораў У. Караткевіча — «Ладдзя роспачы» і «Калыска чатырох чараўніц». Доктар мастацтвазнаўства У. Няфёд, які ўзначальвае секцыю крытыкі БТА, дзеліцца з чытачом роздумам «Аб стане і задачах тэатральнай крытыкі ў Беларусі». Прааналізаваўшы некаторыя прынцыпова важныя выступленні крытыкаў у перыядычным друку, ён звяртае ўвагу і на пралікі асобных рэцэнзентаў, якія часам паблажліва ставяцца да недасканалых пастановак нашай рэжысуры, асабліва з класічнай спадчыны. Плён рэспубліканскага агляду работы тэатраў з творчай моладдзю — змест артыкула В. Ракіцкага «Знаёмцеся: Аляксандр Шароў». Кандыдат мастацтвазнаўства Г. Куляшова разглядае ў артыкуле «Праблемы беларускага оперн ага» сцэнічны лёс твораў нацыянальнай музыкі, опер і балетаў Ю. Семяныкі, Г. Вагнера, Д. Смольскага, С. Картэса, выказвае меркаванні наогул аб сучасных тэндэнцыях развіцця вядучага музычнага тэатра рэспублікі.

Нумар падрабязна паведамляе аб удзеле прадстаўнікоў Беларусі ва Усесаюзным конкурсе чытальнікаў імя У. Яхантава (Ленінград), Усесаюзным фестывалі маладзёжных спектакляў (Тбілісі), III Усесаюзным фестывалі творчай моладзі тэатраў оперы і балета (Мінск). На старонках «Тэатральнага Мінска» № 4 ёсць таксама раздзелы «Кніжная паліца», «Старонкі гісторыі», «Памятныя даты». Нумар багата ілюстраваны.

К. ТАЛОЧКА.

З ДАЛЁКІХ І БЛІЗКІХ ДАРОГ

КУДЫ ІДЗЕ СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА?

Пры ўсёй сваёй канцэптуальнай недасканаласці, гэта не рытарычнае, а надзённае пытанне развіцця чалавецтва. Менавіта яно нябачна прысутнічала ва ўсіх пунктах парадку дня Сусветнай канферэнцыі па палітыцы ў галіне культуры, якая праходзіла сёлета ў сталіцы Мексікі з 26 ліпеня па 6 жніўня.

У апошні раз аналагічная канферэнцыя склікалася ўлетку 1970 года ў Венецыі, але па сваёй прадстаўнічасці і шырыні ахопу праблем Мексіканская канферэнцыя з'яўляецца амаль унікальнай: у ёй удзельнічала 129 дзяржаў, 5 міжнародных арганізацый сістэмы ААН, 16 міжурадавых арганізацый, 60 міжнародных пазаўрадавых арганізацый, 7 фондаў і г. д. Удзельнічала ў рабоце канферэнцыі і дэлегацыя Беларускай ССР на чале з міністрам культуры рэспублікі Ю. М. Міхневічам.

Сацыялістычныя краіны разам з прагрэсіўнымі краінамі так званага «трэцяга свету» рашуча выступалі за стварэнне ў міждзяржаўных адносінах умоў, якія спрыялі б развіццю шырокага культурнага абмену. Пазіцыя Савецкага Саюза карысталася нязменнай падтрымкай большасці ўдзельнікаў канферэнцыі, ідэі, генерыраваныя сацыялістычнай культурай і сацыялістычнай свядомасцю, дамінавалі ў большасці прынятых дакументаў.

Можна было б расказаць пра напружаныя палітычныя дэбаты ў залах Тлацелолка, пра больш чым дзве сотні праектаў рэзалюцый, якія патрабавалі знясільваючых начных пасяджэнняў, пра складанасці жыцця гасціннага, але занадта высакагорнага Мехіка з яго насельніцтвам у 16—18 мільёнаў чалавек і мільёнамі машын, якія крадуць кісларод у людзей. Можна было б хоць турысцкім позіркам дакрануцца да культурных багаццяў, створаных мексіканскім народам на працягу тысячагоддзяў, але я ўпэўнены, што найбольшую цікавасць уяўляюць новыя тэндэнцыі ў разуменні сутнасці і значэння культуры ў развіцці народаў.

Вядома, у цяперашнім свеце няма і быць не можа прынцыповага адзінства ў разуменні сутнасці прызначэння чалавека, няма адзінства і ва ўяўленнях аб асноўных культурна-палітычных праблемах, і ўсё ж галоўныя тэндэнцыі акрэсліваюцца даволі яскрава, і ўсведамленне гэтых тэндэнцый не бескрысна для кожнага, хто так або інакш звязаў свой лёс з літаратурай і мастацтвам.

Перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу крызіснасць, супярэчлівасць стану ўсёй сусветнай культуры, разумеючы пад «культурай» усю сукупнасць духоўных, матэрыяльных і эмацыянальных прыкмет, якія характарызуюць сучаснае грамадства і чалавецтва.

З аднаго боку, марудна, але няўхільна нарастае разуменне таго, што культура ў цяперашняй гістарычнай сітуацыі не можа быць нічым іншым, акрамя як вынікам міжнароднага міру і супрацоўніцтва, вынікам збалансаваных адносін да асяроддзя пражывання самога чалавека, вынікам захавання духоўнай своеасаблівасці асобы.

З другога боку, узмацняецца насільны, імперыялістычны працэс транснацыяналізацыі культуры, масавага разбурэння яе гуманістычных і спецыфічных нацыянальных пачаткаў, працэс адцяснення народаў ад узнаўлення сваёй уласнай культуры. Існуюць небяспечныя ачагі напружанасці і ўзброеных канфліктаў, ігнаруюцца элементарныя нормы міжнароднага права. Гонка ўзбраення перавысіла 500 млрд. долараў штогод і захоўвае тэндэнцыю да нарастання. У той жа час запазычанасць краін, што сталі на шлях развіцця, імперыялістычным крэдыторам перавысіла 500 млрд. долараў і таксама мае тэндэнцыю да росту без сур'ёзных перспектыў на пагашэнне. Колькасць непісьменных, якая складае амаль мільярд чалавек, працягвае расці. Не зніжаецца колькасць людзей, якія галадаюць і недаядаюць,— іх чвэрць насельніцтва ўсёй планеты. Поўнае або няпоўнае беспрацоўе вымотвае многія дзесяткі мільёнаў чалавек, у тым ліку ў краінах, якія сталі на шлях развіцця.

Удзельнікамі Сусветнай канферэнцыі прызнана, што культура стала неад'емным фактарам сапраўднага прагрэсу чалавека і грамадства, што менавіта «праз культуру» чалавек усведамляе сябе як незавершаны прадукт прыроды, крытычна асэнсоўвае свае дасягненні і нястомна шукае новы сэнс існавання. Адзначыўшы, што культура складае неад'емны аспект глабальнай трансфармацыі грамадства, канферэнцыя зазначыла, што роля культуры ў грамадстве вызначаецца ступенню мабілізацыі ёю прадукцыйных сіл краіны. Было падкрэслена, што культура з'яўляецца падмуркам усяго працэсу развіцця, садзейнічае ўмацаванню незалежнасці, суверэнітэту і самабытнасці народаў. У гэтай сувязі магутную падтрымку атрымала канцэпцыя культурнай самабытнасці як бясцэннага багацця, якое пашырае магчымасці для ўсебаковага развіцця чалавека і народа, прымушае іх чэрпаць у сваім мінулым, засвойваць элементы іншых культур і тым самым працягваць працэс самастварэння.

(Заканчэнне на стар. 14—15).

ПЕРАКЛАДЫ

Добры ЖОЦЕЎ

Мацярыкі

Добры Жоцеў (нар. 24.I.1921, сапраўднае прозвішча Добры Аляксандраў Дзімітраў) — паэт, празаік, гумарыст, заслужаны дзеяч культуры НРБ. Ён адзін з тых, хто са зброяй у руках здабываў свабоду для свайго народа. Яшчэ зусім юнаком, у 1942 годзе, Д. Жоцеў быў арыштаваны за актыўную антыфашысцкую дзейнасць і асуджаны на пятнаццаць гадоў турмы. Адседзеўшы два гады, ён уцёк з турмы і стаў партызанам атрада імя Васіла Каларава, які змагаўся з фашыстамі ў югаслаўскім партызанскім злучэнні.

Перажытае ў гады змагання склала змест кнігі Д. Жоцева «Перажытыя апавяданні» («Преживени разкази»), з якою знаёмім сёння нашых чытачоў.

ТАДЫ Я І САМ НЕ ВЕДАЎ, як адбіўся ад сваіх.

Быў загад — каб пазбегнуць сутычкі з вайсковай часцю, якая праследавала нас, мы павінны былі непрыкметна, горнаю ўпадзінаю, перакінуцца па той бок хрыбта. Але ў лагчыне, з якой мы адыходзілі ў яр, стаяў туман. Ён і збіў мяне з тропу. Туман быў такі, што мы адзін аднаго не бачылі. Я ўслухоўваўся ў крокі таварышаў, стараўся не адставаць, але іх крокі чуліся ўсё далей і далей. Насланнё нейкае!

І толькі выбраўшыся з туману, я зразумеў, што адбылося — незаўважна самому сабе я трапіў у яр паралельны таму, якім пайшоў атрад. Нейкіх сотню метраў ён цягнуўся паралельна, а потым павёў мяне амаль у зваротным кірунку.

Я апынуўся на адкрытым месцы, амаль нос у нос з карнікамі. Мяне, вядома, заўважылі. Калі б цяпер я павярнуў назад і кінуўся даганяць таварышаў, я выдаў бы іх, прынамсі, навёў бы на іх след.

Паглядзеў навокал — нада мною ўзвышаецца гара, збоку рэдзенькі букавы гаёк, ніжэй — тры дзесяткі лядашчых хацінак.

Гэтыя невялікія заходнія вёсачкі былі бедныя на хлеб, але багатыя на гасціннасць. Варта толькі паказацца ў такой вёсцы, першы ж сустрэчны, які цябе не знае, не ведае, пачне распытваць — хто ты і што ты і нарэшце завядзе да сябе ў госці. Яму самому есці няма чаго — а цябе знойдзе чым пачаставаць.

Мне нічога не заставалася, як спусціцца ўніз з выглядам, што я тутэйшы і проста вяртаюся з поля. Я пачаў памалу спускацца з гары, крадком азіраючыся на людзей у мундзірах — як яны паводзяць сябе.

Яны былі прыпыніліся раз і другі: вагаліся, мабыць, — варта ці не варта затрымлівацца. Нарэшце, пайшлі сваёй дарогай.

Я супакоіўся — хітрасць удалася. Збег у лагчыну, каб не маячыць у іх на вачах, а сам сабе думаю: «Прайду ўзбоч вёскі, а там павярну, абыду гару і далучуся да атрада. Гэныя, можа, не затрымаюцца тут і ўсё будзе ў парадку! Толькі б нікога не сустрэць — наша славянская гасціннасць на гэты раз можа нарабіць мне клопатаў!» Схаваўшы пад курткай пісталет і гранаты, я набавіў ходу.

Але не паспеў я абмінуць першай крайняй хаты, як з нейкай будыніны, ці не хлява, выйшла жанчына ў простай адзежыне да пятаў, падціснула пад барадой чорную хустку і стала на маёй дарозе. Твар яе засвяціўся ад радасці.

— Дзень добры, сыночку!

— Добры дзень.

Тое, чаго я баяўся, адбылося — адным вітаннем жанчына не задаволілася і працягвала распытваць мяне:

— Як жа цябе зваць, сыночку?

— Момчыл, — сказаў я наўгад.

— Ага, Момчыл, — ажывілася яна яшчэ больш. — І майго ж Момчылкам зваць. Таксама ў войску недзе. Тваіх гадоў, сынку... Божачка, параскідаў ты дзетак па свеце, мацяркі ні чуць вас не могуць, ні бачыць. Пакуль малыя, дык пры нас, а як павырастаеце, забіраюць вас і ніхто нас не пытае. А ты куды ж гэта, хлопча, выправіўся?

Я назваў вёску, якая прыйшла ў галаву. Жанчына здзівілася:

— Вой-вой, гэта ж далёка! А сам жа адкуль будзеш?

Зноў назваў нейкую вёску. Яна пляснула рукамі:

— Вой, дык я ж сама адтуль, род мой там. А сам чый жа будзеш?

Хлусіць далей не выпадала. Я не мог прыдумаць— чый буду і адказаў прыгнечана:

— Не распытвай мяне, цётка, каб ты была здарова! Не магу табе сказаць ні чый я, ні адкуль, ні куды іду...

Жанчына спахапілася:

— Авой, што ж гэта я!.. Даруй, дзетка, мы ж гэтакія — як пачнем пытацца, дык пытаем што трэба і што не трэба!

Я папрасіў яе нікому не гаварыць пра мяне і пайшоў. Яна пастаяла, пастаяла, потым кінулася ўслед і схапіла мяне за руку:

— Хадзі ў хату хоць перакусі.

Я тузануўся, але дзе там! Толькі той, хто не быў у тых мясцінах, не ведае, якая крыўда чалавеку, калі адмаўляюцца ад запрашэння ў яго хату.

Я згадзіўся зайсці толькі на хвіліну, узяць на дарогу хлеба і адразу ж пайсці. Але хто цябе паслухае — у хаце яна, замест таго, каб хуценька даць кавалак хлеба, заслала стол абрусам. Вось яна кроіць хлеб, чорны, як зямля, разломвае ссохлую і пажаўцелую брынзу, нясе нейкія саленні.

І ўсё ў вочы мне заглядвае — вельмі ж я на яе сына падобны — і голас, як у яго, і сабою гожы, як ён, ну, як усё роўна сам ён у водпуск прыехаў.

Я ўспомніў пра вайскоўцаў і нагадаў ёй:

— Нядаўна я тут з салдатамі размінуўся. Можа, і сын твой з імі?

Жанчына спынілася, апусціла рукі на фартух:

— Не, Момчыл мой далёка. У Шумене служыць.

Сказала гэта проста, быццам між салдатамі і партызанамі няма ніякай розніцы. А на вуснах яе

КУДЫ ІДЗЕ СУСВЕТНАЯ КУЛЬТУРА?

(Працяг. Пачатак на стар. 13).

У дыскусіях і прынятых дакументах указвалася, што ўсе культуры складаюць адзінае цэлае ў агульнай спадчыне чалавека, што культурная самабытнасць народаў абнаўляецца і ўзбагачаецца ў выніку кантактаў з традыцыямі і каштоўнасцямі іншых народаў; ні адна культура не можа абстрактна прэтэндаваць на права быць універсальнай, — універсальнасць складваецца з вопыту ўсіх народаў свету.

Канферэнцыя ўрачыста абвясціла, што «Чалавек — пачатак і канчатковая мэта развіцця». У адпаведнасці з гэтым было вылучана патрабаванне аб гуманізацыі працэсу развіцця і вызначана яго мэта: забеспячэнне вартасці кожнага чалавека і яго адказнасці перад грамадствам.

Адказнасць перад грамадствам чалавек сцвярджае не інакш як актыўным удзелам у палітычным, сацыяльным і культурным жыцці. Гэтае палажэнне абгрунтоўвала на канферэнцыі дэлегацыя Беларускай ССР. Дарэчы, яе ўклад у дыскусію знайшоў адлюстраванне ў выніковых дакладах — па пытаннях аб значэнні для агульнасусветнай культуры рухаў за мір супраць ракетна-ядзернай пагрозы і мадэлі будучыні, як стымулятара творчых сіл грамадства.

«Усё больш мужчын і жанчын імкнецца да лепшага міру. Яны шукаюць не толькі задавальнення асноўных патрэб, але і росквіту асобы, дабрабыту і суіснавання з усімі народамі. Іх мэта — не вытворчасць, даходы і спажыванне самі па сабе, а поўнае самавыяўленне, індывідуальнае і калектыўнае, і захаванне прыроды». Гэтыя словы Мексіканскай дэкларацыі фактычна асуджаюць заходні лад жыцця і капіталістычны шлях развіцця з яго марнатраўствам, бюракратыяй і жорсткасцю ў адносінах да асобы. Антыкаланіялісцкія, антыімперыялістычныя настроі, якія пераважалі на канферэнцыі, садзейнічалі прыняццю адпаведных рашэнняў. Было заяўлена, што культура паходзіць ад усяго грамадства і павінна вяртацца да яго: ні стварэнне культуры, ні выкарыстанне яе скарбаў не павінна быць прывілеяй эліты.

Імкнучыся засцерагчы свае дзяржавы і сваіх дзеячаў культуры ад ідэалагічнага дыктату з боку неакаланіялістаў і імперыялістычных мафій, удзельнікі канферэнцыі падкрэслілі, што для развіцця самабытнай культуры неабходна перш за ўсё палітычная дэмакратыя, якая забяспечвала б для насельніцтва сапраўдную роўнасць магчымасцей у матэрыяльнай і духоўнай сферах. Было выказана важнае палажэнне аб тым, што культурная дэмакратыя грунтуецца на максімальна шырокім удзеле чалавека і грамадства ў стварэнні твораў культуры, у працэсе прыняцця рашэнняў, якія датычаць культурнага жыцця, у распаўсюджванні і выкарыстанні культуры.

Кожнае слова гэтага палажэння па сутнасці выпакутавана краінамі, якія сталі на шлях развіцця, у якіх авантурная меншасць часам спрабавала адціснуць або адціскала на задні план нацыянальныя культурныя сілы, заняўшы рашаючыя пазіцыі ў друку, літаратуры, кіно, радыё, тэлебачанні, універсітэцкай адукацыі і г. д. Наколькі вялікі часам уплыў «замежнага элемента» ў культуры краін, што сталі на шлях развіцця, паказвае прыклад Мексікі, дзе з пяці тэлевізійных праграм дзве — чыста амерыканскія, ды і астатнія наўрад ці выказваюць своеасаблівасць нацыянальнага духу працавітага, добразычлівага мексіканскага народа, якому яшчэ трэба сказаць сваё новае вялікае слова ў культурнай гісторыі Заходняга паўшар'я.

У якасці сродку абароны нацыянальных культур неабходна разглядаць і выступленні ў абарону культурнай спадчыны, а таксама на карысць узаемазвязанай палітыкі ў галіне культуры, адукацыі, навукі і тэхнічных сродкаў інфармацыі з мэтай забеспячэння раўнавагі паміж тэхнічным прагрэсам, інтэлектуальным развіццём і маральным удасканаленнем грамадства.

Важнае значэнне атрымліваюць прынцыпы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, абвешчаныя Мексіканскай канферэнцыяй. Было пацверджана, што гэтае супрацоўніцтва павінна базіравацца на павазе культурнай самабытнасці, годнасці і каштоўнасцей кожнай культуры, незалежнасці, нацыянальнага суверэнітэту і неўмяшання; яно павінна ўмацоўваць мір, садзейнічаць ліквідацыі каланіялізму, расізму і ўсіх форм агрэсіі, яно павінна садзейнічаць раззбраенню.

Вельмі вострыя сутыкненні выклікала на канферэнцыі пытанне аб ролі палітыкі ў культурным развіцці. Прыкрываючыся ўяўнай апалітычнасцю сваёй культуры, заходнія краіны спрабавалі скампраметаваць ідэю палітычнага кіраўніцтва развіццём краіны. Гэтага ім зрабіць не ўдалося па той прычыне, што краіны, што сталі на шлях развіцця, не могуць прыняць бескантрольнай сітуацыі, выгаднай неакаланіялісцкім сілам. Да вельмі важнай характарыстыкі канферэнцыі неабходна аднесці таксама меркаванні аб тым, што палітыка ў галіне культуры — справа кожнага чалавека. Гэтую сацыялістычную ідэю адкрыла дзяржавам, якія сталі на шлях развіцця, сумная практыка жорсткай, але малапаспяховай барацьбы за культурнае развіццё народа ва ўмовах засілля згуртаваных каланіялісцкіх і неакаланіялісцкіх элементаў. Была ўсвядомлена сувязь паміж культурай народа і яго свабодай да палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага дзеяння, было ўсвядомлена, што культура народа можа квітнець, сцвярджаючы свой уласны твар, толькі ва ўмовах масавага прытоку працоўных у культуру, што рэзка павышае самасвядомасць нацыі, павышае яе гістарычную актыўнасць, кладзе канец настроям асуджанасці і пасіўнага сузірання, такіх выгадных для каланізатараў і расістаў усіх масцей.

Побач з гэтым важным адкрыццём істотнай сувязі ў культурным развіцці свету стаіць другое, а менавіта: разуменне таго, што нацыянальная гісторыя многіх краін скажона каланізатарамі і расістамі і што народам неабходна нанова напісаць сваю ўласную гісторыю, у якой затоптваліся ў гразь элементы мінулага, якія маюць неацэннае значэнне для сённяшняй і будучай самасвядомасці народаў.

Такім чынам, канферэнцыя праходзіла пад знакам усё больш глыбокага працэсу дэкаланізацыі, і супраціўленне блока заходніх краін дэмакратычным павевам паказала, што наперадзе яшчэ доўгая і цяжкая барацьба за тое, каб вырвацца з ціскоў палітычнага, эканамічнага і так званага культурнага імперыялізму.

Што датычыць пытання раздзялення культурнага асяроддзя на творцаў і спажыўцоў, хацелася б падкрэсліць растучае разуменне тых абставін, што культурнае спажыванне каштоўнасцей таксама мае на ўвазе асобу і волю да самавыяўлення. Плённасць непасрэдных кантактаў паміж стваральнікамі культурных каштоўнасцей і іх спажыўцамі не выклікае ніякага сумнення, паколькі ўсякі стваральнік — перш за ўсё спажывец, які дасягнуў крытычнага пункту ва ўменні спажываць культурныя каштоўнасці, калі стварэнне становіцца найбольш актыўнай формай спажывання.

ўсмешка, добрая і прыгожая. Усмешка гэтая азначала: «Не мірыцеся вы нечага, але дзеці вы і ёсць дзеці, што з вамі зробіш?»

Знадворку пачуўся жаночы голас:

— Рангія, чуеш, дзеўка, ці не Момчыл твой з войска прыйшоў?

Рангія паклала нож, якім кроіла хлеб, насцярожылася. Але нельга было не абазвацца, і яна высунулася ў акно:

— Момчыл, але не мой, Ра́нча. Пляменнік во прыехаў.

— Пляменнік! — узрадавалася тая. — Дай жа мне хоць паглядзець на яго, бо гэткая, дзеўка, маркота на душы па Ніклену!

І Ранча ўвайшла ў хату, абцерла рукі аб падол і пацалавала мяне.

Я даведаўся, што і ў цёткі Ранчы сын у войску. І на Ніклена яе, аказваецца, падобны я, асабліва бровамі — акурат як у яго. Глядзела на мяне цётка Ранча ў замілаванні, глядзела, дый пабегла малака прынесці, свежанькага, яшчэ цёпленькага.

Не паспела яна выскачыць за дзверы, як без папярэджання ўвайшла трэцяя — Каравіля. Аказалася, што я амаль двайнік і яе сына-вайскоўца — Гергінам яго завуць.

Калі цётка Ранча вярнулася з малаком у глінянай місе, цётка Каравіля, каб не адстаць ад яе, пабегла прынесці груш. І прынесла поўны прыпол.

Але мне было не да груш — на хрыбце ўзвышша зноў з'явілася некалькі постацей у мундзірах, напэўна, іх паслалі на ўсялякі выпадак праверыць заўважанага чалавека.

Я ўскочыў на ногі. Жанчыны ўстрывожыліся. Я паказаў ім праз акно на салдат і рушыў да дзвярэй. Трэба было ўцякаць. Але дарогу мне заступіла цётка Рангія:

— Не ідзі, дзіцятка! Яны адразу ж убачаць цябе! Яна мела рацыю, але і ў хаце яны знойдуць мяне.

— Хочаш, каб хату спалілі?

— А можа, яны не прыйдуць сюды?

— Прыйдуць!

Цётка Рангія схапілася за галаву:

— Божачка, калі пойдзеш, яны ж цябе заб'юць!.. Будзь тут, сыночак, калі і прыйдуць, скажам — сын, вайсковец, у водпуск прыехаў!

— Які вайсковец, — я мерыўся выйсці, — вайсковец без мундзіра! Гэта ім адразу кінецца ў вочы.

У размову ўмяшалася цётка Ранча:

— Чаму вы раней не сказалі, я ж і не ведала! Але нічога, я зараз во прынясу чалавека майго адзенне вайсковае. Яго з запасу ўзялі ды во пусцілі дроў на зіму насекчы, дык з раніцы недзе ў лесе.

Група вайскоўцаў спусцілася з гары і адразу накіравалася да Рангіінай хаткі. Я ўжо не ведаў, што рабіць, хацеў нават прасіць жанчын схаваць мяне ў якім-небудзь хляве. Але адразу падумаў, што зверху ім усё відаць — варта паказацца на двары, і я буду заўважаны.

Іншага выйсця не было, акрамя як апрануцца ў прынесеную цёткаю Ранчай вайсковую форму. Дзябёлы, відаць, чалавек быў яе муж — я апрануў усё яго, не скідаючы нічога са свайго адзення.

Жанчыны пачалі завіхацца, як пры сустрэчы вайскоўца на пабыўцы. Цётка Каравіля нават песню завяла:

Старая маці па сыне сумуе,
Старая маці сыночка шкадуе...

Калі вайскоўцы без стуку, на чале з унтэр-афіцэрам увайшлі ў хату, жанчына спявала на ўсю моц. Вачам іх адкрыўся стол з пачастункамі, тры мацяркі і я.

Цётка Рангія паднесла ім пляшачку джыброўкі*.

— Дзень гэткі ў нас харошы сёння, сын мой Момчыл у водпуск прыехаў. Выпіце па чарцы за яго здароўе!

Унтэр-афіцэр няўпэўнена ўзяў пляшку. Цётка Каравіля запрасіла іх сесці, а ў мяне тым часам спыталася, ці не сустракаў я сына яе, Гергіна. Неяк сабраўся я з духам, адказаў больш-менш спакойна.

Начальнік вайскоўцаў пацягнуў з пляшкі і пацікавіўся ў мяне, дзе служу. Я назваў Шумен, паколькі чуў ад цёткі Рангіі, дзе служыць яе сын. Пляшка з джыброўкай пайшла з рук у рукі.

Цётка Ранча не пераставала запрашаць:

— Выпіце, даражэнькія, выпіце!

— Дзякуй, цётка, дзякуй, гарэліца як мае быць!

Але начальнік абарваў іх:

— Ну, хопіцы! Мы на службе, ці ў госці прыйшлі?

Вайскоўцы вярнулі гаспадыні пляшку. Настала нацягнутая цішыня. Унтэр-афіцэр ужо хацеў яшчэ пра нешта спытацца ў мяне, але цётка Каравіля апярэдзіла яго:

— Дык што ж гэта вы, салдацікі, прыйшлі нам радасць сапсаваць? Сядайце ды выпіце, як людзі!

А сама тут жа заспявала:

Ой, загарэлася планіна Яніна,
Ой, згарэлі арляняткі малыя.
Кружыць, кружыць маці-арліца:
«Дзе ж вы, дзетачкі, дзе ж вы мілыя»...

Ад песні мне перахапіла горла. У вачах паўстала і маці-арліца, і гара ў агні, і «арляняткі малыя». На нейкі момант я нават забыўся на сваё рызыкоўнае становішча. Але унтэр, спыніўшы спевы і зірнуўшы спадылба, вярнуў мяне да рэчаіснасці.

— Гэта ты нядаўна спускаўся з гары?

— Я.

— Добра, але ж там дарогі няма!

— Я пайшоў нацянькі, — растлумачыў я і падкінуў яму пытанне для роздуму: — Толькі я не ведаю, каго вы бачылі — мяне ці таго, другога?

— Другога?.. Якога другога?

— Я яго не ведаю...

Начальнік шматзначна зірнуў на сваіх падначаленых. Тыя абыякава паціснулі плячамі.

У гэты час ні з таго ні з сяго ўскочыла з месца цётка Каравіля і, паабяцаўшы пачаставаць гасцей сваёй ракіяй — вельмі моцнай і духмянай, — выбегла за дзверы.

Унтэр насупіў бровы і з важнасцю сказаў:

— Ты даруй, але служба! Каб не выйшла памылкі, пакажы, будзь ласкаў, дакументы!

«Ну, усё», — падумаў я і ўстаў паволі-паволі. Потым нешта мільганула ў мяне ў галаве, і я прамармытаў:

— Пачакай, яны на двары засталіся...

«Пакуль ён будзе чакаць, я ўцяку», — падумаў я. Але унтэр пайшоў услед за мной. Рука мая пацягнулася да пісталета.

У гэты час з голасам, з распушчанымі валасамі, расхрыстаная прыбегла цётка Каравіля:

— Каб вас пярун пабіў, як вы седзіцё тут ды Рангіінага хлопца муштруецё!.. А той, хто вам трэба, коніка майго ўкраў да паехаў!

Вайсковы начальнік вытрашчыўся на яе:

— Хто?.. Якога коніка?

— Майго коніка!.. Вунь там, унізе, на лужку пасвіўся! Я не давала, а ён піхнуў мяне ў грудзі, ускочыў на коніка і паехаў, каб ён не даехаў!

— Зброя была ў яго?

— Была — стрэльба за плячамі і бомбы пры боку. Каб ён не дажыў!.. Ой, людцы родныя, адзін конік быў і таго няма! — Цётка Каравіля галасіла, як па нябожчыку.

— Замоўч! — гаркнуў унтэр. — Паказвай, куды ён паехаў!

Цётка выйшла за парог і некуды паказала. Унтэр падняў сваё войска, і яно кінулася лавіць партызана, які «вышмыгнуў» з іх рук. А мяне акружылі тры мацяркі:

— Уцякай, дзіцятка!

— Бяжы, сынку, пакуль яны чаго не вярнуліся!

— Добра, што я здагадалася, дык уцякай хутчэй!

Цётка Ранча ўздыхнула:

— Ох, дзеткі, сэрца па вас баліць... Няўжо і майго Ніклена начальнікі недзе ганяюць па гарах братоў сваіх лавіць?

— Ганяюць, — адказаў я, скідваючы вайсковую форму.

— І чаго людзі не падзялілі, — азвалася цётка Рангія, — што адзін аднаго пазабіваць гатовы?

Я сумеўся. Надта праведная была мудрасць мацярынскага пачуцця, надта высока паўставала яна ў маіх вачах, каб я мог адказаць на гэта пераканаўча.

Перад тым, як знікнуць у недалёкім яры, я азірнуўся.

Вырысаваныя на фоне неба, у чорных хустках і ў простых сукенках да зямлі, у фартухах, якія варушыў вецер, стаялі поплеч, праводзячы мяне вачамі, тры маці — маці Рангія, маці Ранча і маці Каравіля.

Пераклаў з балгарскай Уладзімір АНІСКОВІЧ.

* Гарэлка з жамерынаў вінаграду або іншай садавіны.

Вельмі актуальна прагучалі на Мексіканскай канферэнцыі галасы ў абарону традыцыйнай архітэктуры, вуснай народнай творчасці, традыцыйных рамёстваў, самабытнай моўнай стыхіі і перабудовы гарадоў з мэтай зрабіць іх набыткам пешаходаў, зварот адчужаных культурных каштоўнасцей з краін, якія не з'яўляюцца краінамі паходжання гэтых каштоўнасцей, абагачэння школьных праграм рознымі аспектамі мастацкага выхавання. Была адзначана ўзрастаючая роля кнігі ў духоўных працэсах грамадства пасля буму кінематаграфіі і тэлебачання ў 50—60-ыя гады. Хацелася б у гэтай сувязі зазначыць, у прыватнасці, вялікае поле дзейнасці для крытыкі і літаратуразнаўства ў сферы выяўлення нацыянальнай і мастацкай самабытнасці літаратурных твораў, а таксама іх агульнакультурнай ролі, зыходзячы з фактычна аналізуемага імі сацыяльна - этнаграфічнага матэрыялу жыцця. Прыкра было б, калі б з арсеналу культурнага набытку выпала частка багаццяў. Павышаючы крытэрыі адбору выдатных твораў, мы не можам без страт для сябе ігнараваць тыя пласты культурнага жыцця, якія не сталі ці не стануць гісторыяй, але якія нясуць на сабе адзнаку гісторыі і захоўваюць пэўны вопыт жыцця. Па крайняй меры, даследаваць іх — наш абавязак. І гэта, відаць, датычыць не толькі літаратуры, але і ўсіх іншых відаў культурнай актыўнасці грамадзян.

У дыскусіі адзначалася, наколькі складана ў цяперашні час зацвердзіцца ў якасці сапраўднага нацыянальнага дзеяча культуры, — з-за адкрытай і скрытай варожасці імперыялістычнай агентуры ўсялякаму незалежнаму самавыяўленню, з-за тэндэнцый перадачы рычагоў культуры ад мас у рукі прадажнай бюракратыі. Адзначалася, што розныя міжнародныя арганізацыі адмаўляюцца ад фінансавання незалежных нацыянальных праектаў і ахвотна фінансуюць толькі тыя, якія азначаюць укараненне ў масавую свядомасць чужых ідэй. Ідэалагічная барацьба ў галіне культуры, якая ўтойвае больш фундаментальныя мэты яе ўдзельнікаў, не спыняецца ні на хвіліну.

Пераважная большасць удзельнікаў канферэнцыі выказала глыбокую трывогу з прычыны сучасных разбуральных тэндэнцый да стандартызацыі і глабальнага распаўсюджвання мадэлей культуры заходніх краін, рашуча асудзіла паўсямесную шкодную інфільтрацыю сродкаў масавай інфармацыі і індустрыі культуры, якія знаходзяцца ў руках транснацыянальных манапалій. Сусветная дэмакратычная грамадскасць, як паказала канферэнцыя, поўнасцю ўсведамляе, якую небяспеку для ўсёй планеты ўяўляе палітыка маніпуліравання масавай свядомасцю людзей і цэлых грамадстваў, якую праводзіць імперыялізм, актыўна адмаўляючы перш за ўсё суверэннае права народаў на незалежнасць і самастойнасць як базу самабытнай культуры.

Алігархічная кучка, якая захапіла рычагі фінансавага, ідэалагічнага і палітычнага ўплыву, планамерна і мэтанакіравана разбурае паўсюль традыцыйныя культурныя каштоўнасці, каб ператварыць чалавека ў безаблічнага спажыўца і тым самым у паслухмянага раба жахлівай сістэмы татальнай эксплуатацыі, пры якой стандарты «масавай культуры», уключаючы секс, алкагалізм, наркаманію і бязмежны эгаізм сацыяльных паводзін, адыгрываюць ролю атруты, якая раз'ядае асобу. На канферэнцыі была выказана заклапочанасць у сувязі з пагрозай, якая ва ўсім свеце навісла над сям'ёй як асноўным інстытутам культурнай і сацыяльнай жыццядзейнасці.

Сучасны свет, дэфармаваны канвульсіямі аджыўшай сістэмы, быў названы бесчалавечным, маючы на ўвазе злавесныя вопыты генетычных маніпуляцый, засілле бяздушнай «масавай культуры», растучае забруджванне асяроддзя, скарачэнне флоры і фауны, вычэрпванне прыродных рэсурсаў. Але асабліва вялікая трывога прагучала ў выступленні дэлегатаў у сувязі з няспыннымі ваеннымі авантурамі імперыялізму. Сусветная культура ні ў якім разе неабыякавая да палітычных падзей, якія ашаламляюць планету. З гэтага боку неабходна разглядаць важны вывад канферэнцыі, што культурнае супрацоўніцтва становіцца ў наш час важным элементам знешняй палітыкі.

Імперыялістычны блок ужо даўно і не без поспеху для сябе выкарыстоўвае каналы культурных зносін у якасці свайго палітычнага тарана. Вядома, і на Мексіканскай канферэнцыі гэты блок спрабаваў прабіць прабоіны ў агульнай пазіцыі, з тым каб выкарыстаць іх як пралазы для сваіх каварных разлікаў. Дэлегацыя ЗША ўнесла два праекты рэзалюцыі, у якіх свабода інфармацыі, бесперашкодны паток ідэй і прыватных абменаў выдаваліся за асноўнае права чалавека і грамадства ў галіне культуры. Абодва праекты рэзалюцыі абуральна супярэчылі сэнсу працякаўшай дыскусіі, у якой у якасці асновы культурных правоў асобы і дзяржавы была вызначана палітычная, эканамічная незалежнасць і культурная самастойнасць, а «культурны імперыялізм» быў прызнаны асабліва небяспечным, «паколькі ён падрывае карані чалавека і народа».

Дэлегацыя БССР разам з дэлегацыямі іншых сацыялістычных і шэрагу дзяржаў, што сталі на шлях развіцця, выкрыла спробу працягнуць рэзалюцыю, якая апраўдвае засілле імперыялістычных манаполій у сферы культуры. Дэлегацыя ЗША была вымушана зняць з абмеркавання адзін праект рэзалюцыі і змірыцца з радыкальнымі папраўкамі, якія былі зроблены па другім праекце.

Сустрэўшы на канферэнцыі актыўнае процідзеянне сваім канцэпцыям, дэлегацыя ЗША спрабавала зламаць аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, выкарыстоўваючы шантаж і пагрозы. Яна заявіла, што «пры такой сітуацыі» ўраду ЗША прыйдзецца перагледзець свае адносіны да ЮНЕСКА. Скарга амерыканскага дэлегата на «дыктатуру большасці» была рашуча абвергнута прадстаўніком Кубы, які зазначыў, што ЗША, вядома, аддаюць перавагу дыктатуры меншасці, але такому становішчу павінен немінуча прыйсці канец.

Уплыў імперыялізму на сусветную культуру яшчэ глыбокі і ўсеабдымны, але гістарычная палітыка насілля і эксплуатацыі ўжо зжыла сябе: растучая самасвядомасць народаў патрабуе пакласці канец усім формам нераўнапраўя і дыктату.

Такім чынам, куды ўсё ж ідзе сусветная культура?

Сінтэзуючы сказанае, можна смела сцвярджаць, што ў сённяшні, вельмі драматычны і поўны небяспекі гістарычны перыяд сусветная культура крок за крокам — і толькі дзякуючы канкрэтным намаганням канкрэтных людзей і іх высакародным ахвярам! — крочыць у напрамку стварэння новага свету, свету без імперыялізму, без эксплуатацыі, без расізму. Вялікія, складаныя перашкоды стаяць на шляху народаў, але іншых сродкаў адстаяць свет няма, акрамя як настойліва дамагацца яго радыкальнага абнаўлення. І гэта — задача не толькі ўрадаў, але кожнага чалавека на ўсім зямным шары. Павышэнне асабістай культурнай актыўнасці кожнага — магутны сродак да ўсеагульнай перабудовы свету.

Сапраўднае багацце чалавека — гэта яго культура, якая сцвярджае раўнапраўе яго народа і разам з тым адкрывае рэальную перспектыву для адзінства і росквіту ўсіх народаў зямлі. Культура — не раскоша, а ўмова асэнсавання існавання, якая ўключае як традыцыю, так і наватарскую працу, як нацыянальнае, так і агульнасусветнае, як незалежнасць і свабоду, так і ўсё большае ўсведамленне згубнасці нацыянальнага фанатызму.

Рашэнні Мексіканскай канферэнцыі звернуты і да нас, дзеячаў савецкай культуры: яшчэ больш умацоўваць ідэалагічную пільнасць, расшыраць інтэрнацыянальную салідарнасць, развіваць культурную ініцыятыву грамадзян, павышаць сацыяльна - культурную ролю мастацтва і літаратуры ў барацьбе за ажыццяўленне высакародных ідэалаў камуністычнай партыі і савецкага народа.

Эдуард СКОБЕЛЕЎ.

МУЗАМ НА ПАЦЕХУ

Леанід БАНДАРОВІЧ

ПРЭСТЫЖ

Аўтарытэт, уплыў, павага — усё гэта ёсць прэстыж.

Кожнаму зразумела, што без аўтарытэту — ніякай павагі, без павагі—ніякага ўплыву і ніякага аўтарытэту. Гэта значыць: без прэстыжу — ніякага прэстыжу. А без ніякага прэстыжу нават на вуліцу не пасунешся.

Вось і імкнёмся да яго, дамагаемся: аклад, дык каб дзесяткі тысяч, калі на італьянскія ліры перавесці; кватэра, дык каб дываны штабелямі, крышталь ажно да падаконніка, у кожным пакоі — па каляровым тэлевізары. Мэбля, люстра і шпалеры — Эрмітаж пазайздросціць.

Прыгожыя кнігі — зразумела... Аўтамабіль, дык — каб чахлы фінскія, магнітафон—японскі, дворнікі — французскія, талоны на бензін—нашы; дача—у два паверхі, чатыры скляпы, сем цяпліц, тры ўраджаі; у хатнім бары—«Марціні», «Напалеон», «Кент». І «Філіп-Морыс» каб ніколі не пераводзіўся; дзеці, дык каб мінімум сталі: сын — кандыдатам, дачка—нявесткай генерала; сваім сябрам каб вас лічылі артысты (не ніжэй заслужаных), вайсковыя (ад маёра і вышэй), спартсмены (жадалася б рэкардсмены), пісьменнікі і вучоныя (лаўрэаты розных прэмій); апрануты, дык каб заўсёды па апошнім слове ад абцаса да капелюша. Каб не казалі пра вас, што птушынага малака не хапае, а гаварылі б, што ў вас гэтага малака... куры не клююць.

Вось тады і аўтарытэт, і павага, і ўплыў. Адным словам — прэстыж!!!

ДЫЯЛОГІ

— Я на вашым бы месцы... — гаворыць падначалены свайму начальніку.

— Во як! Ты ўжо збіраешся на маё месца? — перапыніў яго начальнік.

●

— Як ён апынуўся ў нашым НДІ, ён жа навукай не цікавіцца?

— Іншы можа нашкодзіць, а гэты не перашкодзіць...

●

— У вас гэтулькі недахопаў...

— Але затое якія?! Усе буйныя!..

●

— Навошта вы разбаўляеце піва вадой?

— А чым вы параіце?

Д. НАХАМКЕС.

СЦЭНКІ

У ЦЫРУЛЬНІ

Майстар звяртаецца да кліента:

— Як стрыгчы будзем?

— Добра.

У МАГАЗІНЕ

— Да нас едзе рэвізор.

— На сустрэчу кампенсуем выдаткі за кошт пакупніка.

НА ПУНКЦЕ ПРАКАТУ

— Нам лыжы, — сказаў юнак, ведучы за руку дзяўчыну.

— Выдаю па адной, а то на ўсіх не хопіць.

В. ТАЛКАЧОЎ.

ВЯСЁЛЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ

Аб вырашэнні цякучых пытанняў рабіў справаздачу вілімі па вадзе.

●

Цярпеў несправядлівасць, але цярпліва чакаў свайго зорнавага часу.

●

Іншы сам пасецца ў чужым агародзе, а ў свой пускае Казла адпушчэння для адводу вачэй.

●

Сабраўся з думкамі ў дарогу са спадзяваннем на гаваркіх спадарожнікаў.

М. ХОНІН.

Георгій ЮРЧАНКА

АВЕЧКІ

Не забыць бы дзедавага
Слова залатога:
Не рабі ліхога,
Не кажы пустога.

. . . . . .

Ці так я жыву, ці тое
раблю?

Кастусь ЦВІРКА

Развейваю ў вёсцы я сум
і тугу.
Прыволле. Ёсць хлеб
і да хлеба.
Авечак як след напасу
на лугу,
А болей чаго ж яшчэ трэба?

Авечкі! Спрадвеку турботы
мае,
І клопат, і боль, і надзеі.
(Эх, як вас у горадзе мне
нестае
Найперш у суботы,
ў нядзелі!)

Тут ходзіць у статку
шыкоўны баран,
Гэткі мужык авечы.
Рогі закручаны, ёмісты стан
(З такім не захочаш
сустрэчы!)

У сэрцы звініць маладосці
струна.
Я рад да маленства
прыпасці.
Вось тут я за рогі схаплю
барана
(Цьфу, спрахні,—злаўлю
сваё шчасце!)

Вунь ярачка дзяцельнік
шчыпле усмак
(Прывыкла хадзіць
самапасам).
Я большай не ведаю
радасці, як
З авечкай застацца
сам-насам.

Гляджу на іх быццам
у нейкім паўсне.
Не цягне ні кроплі дахаты.
І так даспадобы (ці верыце?)
мне
Іх дзеткі малыя—ягняты.

Ды часам сябе я на думцы
лаўлю
(Мо гэта найлепшы
пачатак?):
Ці гэтак пішу я? Ці тое
раблю?
Мо лепей разводзіць
пісклятак?..

Іван МЯДЗВЕДЗЕЎ

НІТКА І ІГОЛКА

«Ну што ты сноўдаешся
ўслед?—
Іголка Нітку дапякала.—
Ні адпачыць з табой
як след,
Ні загубіцца дзе папала».
Тут Нітка мовіла: «Заўжды
Дарма, сястрыца, нападаеш.
Ці ж вінавата я, што ты
Сама мне вушка
падстаўляеш?»

У ПРОФІЛЬ І АНФАС

Іван Навуменка.

Іван Чыгрынаў.

Сяброўскія шаржы К. КУКСО.

Барыс РАБЕНЬКІ

ЗАВЯЗАЎ

— Як мы бяздумна ставімся да жыцця! Працуеш, нібы пракляты, начамі не спіш, і ўсё дзеля лішняй капейкі. Прадаеш лепшыя гады! Грошы, грошы, грошы!.. Хопіць! Усіх не заробіш!

Вось, д'ябал, галава аж трашчыць, ціск, відаць, падскочыў. Чаму здзіўляцца! Дзве начы зубы ліў. Не жыццё, а адны каронкі, масткі ды ўстаўныя сківіцы...

Вунь аспірант за сценкай — гол, як сакол, а кожны выхадны рукзак за плечы і на прыроду. Загарэлы, чырванашчокі, вясёлы!.. Малайчына! Так і трэба! І спіць спакойна. Не баіцца. А чаго яму баяцца?

Кніг у мяне тры шафы, а спытайся — хаця б адну прачытаў? Ані! Машына і тая для работы: кліентуру ў вёсках здабываць.

Усё, завязаў! Голы аклад і ніякіх халтур! Кнігі, тэатры, выстаўкі... Да д'ябла зубы!

— Віцечка, ты што там бубніш сабе пад нос? Нездаровы, ці што? Тут кліент прыйшоў, можа, адправіць?

— З глузду з'ехала? Кліч неадкладна! Кліенты на дарозе не валяюцца!

Дзівак-чалавек...

— Гайда далей: тут мы ўжо адпачывалі!

Мал. М. ШЫШЛОВА.

На блакітным экране

27 верасня, 19.25

Э. ХЕЛЬСГЕД. ГРАН-ПА З БАЛЕТА «ФЕСТЫВАЛЬ КВЕТАК У ЧЫНЗАНА».

Харэаграфія А. Бурнанвіля. Выканаўцы народныя артысты рэспублікі Л. Бржазоўская, Ю. Траян і артысткі балета Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР.

28 верасня, 19.25

«ДОМ НА ПЛОШЧЫ СВАБОДЫ».

Першая перадача цыкла, прысвечанага 50-годдзю Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

29 верасня, 20.30

СТУДЫЯ «ЭФІР» ПАКАЗВАЕ «Вяртанне».

Тэленарыс пра народнага артыста БССР кампазітара Ігара Лучанка.

Рэжысёры — Б. Бахціяраў і Ю. Хашчавацкі.

30 верасня, 19.25

«НАШЫ ГОСЦІ».

Канцэрт Дзяржаўнага чукоцка-эскімоскага ансамбля песні і танца «Эргырон».

У праграме — песні і танцы народаў Поўначы.

1 кастрычніка, 19.30

«І СЛЕД ПАКІНУЎ».

Перадача падрыхтавана да 75-годдзя з дня нараджэння паэта С. Дзяргая.

1 кастрычніка. 21.35

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР.

Р. Сурус «Несцерка».

Спектакль Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР паводле п'есы А. Вольскага. Ролі выконваюць: народная артыстка БССР Н. Гайда, заслужаныя артысты рэспублікі В. Фаменка, К. Лосеў, Н. Рэвінская. Рэжысёр-пастаноўшчык Б. Утораў.

2 кастрычніка, 11.45

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КОЛАСА.

А. Звонак. «Навальніца будзе». Спектакль Слонімскага народнага драматычнага тэатра па матывах трылогіі Я. Коласа «На ростанях».

2 кастрычніка, 13.45

АДКРЫЦЦЁ КАНЦЭРТНАГА СЕЗОНА У БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ФІЛАРМОНІІ.

У першым сімфанічным канцэрце будзе выкананы новы твор А. Мдзівані «Святочная паэма», «Здравіца» С. Пракоф'ева, рамантычная сімфонія «Манфрэд» П. Чайкоўскага. У канцэрце прымаюць удзел Рускі акадэмічны дзяржаўны хор СССР і саліст Вялікага тэатра Саюза ССР народны артыст СССР З. Саткілава.

2 кастрычніка, 20.15

«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».

Вы пабываеце на персанальнай выстаўцы заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Л. Шчамялёва ў Маскве ў Цэнтральным Доме мастака. У перадачы прымаюць удзел паэт С. Красікаў, мастацтвазнавец Ю. Асмалоўскі, дырэктар ЦДМ В. Пушкароў, народны мастак РСФСР А. Комаў. Вядучая — мастацтвазнавец Э. Лавейка.

2 кастрычніка, 22.45

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Музычная праграма з удзелам вакальна-інструментальнага ансамбля «Зямляне».

3 кастрычніка, 12.30

«НАША «МАЛАДОСЦЬ».

Аб творчых сувязях з часопісам гавораць Янка Брыль, У. Караткевіч, М. Аўрамчык, мастак В. Маркавец, Э. Малафееў. З планамі «Маладосці» — пазнаёміць галоўны рэдактар часопіса А. Грачанікаў.

3 кастрычніка, 18.00

«КАМЕРТОН».

Першая старонка часопіса пазнаёміць з новай работай Беларускага тэлебачання, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа — экранізацыяй оперы А. Багатырова «У пушчах Палесся». (Паводле аповесці «Дрыгва»).

Аб 50-гадовым шляху Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі расказвае прафесар К. У. Сцепанцэвіч. Затым інфармацыя аб пачатку новага канцэртна-тэатральнага сезона ў Белдзяржфілармоніі і Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі БССР.

Апошняя старонка прысвечана кампазітарам Э. Ханку і А. Мдзівані, якім прысвоена званне заслужаных дзеячаў мастацтваў БССР.

3 кастрычніка, 20.15

«ПА ВАШЫХ ПРОСЬБАХ».

Музычная праграма, прысвечаная Дню настаўніка.

«Літаратура и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 02453

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі—33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва — 33-22-04, аддзела культуры—33-19-65, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі—33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.